Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 СТУДЗЕНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 13 (26126)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

ВАЛОДАЦЬ ПРЫГОЖАЙ СКУРАЙ — ВАЛОДАЦЬ УДАЧАЙ

Хваробы скуры — не толькі непрыемныя і пагаршаюць якасць жыцця. Яны яшчэ зусім не бяскрыўдныя, працягла лечацца і прыносяць сур'ёзныя ўскладненні. Герпес, напрыклад, можа скончыцца лішаём зосцера, мікозы (грыбковыя захворванні скуры) — рожыстым запаленнем, нямала праблем нясуць атапічныя дэрматыты і псарыязы. Таму не варта адразу кідацца лячыць свае балячкі мазямі, якія актыўна рэкламуюцца: трэба абавязкова звярнацца па кансультацыю да дэрматолага. Такога спецыяліста мы запрасілі на «прамую лінію». У ёй возьме ўдзел урач-дэрматавенеролаг загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір Іванавіч Яроміч.

«Прамая лінія» адбудзецца **24 студзеня** ў чацвер **з 15.00 да 16.30** па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АДОБРЫЎ ПЛАНЫ СТАЛІЧНЫХ УЛАДАЎ ПА РАЗВІЦЦІ МІНСКА

Фота БЕЛТА.

Беларусь з'яўляецца вельмі прывабнай краінай для замежных інвестараў, і сёння неабходна максімальна выкарыстаць узрастаючую цікавасць замежных бізнэсменаў да ажыццяўлення праектаў па развіцці Мінска і абласных цэнтраў краіны. Аб гэтым заявіў 22 студзеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання Мінскай гарадской ратушы.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з перспектыўнымі планамі развіцця сталіцы, у прыватнасці з праектам забудовы праспекта Пераможцаў. Ажыццяўленне распрацаванай гарадскімі архітэктарамі маштабнай задумы дасць магчымасць упрыгожыць горад і прыўнесці ў яго аблічча некалькі ўльтрасучасных акцэнтаў.

Як далажыў Прэзідэнту галоўны архітэктар Мінска Віктар Нікіцін, на працягу 5—6 гадоў уздоўж праспекта Пераможцаў з'явяцца два дзесяткі новых аб'ектаў. Плануемы аб'ём інвестыцый — каля $1,5 млрд, з якіх $1 млрд — замежныя капіталаўкладанні.

Унікальнасць гэтай сталічнай магістралі ў тым, што яна непасрэдна звязана з гістарычным цэнтрам горада і яе забудову ў многім вызначае рака Свіслач. Агульная даўжыня праспекта складае 9,5 км. Тут ужо размешчаны цэлы рад важных аб'ектаў: Палац спорту, Футбольны манеж, гасцініца «Вікторыя», тэнісны комплекс, буйныя жылыя раёны, вядзецца будаўніцтва спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна».

У частцы праспекта, якая ўваходзіць у гістарычны цэнтр горада, плануецца рэканструяваць Мінскае замчышча. Асноўная ідэя праекта заключаецца ў размяшчэнні тут нацыянальнага гісторыка-археалагічнага цэнтра на аснове будаўніцтва падземнага музея археалогіі і гісторыі горада, які сумесціць музейныя і культурна-адукацыйныя функцыі. На наземным узроўні будуць створаны прагулачныя тэрасы, якія адначасова з'яўляюцца адкрытымі экспазіцыйнымі пляцоўкамі. Галоўнымі кампазіцыйнымі акцэнтамі комплексу стануць праход да падножжа ўчастка гістарычнага цяпер заключаны ў падземны калектар.

У бліжэйшыя некалькі гадоў на праспекце Пераможцаў плануецца ўзвесці буйныя ўнікальныя аб'екты, якія адпавядаюць узроўню еўрапейскіх сталіц: гасцініцы і дзелавыя комплексы, спартыўныя, культурна-забаўляльныя аб'екты, адміністрацыйныя будынкі. Пры будаўніцтве трэцяга гарадскога кальца на перасячэнні вуліцы Радужнай і праспекта Пераможцаў будзе размешчана шматузроўневая развязка. Прадоўжыцца будаўніцтва жылых дамоў.

На месцы гасцініцы «Беларусь» узвядуць новы гасцінічна-дзелавы цэнтр. На думку спецыялістаў, сёння ўнутраныя памяшканні гасцініцы не адпавядаюць міжнародным патрабаванням, а невялікія гасцінічныя нумары не даюць магчымасці рэканструяваць будынак з мэтай стварэння камфортных умоў для гасцей.

Мінскія гарадабудаўнікі прапанавалі дэманцыраваць існуючую пабудову. На яе месцы з'явіцца сучасны архітэктурны ансамбль у форме трох вежаў. У дзвюх з іх размесціцца пяцізоркавы гасцінічны комплекс вышынёй 40—45 паверхаў, у трэцяй — дзелавы цэнтр класа «А», які адпавядае ўсім сусветным стандартам. Тут таксама будуць забаўляльны цэнтр, басейн, спартыўныя збудаванні, рэстараны і іншыя аб'екты.

«Жадаючыя ўдзельнічаць у гэтым інвестыцыйным праекце ўжо ёсць. Будучы інвестар прафінансуе расходы на дэмантаж старой гасцініцы», — паведаміў Віктар Нікіцін.

Паводле яго слоў, вядомы міжнародны атэль-аператар Hyatt пачаў ужо будаўніцтва пяцізоркавай гасцініцы ў раёне Камсамольскага возера. Атэль, разлічаны на 240 нумароў, плануецца ўзвесці за два гады. Вышыня будынка не будзе перасягаць 7—8 паверхаў, каб не закрываць водную гладзь возера. Аб'ём інвестыцый перасягне $60 млн.

Яшчэ адзін пяцізоркавы атэль з'явіцца паблізу Палаца Рэспублікі. Удзел у яго ўзвядзенні прыме вядомая кампанія «Кемпінскі».

Паводле слоў Віктара Нікіціна, замежныя інвестары праяўляюць цікавасць да будаўніцтва розных аб'ектаў у Мінску. «Усяго ў прапрацоўцы ў нас каля 20 буйных інвестпраектаў», — паведаміў ён.

Істотна зменіцца тэрыторыя каля стэлы «Мінск — горад-герой», якая стала ўжо традыцыйным месцам правядзення буйных святочных мерапрыемстваў рэспубліканскага маштабу. Непадалёку ад яе з'явіцца Нацыянальны форум, які, паводле задумы архітэктараў, стане своеасаблівым гісторыка-патрыятычным цэнтрам, дзе будуць прадстаўлены экспанаты, звязаныя з рознымі этапамі станаўлення маладой беларускай дзяржавы. У іх ліку — першае выданне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

На праспекце таксама будуць узведзены дзіцячая філармонія, святломузычны фантан, унікальны Палац шлюбу на вадзе, лядовы каток, водна-спартыўны комплекс умяшчальнасцю 5 тыс. гледачоў, цэнтр падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы. Уздоўж гэтай гарадской магістралі пройдзе двухпалосная веладарожка даўжынёй 27 км.

У бліжэйшых планах — рэканструкцыя Парку Перамогі іачыстка акваторыі Камсамольскага возера, стварэнне яхт-клуба.

У беларускай сталіцы з'явіцца суперсучасны аквапарк. Ён размесціцца на тэрыторыі, прылеглай да Драздоўскага вадасховішча паблізу скрыжавання праспекта Пераможцаў і Мінскай кальцавой аўтадарогі. Пры ўзвядзенні гэтага ўнікальнага комплексу агульнай плошчай звыш 14,4 тыс. кв.м будуць выкарыстаны практычна ўсе найноўшыя распрацоўкі ў галіне індустрыі адпачынку. Тут размесцяцца хвалевы і гульнявы басейны, гульнявая зона з горкамі і рознымі ўзроўнямі вышынёй да 10 м, вадаспад, водныя атракцыёны, басейн на адкрытым паветры.

Арыенціровачны кошт аб'екта складзе $45 млн. Інвестары гатовы ўжо ў бліжэйшы час пачаць будаўніцтва.

Прэзідэнту было таксама даложана аб інвестыцыйных праектах, якія плануецца ажыццявіць у іншых раёнах беларускай сталіцы. У прыватнасці, недалёка ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з'явіцца шматфункцыянальны гасцінічна-дзелавы комплекс. Цікавасць да ажыццяўлення праекта праявіла іранская фірма «Кейсан». Запланаваны аб'ём інвестыцый — $225 млн. Іранскі бок выказаў гатоўнасць паставіць у Мінск сваю тэхніку і абсталяванне для будаўніцтва гэтага комплексу.

Як чакаецца, аб'ект будзе ўключаць тры асноўныя элементы: адміністрацыйна-дзелавую зону, гандлёвы цэнтр і гасцініцу. Да паслуг наведвальнікаў будуць аўтастаянка, каток, фітнэс-цэнтр, зона забаў для дзяцей.

У размове з прадстаўнікамі сталічнай мэрыі Аляксандр Лукашэнка выказаўся за актыўнае развіццё ў Беларусі гарадоў-спадарожнікаў. На думку кіраўніка дзяржавы, такія населеныя пункты будуць карыстацца вялікім поспехам, у тым ліку ў прадстаўнікоў бізнэсу. Іх неабходна ствараць на напрамках асноўных магістраляў недалёка ад вялікіх гарадоў. Многія замежныя інвестары праяўляюць цікавасць да гэтага, першы праект ужо фактычна пераходзіць у стадыю рэалізацыі.

Акрамя таго, па даручэнню Аляксандра Лукашэнкі на ўездзе ў сталіцу будуць пабудаваны дзве вялікія аўтамабільныя стаянкі, дзе прыязджыя ў Мінск змогуць пакідаць свае аўтамабілі. Гэта дасць магчымасць некалькі разгрузіць транспартны паток у сталіцы.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ў рэспубліцы недастаткова спецыялістаў будаўнічай галіны. Паводле яго слоў, неабходна запрашаць будаўнікоў з краін далёкага замежжа, якія маюць добры вопыт узвядзення буйных аб'ектаў.

Прэзідэнт адобрыў прапанову перагледзець тэхнічныя нарматывы па вышыннасці ўзводзімых у сталіцы будынкаў.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, губернатары і мэры буйных гарадоў павінны больш актыўна выкарыстоўваць вопыт Мінска, у прыватнасці па прыцягненні замежных інвестараў. Паводле яго слоў, сёння замежных бізнэсменаў прыцягвае палітычная і эканамічная стабільнасць у Беларусі. І гэту стабільнасць дзяржава мае намер захаваць, нягледзячы на спробы асобных апазіцыйных дзеячаў дэстабілізаваць сітуацыю пад прыкрыццём лозунгаў аб нейкай абароне правоў бізнэсменаў.

«Грошы, бізнэсмены не любяць хаджэнняў па плошчах, нейкага гвалту, а ім (апазіцыі), відаць, патрэбна дэстабілізацыя. Таму мы не можам дапусціць, каб цікі, спакойны Мінск ператварыўся ў бурлівы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Як толькі на экранах іх паказваюць 1,5 тыс., яны тут жа гаворяць, што іх 20 тыс., заяўляюць, што, маўляў, «бізнэс задушылі». Але аказваецца, што ўчора бізнэсменаў амаль не было. Іх была дзесятая частка, якая сабралася і пайшла, заявіўшы, што іх падстаўляюць», — пракаментаваў Прэзідэнт учарашнія падзеі ў Мінску.

У цэлым кіраўнік дзяржавы даў станоўчую ацэнку планам сталічных уладаў па развіцці горада. У хуткім часе яму будзе даложана аб планах па забудове 13-кіламетровага ўчастка праспекта Дзяржынскага — заходніх варот беларускай сталіцы, а таксама новы генеральны план развіцця Мінска.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Запрашаем на «ТЫДЗЕНЬ МОДЫ НА ЗДАРОЎЕ»

Крочым у «Краіну здароўя»!

Фота БЕЛТА.

Першым значным мерапрыемствам аб'яўленага сёлета Прэзідэнтам Года здароўя стане выстава «Тыдзень моды на здароўе», якая распачне сваю работу 29 студзеня ў выставачным комплексе «БелЭкспа» на праспекце Пераможцаў, 14. Арганізатары форуму — міністэрствы інфармацыі, спорту і турызму, аховы здароўя і адукацыі — ужо ў чацвёрты раз збіраюць пад адным дахам тых, хто займаецца спортам і прапагандуе здаровы лад жыцця, вырабляе спартыўнае абсталяванне, прадастаўляе паслугі па лячэнні і аздараўленні. Сярод экспанентаў выставы — палацы спорту і спартыўна-аздараўленчыя комплексы, фітнэс-цэнтры, басейны, лазні і санаторыі, спартыўныя цэнтры, клубы і школы для дзяцей і дарослых, медыцынскія цэнтры і ўстановы, газеты і часопісы, на старонках якіх знаходзіць адлюстраванне тэматыка здароўя і здаровага ладу жыцця.

Вядома, актыўны ўдзел у выставе возьме «Звязда», тым больш што па выніках мінулага года газета заняла першае месца ў Рэспубліканскім творчым конкурсе на лепшае асвятленне тэматыкі здароўя і здаровага ладу жыцця. Больш падрабязна пра план работы нашага стэнда мы напішам у наступных нумарах газеты. Загадзя адзначым толькі, што нашымі гасцямі на працягу работы выставы стануць высокакваліфікаваныя спецыялісты медыцынскага цэнтра МТЗ, якія дадуць кансультацыі і парады ўсім наведвальнікам стэнда «Звязды». Так што збірайцеся і прыходзьце! Да сустрэчы на выставе!

Каб быць здаровым, найперш патрэбна матывацыя. Ну, і належны даход не перашкодзіць

Шчасце, як вядома, не ў грошах. Ды і здароўе за іх, як сцвярджае вядомая прымаўка, таксама не купіш. Загартоўвацца можна і цалкам бясплатна: прагулкі на свежым паветры нічога не каштуюць, можа дапамагчы і выцягнуты з антрэсоляў раней набыты спартыўны інвентар і г.д. Але ў цяперашнім нашым жыцці кожнаму з нас даецца куды больш магчымасцяў весці здаровы лад жыцця: ад правільнага харчавання і набыцця вітамінаў, напрыклад, да наведвання басейнаў, трэнажорнай залы, катка і інш. Усё гэта, зразумела, каштуе пэўных сродкаў.

А колькі асабіста вы штомесяц, напрыклад, выдаткоўваеце грошай (маглі б ці хацелі б выдаткоўваць) для ўмацавання ўласнага здароўя і здароўя сваіх блізкіх? На што канкрэтна яны ідуць?

Мікалай КАСЦЮКЕВІЧ, намеснік начальніка аддзела рэгістрацыі і кадастра РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры»:

— Адказваючы на вашы пытанні, думаю, трэба абавязкова ўлічваць тры фактары: па-першае, уласна ўзровень цэнаў на такія «аздараўленчыя працэдуры», па-другое, даходы канкрэтнага чалавека ці сям'і, патрэцяе, наяўнасць і колькасць вольнага часу. Скажам, асабіста я ўвесь час заняты працай, калі выпадаюць выхадныя, сілы хапае толькі на сям'ю ды канапу *(смяецца)*. А ўвогуле на ўмацаванне здароўя хацелася б выдаткоўваць, дайце крыху падумаю... Мінімум 16 гадзін у месяц. Гэта я тэарэтычна, бо, як сказаў, у большасці, напэўна, працуючых людзей вольнага часу не хапае. Колькі грошай не шкада? Каб усё было бясплатна *(смяецца)*. Калі ж сур'ёзна, думаю, максімум 100 тысяч рублёў у месяц, з улікам узроўню цэнаў і даходаў.

Іна СЯМЁНАВА, намеснік начальніка аддзела інфармацыйных тэхналогій Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама:

— Часам наведваю саўну, па рэкамендацыі ўрача п'ю вітаміны. Можна і трэба было б больш надаваць увагі ўласнаму здароўю, але не хапае часу. Наконт канкрэтнай сумы не скажу... Марыць можна пра многае, напрыклад, я як жанчына хацела б часцей рабіць масаж, выкарыстоўваць абгортвані, але як пачытаеш расцэнкі на ўвесь курс — дарагавата атрымлiваецца. Колькі, вы кажаце, вашы папярэднія рэспандэнты называлі грошай — 100 тысяч у месяц? Ну, на басейн, саўну, думаю, гэтага б хапіла. Хаця весці здаровы лад жыцця можна і без грошай. Я часам займаюся хуткай хадою. Пройдзеш на свежым паветры тры прыпынкі і адчуваеш, як павышаецца тонус, з'яўляецца бадзёрасць, настрой *(смяецца)*. Галоўнае — каб была матывацыя: быць здаровым. На Захадзе гэта даўно ўжо стала модным, таму вельмі добра, што і ў нас 2008 год аб'яўлены Годам здароўя.

Інеса КІПЕЦЬ, галоўны спецыяліст аддзела занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Нясвіжскага райвыканкама:

— Ну, басейна, напрыклад, у нас няма... Умацоўваю здароўе бясплатна — гуляю ў парку *(смяецца)*. А ўвогуле, думаю, тысяч 100 у месяц можна было б аховаць на заняткі спортам, умацаванне здароўя. Урон для сямейнага бюджэту, вядома ж, быў бы, асабліва калі ўлічыць узровень цэнаў на здаровыя прадукты харчавання, тыя ж вітаміны, але нас выратоўвае тое, што амаль усяны дом, агарод, адпаведна вітаміны спажываем уласныя. Напрыклад, свае памідоры ядзім дагэтуль.

Андрэй БЯЛІЛАВЕЦ, настаўнік фізкультуры сярэдняй школы № 118 г. Мінска:

— Грошай трэба шмат. Майму сыну — 17 гадоў, ён кандыдат у майстры спорту па плаванні. Дык на харчаванне, плаўкі і іншыя дробязі штомесяц ідзе 100—200 тысяч рублёў, дакладна я не падлічваў. А калі займацца спортам прафесійна, і 300—400—500 долараў у месяц не хопіць. Веласіпед сярэдняга класа каштуе 200—300 долараў, 300—400 долараў — лыжы. Адно наведванне атлетычнай залы ў фізкультурна-аздараўленчым комплексе каштуе 5 тысяч, басейна — 6 тысяч рублёў. За месяц можа набегчы 20 заняткаў, вось і лічыце. Таму, думаю, на сям'ю з трох-чатырох чалавек на падтрымманне здароўя, заняткі спортам, фізкультурай можа ісці да паловы сямейнага бюджэту. Можна, безумоўна, у старых красоўках на парку бегаць, але сучасны свет дае нашмат больш магчымасцяў. Таму дзяржаве трэба больш выдзяляць сродкаў для прапаганды і развіцця здаровага ладу жыцця сярод насельніцтва, вядома ж, павялічваць даходы грамадзян.

Алена КАВАЛЁВА, прэс-сакратар Міністэрства гандлю:

— Долараў 100, не менш, прычым толькі на ўласныя патрэбы, на сям'ю выдаткі будуць значна большымі. На што канкрэтна ідуць грошы? На вітаміны, добрае харчаванне, для жанчыны вельмі важна, каб была добрая касметыка, добрае адзенне, у тым ліку і спартыўнае, на гідрамасаж, загартоўваючыя душы. Лічу, што такім чынам уласны стан здароўя я падтрымліваю на належным узроўні працэнтаў на 70—80, астатнія 20—30 працэнтаў — гэта ўздзеянне знешніх фактараў.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

(Працяг тэмы на 6-й стар.)

У СЕРБІЮ ЕДЗЕ «НАРОДНЫ»

Прафесійнае журы назвала пераможцам нацыянальнага адбору «Еўрабачанне-2008» Руслана Аляхно

21 студзеня ў сталічным Палацы спорту адбыўся фінал Нацыянальнага музычнага праекта «ЕўраФэст». Пуцёўку ў Бялград, на міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2008», разыгрывалі паміж сабой чатыры выканаўцы — гурт «По Глазам», Gunesh, гурт «Litesound» і Руслан Аляхно (менавіта ў такім парадку, паводле жараб'ёўкі, фіналісты выходзілі на сцэну).

Дзве гадзіны чакання — і... навіной рашэнне журы не стала: запаветны пропуск на еўрапейскую сцэну атрымаў Руслан Аляхно, у скарбонцы якога — тытул пераможцы конкурсу «Народны артыст-2». На сцэне падчас абвяшчэння вынікаў астатнія фіналісты трымаліся прыязна-роўна і выканалі новынароджаны беларуска-англійскі гімн «ЕўраФэсту» «We Rock» з выглядам «няхай пераможа сяброўства», але закулісныя крыўды гэтаксама нечаканасцю для артыстычнай і журналісцкай тусоўкі не з'явіліся. Зрэшты, што ўжо тут спрачацца, калі старшыня прафесійнага журы (яно складаецца з 9 чалавек) Міхаіл Фінберг адназначна абвясціў, «каго паслаць на «Еўрабачанне». Вердыкт журы — а меркаванні гледачоў на фінале ў разлік не браліся — не абмяркоўваецца. Але, магчыма, каб зняць напружанасць сітуацыі, наступны адбор варта праводзіць або цалкам закрытым, або, наадварот, забяспечыць падрабязнымі тэлетрансляцыямі на ўсіх этапах?

«Мы ўсе разумеем, што сёлета нашу краіну зможа прадставіць толькі Руслан Аляхно», — прадэманстравалі канкурсанты на прэс-канферэнцыі пасля канцэрта рэдкае аднадушша, няхай сабе і з іранічным падтэкстам. Гюнеш нават, не вытрымаўшы, «ушчыкнула» пераможцу: «Руслан, я цябе вельмі люблю, але чаму ты ўвесь час спяваеш «міма касы»?» — «Час яшчэ ёсць, і над песняй, і над пастаноўкай, і над англійскім вымаўленнем я буду працаваць», — нейтральна адказаў Руслан. Яго прадзюсар Кім Брэйтбург, які прыехаў падтрымаць выканаўцу на канцэрце, падкрэсліў, што «экспартны» канчатковы варыянт выступлення з песняй «Hasta la vista», хутчэй за ўсё, будзе вельмі адрознівацца ад таго, што мы бачылі зараз, памяняецца сцэнаграфія, вобраз артыста і г.д.: «Усё ж на конкурсе перамагаюць яркія, добра пастаўленыя нумары». На правакацыйныя заўвагі журналістаў, маўляў, зноў баль будзе правіць расійскі капітал, кіраўнік тэлепраекта «ЕўраФэст» Аляксандр Ціхановіч тут жа адзначыў, што ўсё фінансавае забеспячэнне падрыхтоўкі артыста да конкурсу бярэ на сябе Белтэлерадыёкампанія — дарэчы, сёлета бюджэт, выдаткаваны пад «Еўрабачанне», істотна павялічыўся, хоць канкрэтную суму, зразумела, ніхто не называе.

Зрэшты, гэта яшчэ справа будучая, а пакуль падсумуем тое, што ўжо маем.

Падчас падрыхтоўкі і правядзення фінальнага канцэрта сталі відавочнымі некалькі тэндэнцый. Па-першае, год ад году нацыянальны адбор робіцца ўсё больш маштабным і прадстаўнічым. Сёлета, напрыклад, у якасці гасцей арганізатары «выпісалі» адразу трох ранейшых пераможцаў «Еўрабачання»: турчанку Сертаб (2003), украінку Руслану (2004) і фінаў «Lordi» (2006). Па-другое, нягледзячы на рэпутацыю «шоў для хатніх гаспадынь», стаўленне да конкурсу цяпер сур'ёзнае, як да ўзорных вайсковых вучэнняў ці па меншай меры кваліфікацыі на Алімпійскія гульні: хто бачыў перад канцэртам тэлевізійнае ток-шоў «Ход у адказ», зразумее, аб чым гэта я. Дый ператварэнне леташняй «Work your magic» у парадную кампазіцыю роты ганаровай варты таксама, ведаеце, дарагога каштуе. Па-трэцяе — як ні сумна, конкурс робіцца прадказальным. «Павішаваць Руслана Аляхно з перамогай можна было з моманту падачы заяўкі», — махнуў рукой прадзюсар Максім Алейнікаў, які блукаў па танцпляцоўцы з плакатам у падтрымку Гюнеш. Так, дарэчы, яшчэ адна непрыемная тэндэнцыя — рэзкі падзел сімпатый «груп падтрымкі»: такое адчуванне, што спаборнічаюць не выканаўцы, а пэўныя прадзюсарскія каманды, якія перацягваюць коўдру на свой бок... Напрыклад, на карысць той жа Гюнеш за кулісамі выказаліся турчанка Сертаб Эрэнер, якая знайшла момант, каб асабіста сказаць каляжанцы некалькі цёплых слоў, прадзюсар Уладзімір Кубышкін, гурт «Харлі» і запрошаны гурт «Lordi». Руслану Аляхно аддалі перавагу спецыяльныя госці канцэрта — удзельніца «Еўрабачання-2005» Наталля Падольская і адзін з найбольш верагодных прадстаўнікоў Расіі сёлета, фіналіст праекта «Народны артыст» Аляксандр Панаётаў — «з мужчынскай салідарнасці». Праўда, што станецца з гэтай салідарнасцю, калі ім давядзецца выступаць на адной сцэне ўжо ў якасці канкурэнтаў, расійскі выканаўца не ўдакладніў. Руслана захавала нейтралітэт, не каментуючы нават выбар роднай Украіны — яе на конкурсе сёлета прадставіць Ані Лорак, — але падзякаваўшы за прыём беларускай публіцы.

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА.

Зрэшты, ёсць і станоўчыя моманты. Напрыклад, усе ўдзельнікі адзначылі высокі ўзровень канцэрта (падобна на тое, што не вельмі задаволеныя ім былі толькі тэлевізійнікі). Канкурсанты засталіся задаволеныя сваімі выступленнямі, тым больш, што некаторыя ледзьве не ў апошні момант такі прыдумалі яскравыя «фішкі» для нумара — скажам, салістка «По Глазам» Стася задзейнічала ў пастаноўцы... Ксюшу Сітнік з гітарай, а Гюнеш пафарбавалася ў светлы колер і стала не падобная сама на сябе, чым уводзіла ў недаўменне ахоўнікаў.

Вельмі актыўна праяўлялі эмоцыі гледачы, якія зноў жа ўпершыню забяспечылі настолькі вялікую масавую яўку. Няхай сабе і прышлі яны паглядзець у асноўным на гасцей, шэптам перапытваючы: «А праўда, што «Lordi» аблізку страшныя?» Засведчым: праўда. Дарэчы, напярэдадні канцэрта фатографаў строга папярэдзілі: калі ўдасца заспець фінскі гурт без масак і грыму — ніякіх фатаздымкаў, інакш фіны адразу разварочваюцца і адмяняюць канцэрт. Прэцэдэнты былі. Але не ў гэты раз: фіны, якія прыехалі за гадзіну да свайго выхаду на сцэну, маршавым крокам пратупалі ўжо ў касцюмах і масках, падобныя на герояў страшнай казкі, так што «тэхнікі бяспекі» нікто не парушыў. Хіба што ад нечаканасці ўсе павярнуліся спінамі да экрана, на якім якраз дапявалі чарговыя беларускія фіналісты. Задаволеныя эфектам, фіны — удзельнікі гурта насамрэч невысокія, калі не лічыць «катурнаў» у добрых 20 сантыметраў — міла фатаграфаваліся з дзецьмі, паказваючы «казу» асабліва нахабным.

(Заканчэнне ў 8-й стар.)

Кацярына КАРСТЭН:

«УДЗЕЛУ Ў СВАЁЙ ШОСТАЙ АЛІМПІЯДЗЕ Ў ЛОНДАНЕ Я НЕ ВЫКЛЮЧАЮ»

Фота Вольі ЛАСКІ.

Ужо шосты раз Кацярына Карстэн становіцца лепшай спартсменкай года. І прыемна не столькі гэта, колькі тое, што на ўшанаванні з гэтай традыцыйнай ужо нагоды яны з мужам Вільфрыдам спецыяльна прыехалі з Германіі. Прычым так спяшаліся, што згубілі візу, і ледзь не спазніліся з-за праблем на мяжы. А маглі б, спаслаўшыся на занятасць і трэніроўкі, і не прыязджаць, а падарункі забраць пасля, пры зручным выпадку, і ўсе б зразумелі тытулаваную спартсменку. Не прыехаў, значыць, Кацярыне нават такія, мясцовага маштабу, перамогі. Хоць думкамі двухразовая алімпійская чэмпіёнка, зразумела, у Пекіне, на самых галоўных сваіх спаборніцтвах.

— Каця, якія праблемы ўзніклі на мяжы?

— Муж дзесьці падзяваў сваю візу — яна ў яго не ў пашпарце ўклееная, гэта — укладыш. Яму і пашпарт трэба мяняць, і пасведчанне на права жыхарства. Мы ўжо тэлефанавалі ў Крупкі, нам сказалі: прыязджайце, калі будзе нямецкі пашпарт, усё зробім без праблем.

— Вы прыехалі ў Беларусь усёй сям'ёй?

— Не, мы з Вільфрыдам прыехалі, а дачка Аляксандра павінна наведваць школу, яна засталася ў Германіі.

(Заканчэнне ў 8-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08013

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 107,29
1 латвійскі лат	4 449,96
1 літоўскі літ	899,94
1 чэшская крона	118,25
1 польскі злоты	849,57
1 расійскі рубель	86,37
1 украінская грыўня	424,90

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	24,8917
10 UAH	48,8484
1000 BYR	11,5446
EUR	35,8490

Курс у гандлёвых кампаніях (на 22.01.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Па чутках і аўтарытэтна

Фінансісты загаварылі аб набліжэнні фінансавага крызісу...

Учора другі дзень запар ліхаманілі сусветныя біржы, дзе назіраўся абвал на фондавых рынках. Не абмінула гэтая «чаша» і суседнюю Расію: тут таксама цана большасці ліквідных акцый танула на вачах, што выклікала сапраўдную паніку на расійскім рынку. Некаторыя расійскія аналітыкі нават выказвалі апасенні наконт таго, што «дна, да якога ўпадзе расійскі рынак, і не бачна».

Два дні — час, якога хапіла экспертам на аналіз сітуацыі, што склалася. Пераважная большасць з іх «ківае» ў гэтай сувязі на ЗША: абвал на фондавых рынках свету, паводле іх меркавання, выкліканы страхам перад замаруджваннем росту ў Злучаных Штатах. Шок, які назіраўся ў панядзелак, калі акцыі абваліліся на 5—6 працэнтаў за адну тарговую сесію, прывёў літаральна да панікі: інвестары безразважна пачалі прадаваць свае акцыі. Чаго чакаць далей? — Гэтае пытанне, бадай, цяпер адно з найбольш актуальных паўсюдна, і прагнозаў на гэты конт шмат. Адзін з іх — меркаванне вядомага фінансіста Джорджа Сораса, які ўпэўнены, што набліжаецца найцяжэйшы фінансавы крызіс. Мы ж, у сваю чаргу, звярнуліся па каментарый да **эксперта нашай газеты — дэкана эканамічнага факультэта БДУ, прафесара Міхаіла КАВАЛЁВА**, які выказаў свой пункт погляду на згаданыя падзеі.

— Падзенне, хоць не столькі значнае, будзе працягвацца і далей, — лічыць эксперт. — Аднак могуць адбывацца і часовыя невялікія пад'ёмы. Амерыканскі рынак рэагуе на праблемы з вялікімі банкамі — праблемы з прыбыткам, выкліканыя, у першую чаргу, крызісам па іпатэцы. Да гэтага яшчэ дадаюцца чыста псіхалагічныя прычыны, калі першымі па велічыні банкамі свету становяцца не амерыканскія, а кітайскія банкі. Глабальная ж прычына — ЗША на 1 трыльён доларaў купляюць тавараў за мяжой больш, чым прадаюць. І ад гэтага нікуды не дзенешся. Гэта праблема адбываецца на ўсім. Калі сціскаецца амерыканскі рынак, падаюць тэмпы росту амерыканскай эканомікі, значыць, ЗША будзе менш купляць тавараў за мяжой, менш купляць у тых жа кітайцаў, у іншых краін, а таму пачынаецца ланцуговая рэакцыя. Што ж датычыцца падзення акцый у Расіі — гэта чыста псіхалагічны момант, ніякіх прычын для падзення фондавага рынку ў гэтай краіне няма: па-першае, там не вельмі вялікая наменклатура фондавага рынку, а акцыі асноўных ігракоў да таго ж, на мой погляд, яшчэ істотна недаацэненыя. Таму гэта часовая з'ява. Ды і рэцэсія ў ЗША на Расіі істотна не адаб'ецца: тое, што РФ прадасць — купляць будуць. Нават пры падзенні тэмпаў росту ў тых жа ЗША на 2 працэнты, дапусцім, у тым жа Кітаі, усё роўна і Злучаным Штатам, і КНР неабходна вельмі шмат нафты, а іншым краінам — газу. На расійскія нафту і газ попыт падаць не будзе, таму ніякіх падстаў для істотнага падзення расійскага фондавага рынку няма, і, на мой погляд, ужо ў аўторак да вечара ён пачаў адумвацца.

— А Беларусь, на ваш погляд, нейкім чынам зачэпяць гэтыя падзеі?

— Беларусь чапляе толькі адно, — калі ў Расіі будзе падаць пакупніцкі попыт. Але для гэтага ў РФ патрэбны вельмі сур'ёзны крызіс. Пакуль жа ніякіх значных падстаў для яго няма. А на фондавым рынку ў нас проста падаць няма чаму — апошняга няма. Паўтаруся, для Беларусі заўсёды пагроза — падзенне попыту на айчынныя тавары з-за некаторых прычын — альбо памяншаюцца даходы расіян, альбо нас выцясняюць расійскія ж канкурэнты. Між іншым, другая прычына для нас больш важная, чым падзенне сусветных індэксаў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Газета «Звязда» — за плённае супрацоўніцтва з «Белпоштай»

Паважаныя супрацоўнікі паштовай сувязі! Як мы і абяцалі ў перыяд падпіснай кампаніі на 1-ы квартал і першае паўгоддзе 2008 года — у рамках сумеснага конкурсу «Белпошты» і газеты «Звязда» прэміяваць лепшыя вузлы паштовай сувязі, аддзяленні паштовай сувязі і паштальёнаў, якія дасягнулі лепшых вынікаў ў падпісцы на старэйшае беларускамоўнае выданне — цяпер падводзім рысу пад атрыманымі афіцыйнымі вынікамі з упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта». Вось як выглядаюць тройкі пераможцаў.

СЯРОД РАЁННЫХ ВУЗЛОЎ ПАШТОВАЙ СУВЯЗІ (РВПС)

1-е месца* — *Маларыцкі РВПС, начальнік Алесюк Генадзь Варфаламеевіч (рост падпіскі на 01.01.2008 у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года склаў 191,8 працэнта) — прэмія 9 базавых велічынь; ***2-е месца* — *Шклоўскі РВПС, начальнік Мельнікаў Вячаслаў Міхайлавіч*** (122,5 працэнта) — 8 базавых велічынь; ***3-е месца* — *аб'яднаны цэх паштовай сувязі г. Гродна, начальнік Пілец Ганна Сяргееўна*** (122,3 працэнта) — 8 базавых велічынь.

СЯРОД АДДЗЯЛЕННЯЎ ПАШТОВАЙ СУВЯЗІ

1-е месца* — *АПС № 74 г. Мінска, начальнік Сухадольская Таццяна Віктараўна (480 працэнтаў) — 7 базавых велічынь; ***2-е месца* — *АПС № 73 г. Мінска, начальнік Талпека Аксана Васільеўна*** (229 працэнтаў) — 6 базавых велічынь; ***3-е месца* — *АПС № 12 г. Мінска, начальнік Глазкова Ірына Леанідаўна*** (122 працэнты) — 4 базавыя велічыні.

СЯРОД ПАШТАЛЬЁНАЎ

1-е месца* — *Асачова Святлана Георгіеўна, аператар АПС № 5 Івацэвіцкага РВПС (900 працэнтаў) — 5 базавых велічынь; ***2-е месца* — *Анікша Ніна Яўгенаўна, паштальён АПС Залессе Чачэрскага РВПС*** (230 працэнтаў) — 4 базавыя велічыні; ***3-е месца* — *Скараходава Надзея Мікалаеўна, паштальён АПС Паплавы Бярэзінскага РВПС*** (170,6 працэнта) — 3 базавыя велічыні.

Спадзяёмся, што работнікі паштовай сувязі краіны і ў далейшым будуць саюзнікамі газеты «Звязда», тыраж якой цяпер крышку падрос.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СЛЕДАМ ЗА РАСІЯЙ ПРА ГАТОЎНАСЦЬ ПЕРШЫМІ ВЫКАРЫСТАЦЬ ЯДЗЕРНУЮ ЗБРОЮ ЗАГАВАРЫЛІ Ў НАТА

Практычна адначасова з ваенным кіраўніцтвам Расіі пра неабходнасць быць гатовымі першымі выкарыстаць ядзерную зброю загаварылі эксперты НАТА.

Адпаведная справаздача аб рэформе Паўночна-атлантычнага альянсу была прадстаўлена яго кіраўніцтву групай былых высокапастаўленых ваенных чыноўнікаў. І калі Масква ўключае ў сваю ваенную дактрыну прэвентыўны ядзерны ўдар «для абароны суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці РФ і яе саюзнікаў», то эксперты НАТА настойваюць на гэтым ужо дзеля «папярэджання выкарыстання зброі масавага знішчэння» з боку ворагаў альянсу, піша The Daily Telegraph.

АМЕРЫКАНЦЫ ХОЧУЦЬ ЖАНЧЫНУ-ПРЭЗІДЭНТА МЕНШ ЗА АФРААМЕРЫКАНЦА

Грамадзяне ЗША больш схільныя бачыць на пасадзе прэзідэнта краіны афраамерыканца, чым жанчыну. Такія вынікі сацыялагічнага апытання праведзенага CNN/Opinion Research Corp.

На пытанне «Ці гатова нацыя да таго, што прэзідэнтам стане афраамерыканец?», станоўча адказалі 72 працэнты «белых» рэспандэнтаў і 61 працэнт афраамерыканцаў. Прыняць жанчыну на пасадзе прэзідэнта ЗША, згодна з вынікамі апытання, гатова меншая колькасць амерыканцаў. Што нацыя гатова да прэзідэнта-жанчыны, лічаць 65 працэнтаў рэспандэнтаў-мужчын і 64 працэнты ўдзельніц апытання. Пытанне пра жанчыну-прэзідэнта ці кіраўніка дзяржавы з цёмным колерам скуры сёння надзвычай актуальнае: барацьба за вылучэнне кандыдатам ад дэмакратычнай партыі зараз вядзецца паміж былой «першай лэдзі» Хілары Клінтан і афраамерыканцам Баракам Абамай. Абодва кандыдаты маюць роўныя шанцы выйсці ў фінал выбараў прэзідэнта ЗША.

НАЗВАНЫЯ НАМІНАНТЫ НА «ОСКАРА»

Амерыканская кінаакадэмія 22 студзеня назвала кароткі спіс прэтэндэнтаў на прэмію «Оскар».

У намінацыі «Лепшы фільм» аказаліся прадстаўлены драма «Збавенне», «Майкл Клэйтан», камедыя «Джуна», «Нафта» і «Старым тут не месца». Фільм «12» расійскага рэжысёра Мікіты Міхалкова стаў адной з пяці замежных стужак, якія трапілі ў лік намінантаў прэміі Амерыканскай кінаакадэміі.

У АЛЬПАХ ВЫРАТАВАЛІ ЎКРАІНСКУЮ СЯМ'Ю

У нядзелю італьянская паліцыя выратавала сям'ю ўкраінцаў, якія спрабавалі ў Альпах нелегальна перайсці мяжу паміж Італіяй і Швейцарыяй. Мяці і яе пяцёра дзяцей ва ўзросце ад дзевяці да 21 года збіліся з дарогі і ледзь не загінулі.

Нелегальныя імігранты заблудзіліся на гары Монтэ Лема, вышынёй 1600 метраў. Бежанцы спрабавалі падаваць сігналы бедства з дапамогай дзіцячай партатыўнай рацыі. Заклікі аб дапамозе на ламанай англійскай мове выпадкова перахапіў італьянскі радыёаматар, які і звязаўся з паліцыяй. Паліцэйскі верталёт падабраў перабежчыкаў. На некаторых дзецях не было нават чаравікаў. Трое членаў сям'і дастаўлены ў бальніцу з абмаражэннямі.

У суд Столінскага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Гардзіеўскага Юрыя Захаравіча,** 04.04.1964 года нараджэння, ураджэнца в. Маньковічы Столінскага раёна, апошняе вядомае месца жыхарства якога да мая 1996 года — в. Маньковічы, вул. Саўгасная, 4 Б Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, які нідзе не працаваў, з чэрвеня 1996 г. звестак аб яго месцазнаходжанні няма.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Гардзіеўскага Ю.З, паведаміць іх суду Столінскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Ва ўрадзе

ДЭФІЦЫТ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ЛІКВІДУЕ ДАСТОЙНАЯ ЗАРПЛАТА

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва змяніла свае падыходы да падрыхтоўкі кадраў і арыентуецца зараз на тыя спецыяльнасці, якія запатрабаваныя сёння на рынку, падкрэсліў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага абмяркоўваўся праект Дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва краіны на 2008 год, кіраўнік міністэрства Уладзімір Патупчык. Паводле яго слоў, попытам карыстаюцца рабочыя будаўнічых прафесій — муляры, мантажнікі, тынкоўшчыкі, страхары, рабочыя па металаапрацоўцы — токары, фрэзераўшчыкі, шліфоўшчыкі. Па-ранейшаму захоўваецца высокі попыт на ўрачоў, інжынераў-праграмістаў, інжынераў-будаўнікоў, інжынераў-канструктараў.

Разам з тым «нам сёння ў меншай колькасці патрэбны бухгалтары і эканамісты», — зазначыў міністр. А таму падрыхтоўка такіх спецыялістаў у рэспубліцы скарочана ў параўнанні з 2002 годам у 5,4 раза. Акрамя таго, сітуацыя на рынку працы прымусіла рыхтаваць менш аператараў ЭВМ, афіцыянтаў, барменаў, сакратароў-машыністак, буфетчыкаў, якія таксама практычна не запатрабаваныя.

Аналіз сітуацыі з недахопаў кваліфікаваных кадраў, у прыватнасці, у той жа будаўнічай галіне паказвае, што тут далёка не ўсё гладка з сістэмай аплаты працы, якая зараз існуе. Адсюль — і адток спецыялістаў, якія часам аддаюць перавагу працы за межамі Беларусі, а мы ў выніку маем дэфіцыт рабочых будаўнічых прафесій. У гэтай сувязі, на думку старшыні праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча, было б мэтазгодна правесці эксперымент і дазволіць у будаўніцтве ўстанаўліваць такія зарплаты, якія б стымулявалі прыцягненне кваліфікаваных кадраў. Галоўны банкір, дарэчы, параўноўваючы зарплату будаўнікоў у нашай краіне і Расіі, зазначыў, што на радзіме яны зарабляюць у 2,5 раза менш. «Мы можам будаўніцтва ўзяць як першую галіну для правядзення эксперыменту, і калі ён будзе ўдалым, то зможам правесці такую схему і ў іншых», — лічыць ён. Кіраўнік урада Сяргей Сідорскі таксама за тое, каб у галіне аплаты працы было як мага менш перакосаў. Аднак прэм'ер не пагадзіўся з тым, што ў нас неабходна падымаць зарплату да маскоўскага ўзроўню. У гэтай сувязі ён нагадаў аб выдатках, якія існуюць у вялікіх расійскіх гарадах. «Калі мы створым зарплату за вылікам тых расходаў, якія нясуць людзі, напрыклад, у Маскве, спецыялісты застануцца», — не сумняваецца ён.

Паводле інфармацыі Уладзіміра Патупчыка, на пачатак гэтага года ў краіне на ўліку стаялі 44,1 тысячы беспрацоўных, з іх 37 працэнтаў — моладзь. 67 працэнтаў беспрацоўных — жанчыны. Між іншым, міністр падкрэсліў, што такая структура беспрацоўных характэрная для ўсіх краін свету. Гаворачы пра распрацоўку гэтага дакумента, міністр зазначыў, што ў ім былі ўлічаны прапановы рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, аблвыканкамаў, аб'яднанняў наймальнікаў і прафсаюзаў, грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў. А галоўная яе мэта — далейшае павышэнне эфектыўнасці працоўных рэсурсаў. Згодна з праектам, да канца гэтага года плануецца павялічыць колькасць занятых у эканоміцы да 4460—4535 тысяч чалавек.

Прэм'ер, дарэчы, запатрабаваў, каб апошні паказчык быў выкананы па верхняй мяжы. Акрамя таго, Сяргей Сідорскі паставіў задачу стварыць сёлета ў рэспубліцы дастаткова каля 165 тысяч працоўных месцаў. На думку кіраўніка ўрада, праграма занятасці насельніцтва павінна быць шчыльна ўвязана з праграмай развіцця малых і сярэдніх гарадоў.

Праблема, якая ўжо сёння відавочная, — на многіх вытворчасцях у малых і сярэдніх гарадах адчуваецца недахоп спецыялістаў. Так, напрыклад, на тым жа шклоўскім заводзе па вытворчасці газетнай паперы штат работнікаў сфарміраваны крыху больш, чым напалову. «Мы сюды павінны накіраваць дзяржаўныя сродкі, зрабіць усё, каб сюды прыйшлі кваліфікаваныя спецыялісты», — сказаў прэм'ер. А для гэтага, зазначыў ён, мы павінны забяспечыць кадрам у такіх гарадах гарантаваную зарплату, гарантаванае працоўнае месца і жыллё. Прагучала крытыка з вуснаў кіраўніка ўрада і ў адрас мясцовых уладаў, якія, як мяркуе Сяргей Сідорскі, недастаткова актыўна займаюцца падборам кадраў. Пасля двухгадзіннага абмеркавання праекта праграмы на Прэзідыуме Савета Міністраў было прынята рашэнне да канца студзеня дапрацаваць дакумент. Акрамя таго, прэм'ер запатрабаваў прапісаць у ім новыя працоўныя месцы канкрэтна на прадпрыемствах, па населеных пунктах і тэрмінах. «Мы прынялі інавацыйную праграму развіцця краіны, дзе дакладна прапісаны ўсе прадпрыемствы, якія стварацюцца. З улікам гэтых рэсурсаў і патрэбна фарміраваць праграму», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Жыллё

5 МЛН 200 КВ.М ЖЫЛЛЯ Ў 2008-м — ЗАДАЧА ВЫРАШАЛЬНАЯ

Будаўніцтва жылля для «чаргавікоў» сёлета можа падаражэць прыкладна на 12 працэнтаў?

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.

— Летась перад будаўнічым комплексам краіны была пастаўлена даволі сур'ёзная задача па аб'ёмах будаўніцтва жылля. У якой меры яна была выканана?

— Усяго за 2007 год у краіне было ўведзена ў эксплуатацыю 4 млн 685 тысяч кв. метраў жылля (99,7 працэнта ад максімальнага гадавога задання галіны).

— У апошнія гады самае складанае становішча з забеспячэннем жылля — у Мінску...

— Летась у сталіцы было пабудавана 980,9 тысячы кв. метраў жылля, што пры гадавым заданні 1 млн 76 тысяч кв. м адпавядае толькі 91,2 працэнта ад плана. Усе астатнія рэгіёны краіны перавыканалі свае заданні. Лепш за астатніх спрацавала Мінская вобласць, дзе летась было пабудавана 107,2 працэнта жылля ад гадавога плана.

— У апошнія гады кіраўніцтва краіны шмат увагі надае будаўніцтву жылля для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў...

— Летась было запланавана пабудаваць 3 млн 333 тыс. кв. метраў жылля для «чаргавікоў», аднак у эксплуатацыю было ўведзена толькі 2 млн 831 тыс. кв. метраў, што адпавядае 60,4 працэнта ад агульнага аб'ёму жыллёвых «квадратаў». Па гэтым напрамку запланаваны паказчык выканала толькі Магілёўская вобласць.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

— Па якім кошце будавалася жыллё летась?

— Кошт пабудаванага жылля па лініі шматкватэрных дамоў, што былі ўведзены ў эксплуатацыю ў гарадах для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, склаў летась 902 тысячы рублёў за квадратны метр жылля агульнай плошчы. Пры будаўніцтве дамоў з дзяржаўнай падтрымкай (дзе выкарыстоўваліся льготныя крэдыты і субсідыі) кошт квадратнага метра жылля склаў 863 тысячы рублёў. Увогуле сярэдні кошт жылля для ўсіх катэгорый забудоўшчыкаў без уліку індывідуальных забудоўшчыкаў склаў 1 млн 53 тыс. рублёў за квадратны метр. Кошт будаўніцтва камерцыйнага жылля ў гарадах дасягнуў 2049 долараў за «квадрат».

Трэба адзначыць, што тэмпы павелічэння кошту будаўніцтва жылля летась паменшыліся ў параўнанні з 2006 годам прыкладна на 5 працэнтаў.

— Якім будзе кошт жылля сёлета?

— Гэта цяжкае пытанне. Хутчэй за ўсё, кошт жылля будзе выходзіць з росту сярэднегадавога індэксу будаўніча-мантажных работ, які зараз зацверджаны ў памеры 112 працэнтаў. Калі гэты індэкс будзе павялічвацца такімі тэмпамі, то на працягу 2008 года будаўніцтва жылля падаражэе прыкладна на 12 працэнтаў.

— На ваш погляд, новая планка будаўніцтва жылля ў краіне сёлета ў памеры 5 млн 200 тысяч кв. метраў будзе выканана?

— Будаўнічы комплекс краіны мае зараз нядрэнныя напрацоўкі, каб выканаць гэта заданне. Адзінае, што, магчыма, будуць назіравацца цяжкасці з запланаваным уводам жылля ў сталіцы, дзе застаюцца праблемы з будаўнічымі магутнасцямі і выдзяленнем будаўнічых пляцовак. Разам з тым адзначу, што мэрыя Мінска распрацавала сур'ёзную праграму па развіцці будаўнічага комплексу сталіцы і нарошчванні магутнасцяў будаўнічых арганізацый.

Сяргей КУРКАЧ.

Прамая лінія

МАЯ СЯМ'Я: АД ДАПАМОГІ ДА ЖЫЛЛЯ

Наважыцца на нараджэнне дзіцяці заўсёды цяжка, таму не выпадкова, што ўкласціся ў запланаваную спачатку гадзіну «прамой лініі» на тэму дзяржаўнай падтрымкі сям'і з дзецьмі аказалася проста нерэальна. Асаблівасці выплаты дзіцячых дапамог і прадастаўленне адраснай сацыяльнай дапамогі, спагнанне аліментаў і магчымасць падпрацовак у «дэкрэтным» водпуску, варыянты будаўніцтва і пагашэння жыллёвых крэдытаў — такім аказаўся далёка не поўны спіс найбольш папулярных зваротаў. Але аб усім па парадку. Такім чынам, на пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Васільеўна ШЭМЕТАВЕЦ і галоўны спецыяліст упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Марыяна Мікалаеўна ЕЎТУШЭНКАВА.

— Працую прыёмнай маці, выхоўваю траіх дзяцей-сірот школьнага ўзросту. Ці будзе павялічвацца на іх дапамога, якая на сёння складае каля 155 тыс. рублёў?

Алена Пятроўна,
Гродзенская вобласць

— Увогуле нормы забеспячэння дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі, вызначаны пастановай урада ад 6 ліпеня 2006 года. Прычым, натуральна, гэтыя нормы перыядычна пераглядаюцца на падставе прапаноў Мінадукацыі і Мінфіна.

— Удакладніце, калі ласка, што ўключаецца ў даход для атрымання адраснай сацыяльнай дапамогі, і, у прыватнасці, ці ўваходзіць у такі даход бясплатнае харчаванне на дзяцей ва ўзросце да двух гадоў? Па-другое. Ці можа кошт бясплатнага дзіцячага харчавання ў кожным месяцы быць розным? І яшчэ. Бясплатнае харчаванне на дзіця будзе прадастаўляцца толькі да красавіка, таму патлумачце: ці будзе яно ўключацца ў даход у выпадку, калі я звярнуся па адрасную дапамогу ў маі?

Ганна Яновіч, *г. Масты*

— Пры вызначэнні даходу сям'і для прадастаўлення адраснай сацыяльнай дапамогі кошт бясплатнага харчавання на дзіця ва ўзросце да двух гадоў у разлік прымаецца. Па-другое. У розных месяцах кошт бясплатнага дзіцячага харчавання сапраўды можа быць зноў-такі розным, бо не ў апошнюю чаргу гэта — пытанне змянення цэнаў. І па-трэцяе. Даход для прадастаўлення адраснай дапамогі разлічваецца за тры папярэднія месяцы перад зваротам, інакш кажучы, калі вы напішаце заяву ў маі, то ў даход будзе ўключаны і кошт дзіцячага харчавання.

— Хутка майму сыну споўніцца паўтара года, пасля чаго я хачу выйсці на работу. Аднак выйсці не на сваё ранейшае месца, а ўладкавацца да іншага наймальніка. Патлумачце, як гэта можна зрабіць, ці трэба мне пісаць па ранейшым месцы заяву аб спыненні выплаты дзіцячай дапамогі, калі я па-спрабую ўладкавацца на новай рабоце ўсяго на 0,5 стаўкі? Ці будуць у такім выпадку выплачваць дзіцячую дапамогу ўжо па новым месцы?

Другое пытанне. Якім павінен быць парадак звальнення, уладкавання і выплаты дзіцячай дапамогі ў выпадку ўладкавання ў іншага наймальніка на поўную стаўку?

І нарэшце. На які час у такім выпадку павінны заключыць са мной кантракт па новым месцы?

Галіна Сяргееўна, *г. Гродна*

— У выпадку ўладкавання на 0,5 стаўкі да новага наймальніка ніякіх заяў па старым месцы работы пісаць не трэба. Вы па-ранейшаму будзеце атрымліваць дапамогу па гэтым месцы і адначасова — працаваць не больш чым на палову стаўкі ў іншай арганізацыі.

Калі ж вы, Галіна Сяргееўна, звольніцеся і ўладкуецеся на работу да іншага наймальніка на поўную стаўку, то дзіцячая дапамога будзе выплачвацца ўжо па новым месцы ў памеры 50 працэнтаў. Што ж да кантракта, то на новым месцы яго павінны заключыць, прынамсі, да часу, пакуль дзіцяці не споўніцца 5 гадоў.

— Ці праўда, што ў выпадку афармлення дзіцяці ў дадок да заканчэння тэрміну «дэкрэтнага» водпуску памер дзіцячай дапамогі зменшыцца напалову?

Алена Стрыжэвіч, *г. Мінск*

— Праўда. Паводле дзеючага заканадаўства, у памеры 50 працэнтаў дапамога па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў выплачваецца ў выпадку выхаду маці на работу больш чым на палову стаўкі і ў выпадку афармлення дзіцяці ў дашкольную ўстанову.

— Ці маюць права на дадатковую сталічную дапамогу «на памперсы» для дзяцей да года іншагародніх студэнты, якія навучаюцца і часова пражываюць у Мінску? І ці спыніцца выплата такой дапамогі, калі ў жніўні мы паедзем працаваць па размеркаванні ў свой родны горад?

Наталля Петрачкова, *г. Мінск*

— На гэты конт можна сказаць толькі адно: права на атрыманне ўзгаданай дапамогі маюць толькі асобы з пастаяннай прапіскай (ці зараз — ужо рэгістрацыяй) у Мінску.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.

(Працяг будзе.)

Чалавек-чалавеку

Дзе ты, Аляксандра, Аляксандра Мітрафанаўна?..

Газету «Звязда» наша сям'я выпісвае вельмі даўно, з задавальненнем чытаем. А вось цяпер вырашылі звярнуцца з просьбай: вельмі хочацца знайсці сваю свячку, стрыечную сястру Пятроўскую Аляксандру Мітрафанаўну.

Нарадзілася яна прыкладна ў 1939 годзе, жыла ў пасёлку Белгрэс Арэхаўскага раёна Віцебскай вобласці, з залатым медалём закончыла школу (мы ў той год якраз сустракаліся), паступіла ў Гродзенскі медінстытут.

Пасля яго заканчэння, ведаю, Аляксандру накіравалі на працу ў Лунінец. І вось тут...

Яна, напэўна, выйшла замуж, змяніла прозвішча...

Да таго ж мы абое былі тады маладыя, кожны будаваў сваё жыццё — працавалі, гадавалі дзяцей, шукалі новых сяброў. А цяпер вось — вельмі хочацца знайсці людзей, родных табе па крыві. І ў гэтым я вельмі спадзяюся на дапамогу сваёй газеты, на яе чытачоў з Лунінца.

Анатоль Піліпавіч ПЯТРОЎСКІ,
г. Дуброўна

(Адрас і нумар тэлефона ў рэдакцыі.)

Новыя тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі

У Беларусі з 1 студзеня ўстаноўлены новыя тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва. Яны зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 69.

Як паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна, дакумент прыняты ў адпаведнасці з падпунктам Указа № 604 «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі» ад 6 кастрычніка 2006 года.

Тарыф на паслугі па тэхнічным абслугоўванні жылых дамоў устаноўлены ў памеры Br240,3 у месяц за 1 кв.м агульнай плошчы жылога памяшкання. Новыя цэны і тарыфы на цеплавую энергію для патрэбаў ацяплення і гарачага водазабеспячэння складуць Br36 355,5 за 1 Гкал, на халоднае водазабеспячэнне — Br321,4 за 1 куб.м, на каналізацыю — Br201,6 за 1 куб.м, за вывад і абсталяванне цвёрдых бытавых адходаў — Br4005,2 за 1 куб.м, за карыстанне ліфтамі — Br1184 з аднаго пражываючага ў месяц. Зацверджаны таксама цэны для насельніцтва на прыродны і звадкаваны газ, электрычную энергію.

Тарыфы на электраэнергію для насельніцтва з 1 студзеня ўстаноўлены ў памеры Br116 за 1 кВт.гадз

У Беларусі тарыфы на электрычную энергію для насельніцтва з 1 студзеня 2008 года ўстаноўлены ў памеры Br116 за 1 кВт.гадз. Аплата электраэнергіі ў жылых дамах (кватэрах), абсталяваных электраплітамі, складзе Br84. Новыя тарыфы зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 69, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна.

Гэтым дакументам устанаўліваюцца таксама тарыфы на электраэнергію для насельніцтва, дыферэнцыраваныя па часавых перыядах. Так, пры ажыццяўленні дыферэнцыраванага ўліку кошт электрычнай энергіі ў перыяд мінімальных нагрузак (з 22.00 да 17.00) складае Br81,2, максімальных (з 17.00 да 22.00) — Br232 за 1 кВт.гадз. У жылых дамах (кватэрах), абсталяваных электраплітамі, тарыфы складуць Br58,8 і Br168 адпаведна.

Кошт электраэнергіі для патрэбаў ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай магутнасцю абсталявання больш за 5 кВт у перыяд мінімальных нагрузак (з 23.00 да 6.00) устаноўлена на ўзроўні Br116, у астатні час сутак — Br580 за 1 кВт.гадз.

Жабінкаўскі вадзіцель кабылы

Па Жабінцы як мінімум два разы на дзень праязджае незвычайны «экіпаж». Гэта супрацоўнік мясцовага райспажыўтаварыства Аляксандр Панасюк развозіць па магазінах, установах грамадскага харчавання тару і іншыя грузы. Свой воз, або, лепш сказаць, прычэп Аляксандр Іванавіч сканструяваў сам паводле ўласнага праекта. Грузавая платформа зроблена з прычэпа старога трактара. А кабіну вясковы майстар зрабіў шкляную. У такой ні дождж, ні снег, ні вецер не страшныя. Імідж сучаснага вадзіцеля падтрымліваюць магнітафон і тэлефон, якія заўсёды ў кабіне.

Жыве Аляксандр Панасюк у вёсцы Шчэглікі, кіламетры за чатыры ад горада. Але кожнай ранічкай запрагае кабылку і а палове дзевятай праязджае па цэнтральнай вуліцы Жабінкі. Многія сустрэчныя прыпыняюцца, каб паглядзець на незвычайную павозку. Часцей за ўсё стракаюць спажыўсаюзаўскага возніка са здзіўленнем, а право-дзяць з усмешкай. Адзін раз польскія турысты зацікавіліся транспартным сродкам, распытвалі яго, фатаграфаваліся разам. Ды Аляксандр Іванавіч чалавек сціплы. Увагі да сваёй персоны нават трохі саромеецца. Справу сваю ведае: груз даставіў, а цяглавую сілу — на «запраўку». Дастаў скрынку з аўсом, паставіў напарадзе — і ўсё ў парадку.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Памятай сваё!

«...ДЗЕ ДАБЫВАЕЦЦА ВОЛЯ ДЫ ПРАЎДА...»

Калі не стала краіны, пра якую ўсе памяталі, калі народ бядноў і вымушаны быў цярпець усё больш і больш, і нават шляхта ўзгадвала былыя часы, калі з гонарам магла адносіць сябе да падданых караля, час ад часу нібыта ў паветры распаўсюджваліся заклікі да паўстання — супраць тых, хто пасля падзелу Рэчы Паспалітай прыйшоў на гэтую зямлю сцвярджаць сваю волю. Падданыя каралёў сталі падданымі царoў. У Расійскай імперыі былі свае законы, свае праблемы і свае сродкі іх вырашэння. Але знаходзіліся ліхія галовы, якія час ад часу нагадвалі пра колішнюю магутнасць і славу сумеснай дзяржавы.

Чарговы раз гэта адбылося ў 1863 годзе, калі 22 студзеня ў Варшаве быў выдадзены Маніфест Цэнтральнага нацыянальнага камітэта, які абвясціў аб пачатку нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Польшчы, Беларусі і Літве. А 23 студзеня пачалося паўстанне за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. У Беларусі і Літве яго рыхтаваў Літоўскі правінцыяльны камітэт. Але глеба да паўстання ўжо была падрыхтаваная працай некаторых рэвалюцыянераў: Кастуся Каліноўскага, які пасля вучобы ў Пецярбургу прывёз на радзіму крамольныя ідэі, яго бліжэйшых паплечнікаў Валерыя Урублеўскага і Фелікса Ражанскага і іншых прадстаўнікоў шляхты, якая была незадаволена жыццём у Расійскай імперыі.

Але просты народ, сялянства стагнала. На яго былі разлічаны выпускі нелегальнай газеты «Мужыцкая праўда», якая яшчэ ў 1868 годзе пісала: «...Глум, здзекі ства і несправядлівасць выходзяць ад самога цара — ён то з нас выбірае войска, то ён з нас выдзірае грошы нібы на патрэбу народа, а, узяўшыся з усімі ціцлямі за рукі, адно нас трымае ў няволі. Но прыходзіць яму ўжо канец, бо мужык пачуў вольнасць, — а мужыцкая вольнасць — гэта ўсё роўна, што шыбеніца для ўсіх здзерцаў і глумліцеляў народа! Для таго то цар спыняе вольнасць мужыцкую і спыняці будзе, для таго то, калі ў паноў сто разоў пытаў, якую яны хочуць даці вольнасць мужыкам, у мужыкоў ні разу не спытаў, якой яны хочуць вольнасці. Ён знае, якая то вольнасць мужыцкая, ён ведае, што мужык хоча, каб ніхто не смеў драці ні з каго.

Дзяры з нас, цар, дзярыце з нас чыноўнікі яго, хаця да астатняй шкуры; але памятайце, што і на вас прыйдзе пара, памятайце, што калі мужык разгуляецца, то як свет шырокі, кроў ваша пальецца!!!»

Поўны надзей і веры ў свой народ малады Каліноўскі разлічваў на шырокае народнае паўстанне, імкнуўся далучыць да яго сялян: «Трэба нашым хлопцам спяшыць з вiламі ды косамі туды, дзе дабываецца воля ды праўда...»

У студзені толькі ўсё пачыналася, і так хацелася верыць у сваю радзіму... Былі сутычкі, нават баі з вайскоўцамі. Існавалі нават рэвалюцыйныя суды і жандармерыя, на месцах стваралася паўстанцкая адміністрацыя. Але былі і непаразуменні сярод тых, хто лічыўся аднадумцамі. Здавалася б, адны мэты ў паўстанцаў, але падзяліліся яны паміж сабой на два крылы. «Белае», ліберальнае, якое складала маёнткавая шляхта. «Чырвонае», больш рэвалюцыйнае і дэмакратычнае, як

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

23 студзеня 2008 г. № 3 (106)

ЗА КОЖНЫМ ЗВАРОТАМ — ЧАЛАВЕК

Раіса ПАРФЁНЕНКА, старшыня Міёрскага раённага Савета, працуе з людзьмі не першы год. Пад яе крылом — дзевяць сельскіх Саветаў і адзін гарадскі. Ведае многіх спецыялістаў раёна. Калі прыязджае з інфармацыйнай групай у гаспадарку, абавязкова падыходзіць і цікавіцца праблемамі заслужанага інжынера ці маладога ветэрынара. Для чалавека дарагога каштуе, калі ён бачыць, што яго заўважылі і памятаюць.

— Якія пытанні хвалююць сёння вяскоўцаў?

— Пытанні, якія датычацца работы гандлю, дарожнай службы, аказання транспартных паслуг... Людзі цікавяцца, як атрымаць участак для будаўніцтва жылога дома, пытаюцца пра наследаванне, атрыманне пасведчання на права жыхарства (рабочыя размяшчаецца ў памежнай зоне, часта прыязджаюць грамадзяне Латвіі, Літвы). Хочуць ведаць людзі, як ідуць справы ў дзяржаве, у раёне.

Перыядычна гучаць пытанні, звязаныя з апрацоўкай асабістых зямельных надзелаў. У 2006 годзе з-за дажджлівага надвор'я ва ўсіх гаспадарках зацягнулася ўборка збожжа. Адпаведна дапамога людзям была запозненай. Было шмат званкоў, жыхары вёсак выказвалі незадаволенасць. У мінулым годзе скаргі наконт апрацоўкі агародаў не паступалі. Безумоўна, заслуга ў гэтым не толькі спрыяльнага надвор'я, але і кіраўніцтва гаспадарак, якія размешчаны на тэрыторыі сельсавета.

— Напэўна, ёсць і невырашальныя праблемы?

— Яны звязаны з недахопам фінансаў. Самая вялікая праблема — рамонт вуліц населеных пунктаў, дарог (яшчэ не ўсе унутраныя дарогі вёскі перададзены дарожным службам).

Грошы ў сельсаветскую казну паступаюць з розных крыніц, але іх колькасць значна саступае колькасці аб'ектаў, у якія гэтыя фінансавыя сродкі павінны ўкладацца. Радуе, што ў 2008 годзе кожнаму сельсавету выдзелена больш грошай на добраўпарадкаванне (у прыватнасці, на вулічнае асвятленне, утрыманне могілак, воінскіх пахаванняў, ліквідацыю аварыйных дрэў). У якасці прыкладу можна прывесці Павяцкі сельсавет, які дзякуючы старшыні Люцыі Гардэль папаўняе ўласны бюджэт сваімі сіламі. Яна вельмі разумна арганізавала збор падаткаў на зямлю з насельніцтва і не дапускае ніякіх парушэнняў.

— Якая сітуацыя складваецца ў раёне з пісьмовымі зваротамі?

— У нас пісьмовых зваротаў вельмі мала ў параўнанні з іншымі раёнамі: у год больш чым 250 не бывае. Гэта сведчыць аб тым, што людзі з-за драбязы не пішуць.

Больш за ўсё зваротаў звязана з рамонтам жылля, добраўпарадкаваннем вуліц. 50 працэнтаў усіх лістоў — гэта просьбы аб матэрыяльнай дапамозе. У асноўным пішуць тыя, каму яна сапраўды неабходная. Але маюць месца і спецыфічныя звароты, прычым не так рэдка.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

МАЛЫЯ ГАРАДЫ

ДОБРА ТАМ, ДЗЕ МЫ ЁСЦЬ

Яшчэ два-тры гады таму ўзровень беспрацоўя ў горадзе Беразіно складаў 1,8 працэнта ад занятага ў эканоміцы насельніцтва — паказчык быў вышэйшы за сярэдні па Мінскай вобласці. Праблемы раённага цэнтра мала чым адрозніваліся ад праблем іншых малых гарадоў, асноўная забудова якіх прыйшлася на савецкі час: высокі працэнт зношанасці камунікацый, невялікая колькасць прамысловых прадпрыемстваў, нізкія тэмпы жыллёвага будаўніцтва, шэраг нявырашаных пытанняў па добраўпарадкаванні...

Аднак ужо ў мінулым годзе ўзровень беспрацоўя быў зніжаны да 1,1 працэнта, а сярэднямесячная зарплата выросла з 542 тысяч рублёў (у 2006) да 640 тысяч... Кожны «сярэдні паказчык» — гэта як сярэдняя тэмпература па бальніцы. А яна, як вядома, можа вагацца ад вельмі нізкай да вельмі высокай. Прырост сярэднямесячнай зарплаты больш чым на 100 тысяч адбыўся перш за ўсё дзякуючы павелічэнню аб'ёмаў вытворчасці на асноўных горадаўтваральных прадпрыемствах і ў першую чаргу — на ААТ «Бярэзінскі сыраробны завод».

Калі тры з паловай гады таму сюдыпрыйшоў новы дырэктар Аляксей Барауля, завод паўстаў перад ім далёка не ў лепшым стане. Прахадная не выконвала сваіх функцый, агароджа ляжала, прадукцыя выносілася работнікамі... Невялікае прадпрыемства задыхалася пад цяжарам даўгоў, якія вылічаліся мільярдамі. На ўсе зімовыя месяцы людзі вымушаны былі браць водпуск за свой кошт — з-за адсутнасці сыравіны для перапрацоўкі вытворчасць практычна стаяла...

— Мы пачалі з самага галоўнага — з дысцыпліны, — расказвае Аляксей Міхайлавіч. — Акрамя гэтага, трэба было добра паварушыць звілінамі і пакруціцца, каб разлічыцца з даўгамі. Іх аддалі хутка — менш чым за паўгода.

Сёння Аляксей Барауля лічыць, што поспех любога прадпрыемства на 70 працэнтаў залежыць ад яго кіраўніка. Магчыма, нехта не пагодзіцца з такім меркаваннем. Але наўрад ці сярод апошніх будуць тыя, хто можа рэальна параўнаць «учора» і «сёння» Бярэзінскага сыраробнага завода.

Некалькі гадоў таму, расказалі мне, на прадпрыемства нават заходзіць было непрыемна: цэхі і пакоі практычна не абагравалiся, трубы, заматаныя пакетамі з-пад малака, не радавалі вока, столь абвальвалася... З-за няспраўнага абсталявання і адсутнасці сыравіны людзі працавалі ў адну змену, сярэдняя зарплата на прадпрыемстве складала 224 тысячы рублёў.

За апошнія тры гады тут адрамантавалі і часткова аднавілі абсталяванне, а яшчэ значна пашырылі сетку пастаўшчыкоў сыравіны — у дадзеным выпадку, малака. Дырэктар завода асабіста дамаўляўся наконт гэтага са старшынямі калгасаў іншых раёнаў.

— Ёсць сыравіна — ёсць работа, — лічыць Аляксей Барауля. — Сёння наша прадпрыемства працуе і ў дзве, і ў тры змены. І людзі, і вытворчыя плошчы занятыя «пад завязку».

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Дырэктар ААТ «Бярэзінскі сыраробны завод» Аляксей БАРАУЛЯ.

Колькасць работнікаў на прадпрыемстве за апошні час павялічылася на 100 чалавек, а сярэдняя зарплата за мінулы год склала 750 тысяч рублёў. На працу сюды хацелі б уладкавацца многія, але бяруць далёка не ўсіх — у адміністрацыі ёсць патрабаванні і да наяўнасці адукацыі, і да дысцыпліны. У самым хуткім часе на заводзе з'явяцца яшчэ 44 працоўныя месцы — сёлета будзе здадзены новы цэх па выпуску сухога абястлушчанага малака. Ён будуецца за кошт крэдытных рэсурсаў, інавацыйнага фонду, а таксама ўласных і бюджэтных сродкаў. У 2006 годзе прадпрыемства атрымала 1,6 млрд рублёў прыбытку, у мінулым — ужо 3,7 млрд рублёў.

Майстар па доглядзе сыру Раіса Аўтуховіч успамінае, што ў пачатку 2004-га прадпрыемства выпускала ўсяго 3—4 тоны прадукцыі ў дзень і каля 120 тон у месяц.

— Сёння нават не верыцца, што такое было, — усміхаецца Раіса Міхайлаўна. — Гэтыя лічбы павялічыліся ўтрая.

— Раней мы месяцамі сядзелі і без працы, і без зарплаты, — дадае фармоўшчык сыроў Таццяна Цэндрык. Таццяна Міхайлаўна на прадпрыемстве з 1981 года, так што можа параўноўваць. Сёння, гаворыць яна, людзі задаволены і ўмовамі працы, і зарплатай. Хоць праца ў Таццяны Міхайлаўны не з лёгкіх — да канца змены баляць і спіна, і рукі...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

РОЛЯ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ У ЖЫЦЦЕЗАБЕСПЯЧЭННІ ЛЮДЗЕЙ

У Шклоўскім раёне прайшоў абласны семінар, дзе разглядалася работа выканаўчых і прадстаўнічых органаў улады па выкананні Указа Прэзідэнта № 21.

Старшыні гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў Магілёўскай вобласці пабывалі ў раённым цэнтры, Рыжкавіцкім і Александрыйскім сельсаветах. Удзельнікі нарады падводзілі вынікі работы за 2007 год, абмяркоўвалі канчатковыя планы на гэты год і надзённыя праблемы мясцовых Саветаў.

Цяпер падводзяцца вынікі штогадовага спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання Магілёўшчыны. На наступнай сесіі абласнога Савета, якая адбудзецца ў лютым, пераможцы атрымаюць сцяг і дыпломы.

Ілона ІВАНОВА.

ПАД НАГЛЯДАМ — КРУГЛЫЯ СУТКІ

На трыццаць чалавек разлічана аддзяленне кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей і інвалідаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, якое адкрылася ў вёсцы Некрашы Іўеўскага раёна.

Рэканструкцыю будынка былой школы ў раёне праводзілі, як кажуць, усёй талакой. 110 мільёнаў рублёў выдзеліў на рамонт і абсталяванне раённы бюджэт, 60 мільёнаў — Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Аб стварэнні прыстойных умоў для адзіноких людзей паклапаціліся сельгаскааператывы імя Баума, «Агра-Ліпнішкі», а таксама іншыя арганізацыі раёна — лясгас, ДРБУ-156, сельгастэхніка, прадпрыемства меліяратыўных сістэм. Вельмі дарэчы будуць і падарункі, з якімі прыехалі на ўвахадзіны намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя Бірукова, старшыня абласнога камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Сяргей Анішчык і кіраўнік СВК імя Баума Віктар Канецкі.

Стварэнне аддзяленняў кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей і інвалідаў сёлета завершыцца ў кожным раёне Гродзеншчыны.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У СЯМЕЙНЫМ ДОМЕ — РАДАСЦЬ

У горадзе Ветка з'явіўся сямейны дзіцячы дом, гаспадары якога — былы бухгалтар аднаго з сельгаспрадпрыемстваў раёна і вадзіцель аддзела адукацыі, Вольга і Міхаіл Кір'янавы. Катэдж мае плошчу амаль у 200 квадратных метраў, ён аснашчаны новай мэбляй і бытавой тэхнікай.

Двухпавярховы дом пабудаваны на грашовыя сродкі рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў (амаль 230 мільёнаў рублёў пайшло на яго ўзвядзенне). Аплата камунальных паслуг будзе рабіцца таксама з бюджэтных сродкаў. А пасяліліся ў ім дзесяць прыёмных хлопчыкаў і дзяўчынак рознага ўзросту.

Ключы ад дома, а таксама падарункі былі ўручаны сямейнаму дому Кір'янавых старшынёй Гомельскага аблвыканкама Аляксандрам Якабсонам, начальнікам абласнога ўпраўлення адукацыі Марынай Бондар і старшынёй Веткаўскага райвыканкама Віктарам Бураковым.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

СПАГАДА НЕ ЗА ГРОШЫ

Вёскі старэюць, і многія іх насельнікі вымушаны, на жаль, дажываць свой век у адзіноце. Не мінае такая доля і гарадскіх людзей, але ў горадзе хоць крышачку прасцей дабірацца да аптэкі і магазіна, у дамах ёсць бытавыя зручнасці. Вяскоўцам жа трэба паклапаціцца пра дровы і тарфяное паліва, навесці элементарны парадак на дварэ і агародзе, а магазін бывае ў суседняй вёсцы, аптэка і наогул за дзесятак і больш кіламетраў. Састарэлым, хворым асабліва цяжка даводзіцца зімою.

У Драгічынскім раёне пры Антопальскай участковай бальніцы ёсць бальніца сястрынскага догляду. Але там усяго 25 месцаў на горад і раён, і трапіць туды могуць далёка не ўсе, хто мае патрэбу ў гарантаваных цяпле і чысціні, хоць бы на зіму. Ёсць яшчэ адно пытанне: не ўсе людзі хочуць ісці ў такую ўстанову, якая ўспрымаецца многімі як інтэрнат для састарэлых. Натуральна, што чалавеку найлепш жыць дома, дзе, як вядома, і сцены дапамагаюць.

У кожным сельсавеце вам скажуць, колькі ў вёсках жыве людзей, якія засталіся адны. Аднойчы ў Пінскім раёне бабулька расказвала аўтару гэтых радкоў, што найбольш жаданы госць у яе — старшыня сельскага Савета, якая заязджае ледзь не кожны ранак па дарозе на працу і гукае з парога: «Аляксандраўна, ты жывая?». «Тры хвіліны перамовімся, а мне на цэлы дзень палёгка, — гаварыла былая даярка, — значыць, нехта памятае пра мяне». Прыкладна так цяпер пачынаюць працоўны дзень многія кіраўнікі сельвыканкамаў.

У вёсках Бездзежскага сельсавета Драгічынскага раёна жыве 87 адзіноких старых. Клопат пра іх — прамы абавязак сельскага Савета. Але бываюць розныя сітуацыі, бо кожны чалавек — асаблівая гісторыя. Як расказаў старшыня Савета Іван Янушчык, тым, хто ходзіць на сваіх нагах і спраўляецца з няхітрай хатняй гаспадаркай, галоўнае паліва падвезці, дапамагчы бульбу пасадзіць, выканаць нейкія просьбы. Цяжэй з хворымі, нямоглымі. Быў выпадак, калі старшыня Савета сам і афармляў чалавека ў дом-інтэрнат, сам туды і адвозіў. Больш не было каму. Цяпер таксама ёсць пажылы інвалід па зроку, якога трэба пастаянна даглядаць. У інтэрнат ехаць ён катэгарычна адмаўляецца. Дзеці жывуць далёка. З іншымі сваякамі адносіны не склаліся. Пакуль што перабіваецца чалавек як прыйдзецца. Але ж здароўя з кожным днём не прыбаўляецца, і ў рэшце рэшт нешта трэба будзе вырашаць.

Яшчэ пятнаццаці старым у вёсках сельсавета дапамагаюць работнікі сацыяльнай службы. З гэтай службай, паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, супрацоўніцтва наладжана добра. І як толькі людзі звяртаюцца, за пажылым чалавекам замацоўваюць сацыяльнага работніка. Галіну Аўсянік, Антаніну Каласей, Любоў Карпік ведаюць і ў Бездзежы, і ў ваколіцах. Апошнюю асабліва паважаюць муж і жонка Філіповічы. Для адзінокіх старых людзей яна — галоўная падтрымка і апора. Любоў Васільеўна не толькі прыбярэ-памые, з магазіна пакупкі прынясе, але і градку-другую пасадзіць. Калі прывязуць паліва — уся яе сям'я дапамагае яго ўпарадкаваць. Муж і сядзібу абкосіць, і прыбраць дапаможа. І не адна яна так ставіцца, астатнія таксама. «Мы ж у вёсцы, побач жывём, — у адзін голас кажуць жанчыны, — тут усё навідавоку. А калі нам плацяць за гэта, то і рабіць трэба як след, а не вылічваць рабочыя гадзіны ды колькасць наведванняў».

Надзея Камарова, дырэктар раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, бездзежскімі работнікамі задаволена, як дарэчы, і большасцю іншых.

— У нас, — кажа Надзея Якаўлеўна, — выпадковых людзей не бывае. Яны вельмі хутка сыходзяць. Работа спецыфічная. Старыя людзі часта бываюць хворыя, знерваваныя, да таго ж у кожнага свой характар. Тут патрабуюцца асаблівыя навыкі, асаблівае цярпенне і спагада.

Дырэктар расказала, як нядаўна прыходзіла ўладкоўвацца на работу маладая жанчына. На выгляд вельмі сучасная, модна апранутая, кантактная. А калі кіраўнік стала расказваць пра асаблівасці працы, што, бывае, старога чалавека трэба памыць, пазногці пастрыгчы, кандыдатка аж у твары змянілася, а потым — бачком і ў дзверы... Яно і зразумела, даглядаць чужога чалавека не кожны здольны так, як Наталля Быцко, напрыклад. Калі яе падапечны памёр, найперш паведаміла дачцэ ў Маскву. Але чакаць яе не стала. Зрабіла ўсё, што належыць у такіх выпадках, прасядзела ўсю ноч каля пакойніка, як патрабуе народная традыцыя. Дачка прыехала толькі на наступную раніцу... Нямала падобных выпадкаў можа згадаць і Алена Марціновіч, адна з найбольш вопытных работніц службы.

Цэнтр займаецца не толькі абслугоўваннем нямогламі людзей. Тут працуюць з дзецьмі-інвалідамі, з маламаёмаснымі сем'ямі, нават мужчын, якія адны выхоўваюць дзяцей, старэюцца падтрымліваць. Стогадовых жыхароў, якіх у раёне зараз сем чалавек, таксама не забываюць адзначыць на святы хоць сціплым падарункам. Сёлета адзінокім інвалідам, састарэлым нарыхтавалі бульбу па вельмі нізкай цане. Моркву наогул завезлі бясплатна — знайшліся гаспадаркі-спонсары. Хоць багатых людзей і прадпрыемстваў не асабліва многа ў раёне, яны пакрысе дапамагаюць рабіць нешта карыснае для самых абяздоленых. Дзякуючы сабраным сродкам гэтай восенню дапамагалі збіраць у школу дзяцей са шматдзетных сем'яў, віншавалі інвалідаў з Новым годам і Калядамі.

А сацыяльныя работнікі і самі, без напамінаў і просьбаў, бывае, робяць сціплыя падарункі да святаў, прынясуць пірог на Вялікдзень ці калядныя пачастункі сваім падапечным, расказала Надзея Камарова. Да некаторых старыя людзі прывыкаюць, ставяцца як да сваіх. Ёсць такі Мікалай Мацука з вёскі Татар'я. Надзея Якаўлеўна згадала, як здзівілася, прыйшоўшы ў цэнтр, што такой спецыфічнай работай займаецца мужчына. А калі пагаварыла з бабулькамі, паглядзела, усе сумненні як рукой зняло. «Наш Коля самы лепшы!» — давалі характарыстыку пажылыя жанчыны. Дырэктар і сама ўпэўнілася, што Мікалай Аляксандравіч сапраўды ўмее парадак падтрымліваць, умее слова патрэбнае сказаць, а ў вясковай хаце мужчынскія рукі ніколі лішнімі не бываюць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Драгічынскі раён.

ТЕМА ДНЯ

ДОТАЦИЯ ХОЗЯИНА НЕ СФОРМИРУЕТ

До принятия Главой государства решения об улучшении условий работы органов власти первичного уровня 30 сельисполкомов располагались в зданиях, непригодных для эксплуатации, более 57 процентов сельских исполнительных комитетов не были оснащены транспортными средствами, компьютерной и множительной техникой.

В соответствии с протоколами поручений Президента (от 16 декабря 2005 года № 34 и от 17 июля 2006 года № 12) всеми облисполкомами были приняты меры по совершенствованию материально-технического оснащения сельисполкомов. На сегодня все они обеспечены зданиями, в которых созданы необходимые для работы условия, офисной техникой, каждый председатель имеет мобильный телефон. Урегулированы вопросы по зарплате. За исключением Минской области, где еще есть необходимость в 24 служебных автомобилях для сельисполкомов, все остальные регионы транспортом укомплектованы. Что касается недостающих 24 машин, до конца нынешнего года они будут закуплены.

С этого начал свое выступление на очередной встрече с руководителями исполкомов первичного территориального уровня, посвященной обсуждению проблем реализации Указа № 21, **председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь по региональной политике и местному самоуправлению Анатолий МАЛОФЕЕВ.**

— Раньше все наши беседы с председателями местных Советов сводились к перечислению того, чего им не хватает в работе: множительной техники, компьютера, карандашей и т.д., — отметил Анатолий Александрович. — Теперь вам созданы все необходимые условия. Встал вопрос реформирования системы. Не надо бояться этого слова. Мы определили этот процесс как усовершенствование деятельности органов власти первичного уровня в решении вопросов жизнеобеспечения населения. Что нужно делать — вы знаете. Про это говорилось неоднократно. На сегодняшнем этапе уже надо заниматься не постановкой задач, а детальным анализом: что уже сделано, что — еще нет и по каким причинам, какая вам нужна помощь.

Одним из самых трудных для исполнения был и пока остается первый пункт Указа, касающийся бюджета первичного уровня, заметил Анатолий Малофеев. В большинстве случаев подходы к его пополнению остались традиционными: основной объем приходится на дотации и совсем небольшая часть — на собственную налоговую базу. Если в этом вопросе руководствоваться только перечнем, приведенным в Указе, то выйти на соотношение 70 к 30 (70 процентов наполнения бюджета за счет налоговых поступлений и 30 процентов дотации) не получится, подчеркнул выступающий. А задача такая перед сельскими исполкомами поставлена.

— Витебчане нашли выход, — продолжал Анатолий Малофеев. — На этот год для формирования бюджетов первичного уровня область оставила часть подоходного налога и налог с продаж. Кто-то «взял» себе и курортный налог, выплаты за содержание собак и т.д. В итоге в целом по области получилось соотношение 64 процента за счет своей базы к 36 дотационным. По отдельным Советам первая цифра еще больше. У витебчан есть чему поучиться. Я, конечно, не утверждаю, что во всех областях должно быть только так, как на Витебщине. В каждой могут быть использованы свои подходы.

Отдельными расходными статьями в бюджет внесены благоустройство, уличное освещение и расходы по банному обслуживанию.

В очередной раз повторю: дотация хозяина не сформирует. Конечно, многое здесь зависит не только от вас, но и от района. Но вы сами должны критически посмотреть: в каком сегодня состоянии сельсовет, какие у вас имеются финансовые возможности, какие проблемы. Возможно, не все из вас станут настоящими хозяевами, но стремиться к этому необходимо. Вы — единственная власть на селе, и другой там не будет.

Подробнее Анатолий Александрович остановился на пункте Указа, где говорится о передаче на баланс специализированных организаций систем водообеспечения и водоотведения в сельской местности, нетранзитных дорог и улиц деревень и поселков. Отдельно он выделил проблему состояния шахтных колодцев: «Их нужно чистить, ремонтировать, на все это необходимы финансы. По вопросу передачи колодцев сегодня существуют разные мнения. Мы на передаче настаиваем. У колодцев должен быть свой хозяин, а вы должны работать как власть!»

Что касается нетранзитных дорог и улиц, вопрос этот пока для большинства областей остается нерешенным. Пока только в Могилевской, а совсем недавно и в Витебской областях председатели облисполкомов приняли волевое решение об их передаче на баланс местных дорожных организаций.

В конце прошлого года представители Администрации Президента Республики Беларусь провели проверки на предмет качества реализации на местах ряда законодательных документов (в том числе и 21-го Указа) и соответствующих поручений Главы государства, касающихся усовершенствования работы по решению вопросов жизнеобеспечения населения. По словам Анатолия Малофеева, проверки выявили ряд недостатков и нерешенных вопросов на разных уровнях управленческой «вертикали». В частности, медленными темпами «продвигается» тема ветхих домов. На сегодня снесено только 19 процентов от необходимого количества. Анатолий Малофеев предложил председателям обратить на реализацию Указа № 70 особое внимание.

Кроме того, проверяющие выявили, что 45 процентов сельских водопроводов не соответствуют санитарным нормам, что в вопросе передачи на баланс сельских дорог нет единых подходов и многое другое. По итогам проверок Администрация Президента предложила ряд рекомендаций. В том числе: до 1 декабря 2008 года Совету Министров совместно с Советом Республики, Национальной академией наук Беларуси и другими заинтересованными разработать и внести на рассмотрение Главы государства проект Концепции регионального развития Республики Беларусь до 2015 года, определить единообразные подходы к передаче специализированным организациям систем водоснабжения и водоотведения сельских населенных пунктов, дорог и иных объектов.

— Я думаю, что это тоже подтолкнет ситуацию к своему разрешению, особенно в части передачи дорог, — отметил Анатолий Малофеев.

Перед председателями сельских Советов также выступила **начальник отдела региональных бюджетов главного управления бюджетной политики Министерства финансов Республики Беларусь Зоя КРУГЛИКОВА**. Она сообщила, что все областные Советы уже провели сессии, посвященные обсуждению бюджета, и в своих решениях предусмотрели для Советов базового уровня отчисления от местных налогов и сборов. «Пока еще продолжается формирование районных и сельских бюджетов, — отстаивайте свои права, опираясь на Указ № 21», — посоветовала председателям сельисполкомов Зоя Николаевна.

Отдельными расходными статьями внесены благоустройство, уличное освещение и расходы по банному обслуживанию.

Зоя Кругликова рассказала, что сельисполкому как регистрирующему органу постановлением Совета Министров от 31.12.2006 № 1793 дано право пополнять свой бюджет за счет оказания дополнительных платных услуг в этой сфере (торжественная регистрация браков, рождений, проведение «золотых» и «серебряных» свадеб). Инструкция, разработанная совместно Минэкономики и Минюстом (от 12.01.2007 № 7/3), дает разъяснения по вопросам формирования и утверждения тарифов на упомянутые выше услуги.

Некоторые председатели сельисполкомов в ходе встречи обрисовали перед коллегами ситуацию в своих сельсоветах, озвучили наиболее сложные проблемы, которые в буквальном смысле «берут их за горло». Например, в Эйсмонтовском сельском Совете Берестовицкого района главная беда — плохое качество питьевой воды. Уровень содержания железа и нитратов в ней превышает норму в три раза. В районе нет станции обезжелезивания. На территории Вязьевского сельского Совета Осиповичского района 6 населенных пунктов целиком размещаются в водоохранной зоне. Возле двух из них необходимо расширять кладбища, но председателю Совета (учитывая особый статус земли) разрешение на это не выдается.

Председатель Костеневичского сельского Совета Вилейского района поинтересовался, кто должен заниматься ремонтом и содержанием водозаборных колонок в сельских населенных пунктах. А председатель Турьевского сельского Совета Краснопольского района обратил внимание на важность взаимопонимания с руководителями местных предприятий. Николай Ильенков подчеркнул, что с приходом в СПК «Краснопольский» нового директора многие вопросы Турьевского сельсовета стали решаться в самом оперативном порядке. Большое значение имеет и поддержка района, без которой, заметил Николай Иванович, высокопродуктивная работа власти первичного уровня не возможна.

Инга МИНДАЛЕВА.

ДОБРА ТАМ, ДЗЕ МЫ ЁСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Вось таму мы і хочам поўнасцю перарабіць лінію па выпуску сыроў — замяніць яе на аўтаматызаваную, — гаворыць Аляксей Барауля. — У сыраробнай вытворчасці ў нашай рэспубліцы, у адрозненне ад тых жа Украіны ці Польшчы, занятыя пераважна жанчыны. Трэба думаць, як палегчыць ім умовы працы.

Установўка новай лініі была запланавана на мінулы год — за гэта адказваў мінскі завод аўтаматычных ліній, які падпарадкоўваецца Міністэрству прамысловасці.

— На дварэ — 2008-мы, а замена лініі, як бачыце, яшчэ не пачыналася, — гаворыць Аляксей Барауля. — Міністэрства прабуксоўвае.

Паводле слоў дырэктара завода, на сёння — гэта адзінае невырашальнае пытанне. Усе іншыя — пачынаючы ад перааблаштавання душавых кабінак і індывідуальных шафаў для пераапранання і заканчваючы падвозам людзей пасля зменыдадому — ужо вырашаны.

Упакоўшчыца ТАА «Аршын» Вольга ГОМАН і брыгадзір Іна МАРМЫЛЬ.

Два гады таму мінчанін Віталь Спірын выкупіў у Беразіно адзін з будынкаў ліквідаванага швейнага прадпрыемства «Бярозка», якое раней займалася пашывам пасцельнай бялізны і рабочага адзення. На момант куплі ад будынка заставаліся практычна адны сцены, ацяпленне адсутнічала... У канцы мінулага года прыватнае швейнае прадпрыемства «Аршын» пад кіраўніцтвам дырэктара Віталя Спірына пачало выпускаць першую прадукцыю — мужчынскія сарочкі. Сёння пад патрэбы вытворчасці пераабсталявана толькі адно памяшканне, але тут працуе ўжо 15 чалавек. У месяц прадпрыемства вырабляе пакуль што ад 600 да 700 сарочак, але гэта — не мяжа яго магчымасцяў.

— У нас вельмі вялікія прэтэнзіі да якасці прадукцыі, — тлумачыць старшы майстар Тамара Караткевіч. — Але ў хуткім часе працэс вытворчасці паскорыцца — у цэху з'явіцца новае, больш дасканалае, швейнае абсталяванне — думаю, дзякуючы гэтаму павялічыцца і прадукцыйнасць працы.

На прадпрыемства бяруць швачак з кваліфікацыяй не ніжэй за трэці разрад. Уладкоўваюцца сюды часта жанчыны, якія раней працавалі ў раённым КБА. Але застаюцца ў «Аршыне» не ўсе — у першую чаргу з-за высокіх патрабаванняў.

— Мне і самой давялося поўнасцю перавучвацца, — гаворыць Тамара Караткевіч. — Пашанцавала, што наш дырэктар Віталь Васільевіч умее ўсё — ад рамонту абсталявання да пашыву, і можа навучыць іншых.

Дарэчы, першыя сарочкі Віталь Спірын пашыў сам. Прычым праверыў літаральна кожны сантыметр тканіны. Каб каўнерыкі ў сарочках выглядалі на ўсе сто, паўдня правёў у цэху, выпрабоўваючы магчымыя варыянты прымацавання дублерыну — спецыяльнага матэрыялу, які дапамагае «трымаць форму».

— Такому стаўленню да працы Віталь Васільевіч вучыць і нас. Гаворыць, што тыя, хто аднойчы купіў сарочку нашай вытворчасці, у наступны раз павінны шукаць менавіта прадукцыю «Аршына», — расказвае Тамара Караткевіч.

Ужо сёння попыт на прадукцыю прыватнага прадпрыемства перавышае яго магчымасці. Сарочкі пакуль што пастаўляюцца ў тры гандлёвыя пункты сталіцы — універмагі «На Нямізе», ЦУМ і «Кірмаш». Многія мінчане ўжо ацанілі іх якасць і знешні выгляд... З цягам часу, калі будзе завершана рэканструкцыя ўсяго будынка, тут пачнуць шыць жаночыя блузкі і мужчынскія касцюмы. Натуральна, павялічыцца і колькасць працоўных месцаў.

— Бачыце, мы тут у маечках сядзім, бо ў цэху вельмі цёпла, — гаворыць швачка Іна Мармыль, якая прыйшла працаваць у «Аршын» з КБА. — І абсталяванне выдатнае — я магу не хвалявацца, што машына раптам сапсуецца... Калі дырэктар паказаў нам пробную сарочку, ніхто не верыў, што мы зможам гэта паўтарыць. Цяпер кожная з нас шые па 6—7 такіх сарочак у дзень... Работа мне вельмі падабаецца. Я доўга шукала такое месца і вельмі рада, што знайшла.

Практычна ўсе новыя працоўныя месцы — а іх 434 — былі створаны ў Беразіно літаральна за два апошнія гады.

— Прычым рост гэтага паказчыка адбыўся за кошт пашырэння вытворчасці, а не толькі дзякуючы росту камерцыйных структур, — сцвярджае намеснік старшыні Бярэзінскага райвыканкама, загадчык аддзела эканомікі Аліна ЖДАНОВІЧ. — Сярод прыватнікаў, на вялікі жаль, не шмат ахвотнікаў займацца вытворчасцю — большасць па-ранейшаму аддае перавагу гандлю. На наш невялікі горад прыпадае 88 усемагчымых магазінаў, кіёскаў, павільёнаў. Але ж хачу нагадаць, што менавіта для вытворцаў той ці іншай прадукцыі сёння існуюць разнастайныя прэферэнцыі. Можна ўзяць ільготны крэдыт, атрымаць беспрацэнтную пазыку на стварэнне працоўных месцаў або субсідыю на арганізацыю ўласнай справы. У мінулым годзе толькі на стварэнне аднаго працоўнага месца прадпрыемству выдзялялася 10 млн рублёў. Сёлета гэта лічба павялічыцца. Калі ласка, працуйце! Акрамя таго, Беразіно ўключаны ў комплексную дзяржаўную праграму развіцця малых гарадоў — а значыць, на нашы прадпрыемствы распаўсюджваюцца льготы па падаткаабкладанні.

Паводле слоў Аліны Ждановіч, сёння раённыя ўлады без усялякіх затрымак і цяганіны рэгіструюць новыя прыватныя структуры. У горадзе адчуваецца востры недахоп медыкаў, будаўнікоў, бармэнаў, афіцыянтаў, а навастваныя прадпрыемствы могуць хоць бы часткова «закрыць» гэту брэш. Толькі за мінулы год на 14 працоўных месцаў павялічылася суменае прадпрыемства «Профітсістэм», якое займаецца апрацоўкай драўніны. 6 працоўных месцаў прадаставіла суменае прадпрыемства «Кавікс», адкрыўшы ў горадзе кафэ. 20 працоўных месцаў з'явілася на прадпрыемстве «Будпрасэрвіс» — і рамонтна-будаўнічая арганізацыя ўжо карыстаецца вялікім попытам у раёне, дзе, нагадаем, відавочны дэфіцыт будаўнікоў. А поўная рэканструкцыя ўніверсама Бярэзінскага райпа дазволіла ператварыць сціплы сярэднестатыстычны магазін у сучасны супермаркет. Месячны тавараабарот у ім павялічыўся ў разы, а наяўнасць 6000 (!) найменняў тавараў прымусіла работадаўцаў стварыць новыя працоўныя месцы.

Словам, станоўчыя зрухі адбываюцца. Аднак, пагаджаецца Аліна Ждановіч, «расці яшчэ ёсць куды». Галоўнае, на месцах ужо сёння ствараюцца рэальныя ўмовы для ініцыятыўных і прадпрымальных людзей.

Наталля КАРПЕНКА,
Бярэзінскі раён.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Прадавец універсама Бярэзінскага райпа Вераніка СІДАРОВІЧ.

МЯСЦОВЫ ЧАС

ДРОВЫ З ДУБРОЎНА ДЛЯ ФІНАЎ

...Ад Віцебска да райцэнтра Дуброўна меней за 100 кіламетраў, ад Мінска — пад 230. У Дуброўне жывуць меней за 9 тысяч чалавек, а ў раёне ў цэлым 19,1 тысячы. Пры гэтым працаздольных на вёсцы толькі 5,1 тысячы чалавек.

Па-першае, мяне зацікавіла, як працуюць мясцовыя прадпрыемствы і арганізацыі, ці мадэрнізуецца вытворчасць, ці ствараюцца новыя рабочыя месцы?

Высветлілася, што летась тут адкрылася новае прадпрыемства са стопрацэнтным іншаземным капіталам. Дзелавыя людзі з Латвіі арганізавалі выраб драўлянай тары. Пакуль тут працаўладкаваны каля 20 чалавек, а плануецца колькасць супрацоўнікаў павялічыць разы ў тры. На прадпрыемстве збіраюцца асвоіць выраб новай прадукцыі: будуць адпраўляць на экспарт дровы для камінаў. Фіны з нецярпеннем чакаюць беларускія дровы па прывабнай цане.

Мясцовы льнозавод дзякуючы новаму абсталяванню можа значна павысіць аб'ём вытворчасці. Паралельна плануецца набраць на працу не менш за 20 рабочых. Аналагічная мадэрнізацыя будзе праведзена на такім жа прадпрыемстве ў Гродзенскай вобласці. Можна нагадаць, што менавіта «Дубровенскі льнозавод» адным з першых у краіне пачаў займацца вырошчваннем лёну на ўмовах арэнды зямлі. Летась на базе прадпрыемства прайшоў выязны семінар па праблемах галіны з удзелам прэм'ер-міністра краіны.

На дубровенскім камбінаце прамысловых тавараў стаўку робяць на выраб новых відаў прадукцыі, у тым ліку і мяккіх цацак.

Краязнаўцы мараць аб тым, што набудуць другое жыццё мясцовыя будынкі мінулых стагоддзяў. На жаль, іх засталося няшмат. Кляштар бернардынцаў магчыма адрэстаўраваць толькі пры сур'ёзнай фінансавай дапамозе з рэспубліканскага бюджэту. Напэўна, у дасягненні гэтай мэты могуць дапамагчы тутэйшыя дэпутаты парламента краіны. Няўжо багатая гісторыя раёна так і застанецца таямніцай для патэнцыйных турыстаў? Найбольш старажытным гістарычным помнікам лічыцца стаянка чалавека эпохі мезаліту ля вёскі Чыжоўка. Археолагі выявілі і помнікі «жалезнага» стагоддзя (VII—V стст. да н.э.) на гарадзішчах ля вёсак Карабановічы і Вежкі. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе Дубровеншчына была ў складзе Расійскай дзяржавы. У Казіміра Сапегі графства купіў князь Пацёмкін. У 1780-х у Дуброўне адкрылася першая ў Расіі фабрыка па вырабе гадзіннікаў... Пра ўсё гэта энтузіясты мараць расказаць турыстам. Безумоўна, дзеля гэтага трэба пабудаваць новую гасцініцу, стварыць непаўторны турыстычны брэнд, каб прадставіць яго на міжнародным турыстычным рынку.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗА КОЖНЫМ ЗВАРОТАМ — ЧАЛАВЕК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Напрыклад, жанчына з Ваўкавыскага раёна просіць зарэгістраваць бацькоўскую зямлю. Бацька памёр шмат гадоў таму. Дачка спасылаецца на голас з неба, які пераканаў яе ў неабходнасці афарміць гэты кавалак зямлі на сваё імя. Ну і што рабіць? Цярпліва тлумачым, што прайшло шмат часу, а ў такім выпадку афармленне не абумоўлена заканадаўствам.

— Уступіў у сілу Указ Прэзідэнта № 498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў». Цяпер за сельскімі выканкамамі замацаваны пярвічны разгляд і прыняцце рашэнняў па зваротах.

— Так, дакумент уносіць пэўныя карэктывы ў работу сельскага выканкама, роля якога ўзрастае. І гэту работу мы ўжо распачалі: даносім інфармацыю да людзей, кожны сельскі Савет устанавіў адзіны дзень прыёму грамадзян.

Жыхары сельсаветаў ведаюць аб прынцыпе «аднаго акна», у адпаведнасці з якім збор дакументаў па шэрагу накірункаў ажыццяўляе той орган, у які чалавек звярнуўся. Па заяўным прынцыпе працуем больш за год. Выпісваем шмат даведак, якія пацвярджаюць, што прадукцыя вырашчана на прысядзібных участках. Людзі звяртаюцца па даведкі аб налічэнні жыллёвай квоты, аб пастаноўцы на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў.

За кожным зваротам стаіць чалавек. З мэтай змяншэння колькасці зваротаў у раённыя структуры праводзіцца інфармацыйна-тлумачальная работа. Напрыклад, перад правядзеннем рэарганізацыі медустаноў у вёсцы інфармацыйная група і медыцынскія работнікі арганізавалі сустрэчы з насельніцтвам па месцы жыхарства.

— Ці закранулі раён праблемы, звязаныя з недахопам кадраў?

— Мінулы год — другі год рэалізацыі праграмы адраджэння і развіцця вёскі. У новыя будынкі пераведзены ФАПы, якія размешчаны на тэрыторыі аграгарадкоў Чэрасы і Чапукі. ПрыФАПах адкрыты стаматалагічныя кабінеты. Але ў раёне маецца праблема з медыцынскімі кадрамі — не хапае яшчэ 11 спецыялістаў. Адчуваецца недахоп спецыялістаў і ў сельскай гаспадарцы. І гэта нягледзячы на тое, што ў вёсцы цяпер праблем з жыллём не ўзнікае.

Дарэчы, штогод арганізоўваем сустрэчы з маладымі спецыялістамі раёна.

Напярэдадні Новага года ўпершыню сабралі разам спецыялістаў сельскай гаспадаркі, якія прыехалі ў наш раён за апошнія пяць гадоў. Выслухалі іх праблемы, паказалі ім нашы перапрацоўчыя прадпрыемствы, адказалі на пытанні.

— І ў чым, на ваш погляд, прычыны кадравага голаду?

— Вялікае значэнне мае аддаленасць раёна ад абласнога цэнтра і сталіцы. Я сама, калі закончыла сельскагаспадарчую Акадэмію ў 1979 годзе, папрасіла, каб мяне размеркавалі ў Міёры, хоць мела права выбару. Нават выкладчыкі дзіву давaліся: «Куды ты паедзеш з такім дыпломам?» Але я настаяла на сваім: «Там мая радзіма».

Акрамя таго, у наш час шмат людзей, асабліва маладых, жывуць не працуючы. Яны перабіваюцца часовымі заробкамі: агарод акучыць, бульбу выкапаць, сена прывезці бабульцы.

Многія спасылаюцца на тое, што ў раёне няма дзе ўладкавацца... Але толькі ў будаўнічыя арганізацыі патрэбны работнікі не па адной спецыяльнасці. Ёсць магчымасць за кароткі тэрмін за кошт дзяржавы атрымаць спецыяльнасць пры пасрэдніцтве Цэнтра занятасці. З яго дапамогай за мінулы год пастаянную работу атрымалі 260 чалавек. Беспрацоўных райцэнтра і іншых населеных пунктаў прыцягваем да ўдзелу ў аплатнай грамадскай працы па дабраўпарадкаванні санаторыя «Расінка», аграгарадкоў, рабоце па нарыхтоўцы лёну. Хто імкнецца працаваць, той заўсёды знойдзе працу.

Нас вельмі непакоіць сітуацыя з ужываннем спіртных напояў у вёсцы. У выніку гэтага разбураюцца сем'і і лёсы маладых, да і не толькі, людзей. У 2007 годзе па падставах, якія прадугледжаны Дырэктывай № 1, скасаваны кантракты і працоўныя пагадненні з 21 работнікам за распіццё спіртных напояў у рабочы час ці па месцы працы. Думаю, неабходна сістэматызаваць работу саветаў і па профілактыцы пры сельвыканкамах.

На новы ўзровень пераходзіць праца саветаў па профілактыцы ў сувязі з выхадам Дэкрэта № 18, які павысіў адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей. За мінулы год зменшылася колькасць сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Заканадаўчая база, якая з кожным годам удасканальваецца, дапамагае Саветам больш дзейсна і грунтоўна вырашаць набалелыя пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва.

Гутарыла Надзея ДРЫЛА.
Міёрскі раён.
Фота аўтара.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

З ВЯСКОЎЦАЎ — У ГАРАДЖАНЕ

Галоўнае, каб са зменай статусу тэрыторый не засталіся пакрыўджанымі іх жыхары

У некаторых СМІ з'явілася інфармацыя, што рашэннем сесіі Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў у склад горада ўключаны 25 населеных пунктаў Гродзенскага раёна. Быццам бы сабраліся гарадскія дэпутаты і, нават не спытаўшы меркавання сваіх калег з раёна, прагаласавалі за пашырэнне тэрыторыі абласнога цэнтра...

Але звернемся да афіцыйных дакументаў. 28 снежня мінулага года адбылася сесія Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў. Было прынята рашэнне: «Унесці Гродзенскаму абласному Савету дэпутатаў прапанову аб змяненні межаў Гродзенскага раёна, Верцялішкаўскага, Капцёўскага, Падлабенскага, Путрышкаўскага сельсаветаў і ўключэнні ў межы горада Гродна зямельных участкаў агульнай плошчай 7913,1191 га, у тым ліку прадастаўленых фізічным і юрыдычным асобам...»

На наступны дзень, 29 снежня, прайшла сесія Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў. Рашэнне прынялі наступнае: «Узгадніць змяненні межаў горада Гродна і ўключэнне зямельных участкаў агульнай плошчай 7913,1191 га з зямель Гродзенскага раёна ў межы горада Гродна... Прасіць Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт унесці на разгляд Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў матэрыялы па змяненні межаў горада Гродна і Гродзенскага раёна і ўключэнні зямельных участкаў у гарадскія межы».

Пасля сесіі абласнога Савета дэпутатаў гэта пытанне будзе разгледжана ўрадам, а канчатковае рашэнне застанецца за Прэзідэнтам Беларусі. І калі ён дасць згоду на вышэйпамянёныя змяненні, то тэрыторыя абласнога цэнтра павялічыцца больш чым удвая —

Чым жа выклікана запланаванае пашырэнне гарадской тэрыторыі? І ці не застануцца пры гэтым пакрыўджанымі жыхары далучаных да горада населеных пунктаў?

Старшыня Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў Барыс КАЗЯЛКОЎ зазначае, што некаторыя прыгарадныя населеныя пункты па сутнасці ўжо сталі «астраўкамі» на гарадской тэрыторыі, можна сказаць, зрасліся з горадам. Скажам, Дзевятоўка — гэта вёска ўнутры гарадской забудовы, дзе практычна немагчыма знайсці межы Путрышкаўскага сельсавета і абласнога цэнтра. І лагічна, што яна павінна адысці ў межы горада. Гэтак жа, як і ўжо традыцыйныя месцы адпачынку гараджан — лясны масіў Пышкі, возера Юбілейнае ...

Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя змяненні самым непасрэдным чынам звязаны з рэалізацыяй Генеральнага плана развіцця горада Гродна да 2020 года. У абласнога цэнтра вялікія перспектывы будаўніцтва розных аб'ектаў і найперш — жылля. Але сёння пры выдзяленні новых участкаў пад праектаванне і будаўніцтва рашэнні гарадскога і раённага Саветаў дубліююцца, што ўскладняе працэс асваення перспектыўных зямель. З павелічэннем гарадской тэрыторыі, на думку Барыса Казялкова, гэтыя працэдуры будуць спрошчаны.

— Важна і тое, што прылягледжаюць, што прадукцыя вырашчана на прысядзібных участках. Людзі звяртаюцца па даведкі аб налічэнні жыллёвай квоты, аб пастаноўцы на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў.

За кожным зваротам стаіць чалавек. З мэтай змяншэння колькасці зваротаў у раённыя структуры праводзіцца інфармацыйна-тлумачальная работа. Напрыклад, перад правядзеннем рэарганізацыі медустаноў у вёсцы інфармацыйная група і медыцынскія работнікі арганізавалі сустрэчы з насельніцтвам па месцы жыхарства.

Увогуле, у апошні час прапаноў стала паступаць больш, чым заўваг і скаргаў. Акрамя гэтага, паменела ананімных зваротаў, што мы расцэньваем, як давер насельніцтва.

— Ці закранулі раён праблемы, звязаныя з недахопам кадраў?

— Мінулы год — другі год рэалізацыі праграмы адраджэння і развіцця вёскі. У новыя будынкі пераведзены ФАПы, якія размешчаны на тэрыторыі аграгарадкоў Чэрасы і Чапукі. ПрыФАПах адкрыты стаматалагічныя кабінеты. Але ў раёне маецца праблема з медыцынскімі кадрамі — не хапае яшчэ 11 спецыялістаў. Адчуваецца недахоп спецыялістаў і ў сельскай гаспадарцы. І гэта нягледзячы на тое, што ў вёсцы цяпер праблем з жыллём не ўзнікае.

Дарэчы, штогод арганізоўваем сустрэчы з маладымі спецыялістамі раёна.

Напярэдадні Новага года ўпершыню сабралі разам спецыялістаў сельскай гаспадаркі, якія прыехалі ў наш раён за апошнія пяць гадоў. Выслухалі іх праблемы, паказалі ім нашы перапрацоўчыя прадпрыемствы, адказалі на пытанні.

— І ў чым, на ваш погляд, прычыны кадравага голаду?

— Вялікае значэнне мае аддаленасць раёна ад абласнога цэнтра і сталіцы. Я сама, калі закончыла сельскагаспадарчую Акадэмію ў 1979 годзе, папрасіла, каб мяне размеркавалі ў Міёры, хоць мела права выбару. Нават выкладчыкі дзіву давaліся: «Куды ты паедзеш з такім дыпломам?» Але я настаяла на сваім: «Там мая радзіма».

Акрамя таго, у наш час шмат людзей, асабліва маладых, жывуць не працуючы. Яны перабіваюцца часовымі заробкамі: агарод акучыць, бульбу выкапаць, сена прывезці бабульцы.

Многія спасылаюцца на тое, што ў раёне няма дзе ўладкавацца... Але толькі ў будаўнічыя арганізацыі патрэбны работнікі не па адной спецыяльнасці. Ёсць магчымасць за кароткі тэрмін за кошт дзяржавы атрымаць спецыяльнасць пры пасрэдніцтве Цэнтра занятасці. З яго дапамогай за мінулы год пастаянную работу атрымалі 260 чалавек. Беспрацоўных райцэнтра і іншых населеных пунктаў прыцягваем да ўдзелу ў аплатнай грамадскай працы па дабраўпарадкаванні санаторыя «Расінка», аграгарадкоў, рабоце па нарыхтоўцы лёну. Хто імкнецца працаваць, той заўсёды знойдзе працу.

Нас вельмі непакоіць сітуацыя з ужываннем спіртных напояў у вёсцы. У выніку гэтага разбураюцца сем'і і лёсы маладых, да і не толькі, людзей. У 2007 годзе па падставах, якія прадугледжаны Дырэктывай № 1, скасаваны кантракты і працоўныя пагадненні з 21 работнікам за распіццё спіртных напояў у рабочы час ці па месцы працы. Думаю, неабходна сістэматызаваць работу саветаў і па профілактыцы пры сельвыканкамах.

На новы ўзровень пераходзіць праца саветаў па профілактыцы ў сувязі з выхадам Дэкрэта № 18, які павысіў адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей. За мінулы год зменшылася колькасць сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Заканадаўчая база, якая з кожным годам удасканальваецца, дапамагае Саветам больш дзейсна і грунтоўна вырашаць набалелыя пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва.

Гутарыла Надзея ДРЫЛА.
Міёрскі раён.
Фота аўтара.

РЫЖКАВІЧЫ ЗНІКНУЦЬ З КАРТЫ,

але Рыжкавіцкі сельсавет мяркуе захаваць гістарычную назву

Вядомая шклоўская вёска Рыжкавічы хутка знікне з карты Беларусі як асобнае пасяленне і стане мікрараёнам горада. Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў прыняў рашэнне аб пашырэнні межаў Шклова і далучэнні да яго вёскі Рыжкавічы, а таксама і пасёлка Маладзёжны, дзе цяпер месціцца новы завод газетнай паперы.

Да нядаўняга часу Рыжкавіцкі сельсавет быў самым вялікім на Шклоўшчыне: 29 вёсак, больш за 2800 жыхароў. Калі рашэнне аб пашырэнні горада ўступіць у сілу, то ў сельсавеце застанецца толькі 1600 чалавек. Бо ў склад райцэнтра ўвойдуць два самыя буйныя населеныя пункты.

— Ці шкада страціць тэрыторыю? — задумалася старшыня Рыжкавіцкага сельскага Савета Святлана ЯЎМЕНЕНКА. — Калі шчыра, я мяркую, што знаходзіцца ў межах горада — напрыклад, для Маладзёжнага — больш перспектыўна. У нашым сельсавеце няма сельгаспрадпрыемства, мы практычна не будуем новага жылля. А ў пасёлку — тры сотні сем'яў, ды з дзецьмі. Цяпер ім будзе прасцей стаць удзельнікам будаўнічага кааператыва. Але...

Перш чым было прынята рашэнне, у Маладзёжным і Рыжкавічах прайшлі сходы. Адны жыхары былі «за» скасаванне вёсак — у спадзяванні на больш якаснае абслугоўванне, іншыя ўвогуле паставіліся да навіны абыякава, а трэцім ідэя стаць шклоўцамі не спадабалася. У апошнюю катэгорыю пераважна трапілі бацькі школьнікаў. Яны якраз і ўзгадалі пра той самы мінус: пры паступленні ў навучальныя ўстановы дзеці страцяць прывілеі як жыхары сельскай мясцовасці.

Як гараджане...

У Рыжкавіцкім сельсавеце вестку пра змяненне межаў успрынялі як належнае. Так ці інакш, а тыя ж Рыжкавічы — гэта фактычна горад. Перайшоў мост у 700 метраў — і ты ў Шклове. Пасёлак Маладзёжны ўвогуле за апошнія два гады стаў цэнтрам шклоўскага жыцця — там адбывалася ледзь ці не галоўная будоўля краіны, а ў бліжэйшы час Маладзёжны стане прамысловым цэнтрам.

Пасля рэарганізацыі самай буйной у сельсавеце становіцца вёска Данькавічы, а самай малой — Ганцавічы, дзе засталося толькі 4 чалавекі. Будаўніцтва аграгарадкоў тут не плануецца, затое ёсць 13 дачных кааператываў.

— У нас вельмі мала безгаспадарных дамоў — на ўвесь сельсавет толькі 32, — гаворыць Святлана Яўмененка. — Несумненна, тут прыгарад, добры аўтобусны рух, ёсць чыгунка. Аднак хачу адзначыць, што яшчэ гадоў восем таму ў нас тут вольнага кавалка зямлі не мелася. Быў вялізны попыт на зямлю — людзі сварыліся з-за яе, мы вымушаны былі іх мірыць і даваць толькі па 5—10 сотак, каб нікога не пакрыўдзіць. А цяпер пайшоў зваротны працэс: народ адмаўляецца ад сваіх надзелаў. Летась каля 80 гектараў вызваліліся. Насельніцтва вёсак старэе і не мае сілаў трымаць гаспадарку.

Меней становіцца ў вяскоўцаў і жывёлы. Летась у сельсавеце было 119 кароў, сёлета — 86. У некаторых вёсках засталіся толькі адна-дзве каровы: іх гаспадары прадаюць малако ды тварог суседзям. У 2007 годзе працавалі чатыры зборшчыкі малака, а сёлета адна жанчына ад такой працы адмовілася: ёй даводзілася аб'язджаць 5 вёсак, а малака ледзь паўсотні літраў збірала — нявыгадна! Чым трымаць кароў, людзям прасцей набыць у аўталаўцы малочныя прадукты.

...Увогуле паступова знікае сам вясковы лад жыцця, асабліва ў прыгарадзе. Калісьці ў тых жа Рыжкавічах было 30 кароў, цяпер — толькі 5. І гэта на больш чым паўтысячы жыхароў! Свіней ды курэй таксама мала засталося.

Як вядома, Рыжкавічы — частка «агурочнай краіны». Аднак не ўсе маладыя людзі, якія атрымліваюць гэту справу ў спадчыну ад бацькоў-агуркаводаў, рашаюцца на такую грашовую, але вельмі нялёгкую працу.

— Што ж, горад нас пакрысе паглынае, — пагаджаецца старшыня Савета. — Наша насельніцтва старэе. Але, дарэчы, толькі не ў Рыжкавічах. Там, напрыклад, няма месца, каб пабудаваць дом — хоць тых, хто хоча гэта зрабіць, хапае. Усе разумеюць, што жыць у прыгарадзе добра.

Праблемы і паперы

Сам Рыжкавіцкі сельсавет сёння месціцца ў пасёлку Маладзёжны — цяпер фактычна на тэрыторыі горада. Добры цагляны будынак. Нядаўна атрымалі новыя «Жыгулі».

Святлана Яўмененка цяпер марыць пра дадатковага супрацоўніка, які працаваў бы хоць бы на паўстаўкі. Старшыня разам з сакратаром Наталляй Засулевіч ледзь спраўляюцца са шматлікімі паперамі.

— Вось ўсе змагаюцца з бюракратызмам, ды гавораць — эфектыўна, але маё такое ўражанне, што колькасць папер павялічваецца, — прызнаецца Яўмененка. — Вось прыклад — паліва. Раней нам чалавек проста тэлефанаваў, мы прымалі заяўку, запісвалі ў журнал, ставілі на чаргу, прывозілі брыкет. Сёлета ўсе льготнікі павінны самі пісаць заяву на імя дырэктара прадпрыемства, каб атрымаць паліва. І што ў выніку? Кожны інвалід павінен з дакументамі ехаць па паліва?..

У планах сельвыканкама на гэты год — дарога ў Данькавічах. Асфальтавае пакрыццё там паклалі 12 гадоў таму, калі быў яшчэ калгас. І з таго часу рамонт не рабілі. Падсыпка сваімі сіламі дае палёгку транспарту і вадзіцелям на непрацяглы час. Таму Святлана Яўмененка шукае магчымасці для таго, каб навесці на дарозе сапраўдны парадак.

Іншае пытанне — зразанне аварыйных дрэваў. Старыя дрэвы людзі просяць прыбраць, каб неўзабаве не павaліліся. Аднак у большасці выпадкаў патрэбна вышка, а гэта ўжо таксама праблема.

Вясной, якая ўжо не за гарамі, прыйдзе пара наводзіць парадак на могілках. Звычайна Святлана Сямёнаўна сама бярэ ўдзел у суботніках па добраўпарадкаванні — разам са старшынёй Савета і народ больш актыўна выходзіць папрацаваць.

— Я ўвогуле люблю працаваць з людзьмі. Іншым разам не магу дапамагчы чалавеку, але хачу, каб ён выйшаў ад мяне задаволеным. Здараецца, часам многае вырашае проста добрае слова: маўляў, не хвалюйцеся, будзьце аптымістам, не сёння вырашыцца — значыць, заўтра абавязкова, — гаворыць старшыня Савета.

Цяпер Рыжкавічы захаваюцца бадай што ў назвах шклоўскага мікрараёна, чыгуначнай станцыі і... сельсавета.

— Мы спадзяёмся, што сельсавету пакінуць гістарычную назву, якую ён атрымаў пасля вайны, — гаворыць Святлана Яўмененка. — Гэта не так проста змяніць, ды і навошта? Людзі ж прызвычаіліся...

Ілона ІВАНОВА.
Шклоўскі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;
САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;
СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;
СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;
ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГ ЦЭНЫ

Выпуск № 1 (35)

Ведай нашых!

БЕЛАРУСКІЯ ІНТАРЭСЫ НА РАСІЙСКІХ РЫНКАХ

Іх дастойна прадстаўляе ААТ «Гандлёвы дом «Ліда-рэгіён» у Маскве

Генеральны дырэктар ААТ «Гандлёвы дом «Ліда-рэгіён» у Маскве Вячаслаў Жылінскі ўдастоены прэстыжнага звання «Топ-менеджар Расійскай Федэрацыі 2007 года», а прадпрыемству прысвоены статус «Лідар расійскай эканомікі». Імя лідчаніна будзе занесена ў пятнаццаты выпуск выдання «Нацыянальная энцыклапедыя асобаў Расійскай Федэрацыі 2008 г.».

— Наша прадпрыемства было створана ў 2005 годзе па ініцыятыве Лідскага райвыканкама, — расказвае Вячаслаў Жылінскі. — Асноўная мэта — аптымізацыя паставак прадукцыі беларускіх вытворцаў у Расію. «Зроблена ў Беларусі» — гэта сёння сапраўды вельмі аўтарытэтны ў Расійскай Федэрацыі брэнд. І сваёй задачай мы бачым яго далейшую папулярызацыю, вывад на расійскія рынкі новых тавараў з нашай краіны.

Аб інтарэсе да беларускай прадукцыі сведчыць той факт, што на нядаўна створаным сайце кампаніі (www.lida-region.ru) зафіксаваны ўжо наведванні з 35 краін свету.

Пры гэтым кампанія — не проста гандлёвы пасрэднік, а зацікаўлены партнёр вытворцаў і спажыўцоў прадукцыі прадпрыемстваў не толькі Лідчыны («Лідагрампраммаш», «Лідсельмаш», «Агрампрамсельмаш», «Тэхмаш», Мінойтаўскі рамонтны завод, шклозавод «Нёман», «Бел-Пласт Інтэрнэшнл»…), але і іншых рэгіёнаў вобласці і рэспублікі.

— Мы ўдзельнічалі у тэсціраванні прадукцыі беларускіх вытворцаў перад пастаўкамі ў Расію, папулярызуем яе на выстаўках, у рэкламных акцыях, — зазначае Вячаслаў Жылінскі. — Працуючы ва ўзаемадзеянні з заводамі-вытворцамі, забяспечваем сваім заказчыкам пастаўкі беларускай прадукцыі па прымальных цэнах і ў найкарацейшыя тэрміны. Пры гэтым гарантуем беларускім прадпрыемствам вяртанне падатку на дабаўленую вартасць. Асвойваем ўсё новыя рэгіёны паставак. Адкрыта пастаянна дзейная выставачная пляцоўка сельгастэхнікі ў Растове-на-Доне, яе пастаўкі падмацоўваюцца поўным камплектам паслуг, у тым ліку па навучанню абслуговага персаналу. У найбліжэйшых планах — арганізацыя ў Маскве залы выставачных узораў беларускай прадукцыі, якая можа стаць своеасаблівым лагістычным цэнтрам. Запрашаем зацікаўленыя прадпрыемствы нашай краіны да супрацоўніцтва.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

АЧЫШЧАЛЬНЫЯ ПАРАШКІ ЦІ ГЕЛІ?

Сёння на нашых рынках прадстаўлена багата мыйных сродкаў: і ачышчальных пастаў, і крэмаў, і геляў, і розных вадкасцяў. Але ці існуе паміж імі прынцыповая розніца?

Э.М. СЕМІЖОН, *Уздзенскі раён.*

У аснове практычна ўсіх парашковых ачышчальных сродкаў ляжыць стандартны набор рэчываў. Іржавы налёт пераўтвараецца ў растваральную соль пры дапамозе кіслот. Наступны важны кампанент — хлоразмяшчальнае спалучэнне, якое сумесна з кіслатой завяршае выдаленне іржы і адначасова дэзінфіцыруе паверхню актыўным хлорам. Тлушчы і іншыя арганічныя забрудванні выдаляюцца з паверхні пры дапамозе паверхнева-актыўных рэчываў, добра вядомых нам па рэкламе пральных парашкоў. А для паскарэння працэсу ачышчэння ў парашковыя сродкі ўключаюцца яшчэ і абразіўныя рэчывы, якія, між іншым, «траўмуюць» паверхні рукавіў, пліт, мыек, кафельнай плітак, санфаянсу і г.д. І пры пастаянным ужыванні пашкоджваюць гэтыя выробы. Нават мяккая губка ці анучка з ачышчальным парашком абавязкова пакідае драпіны, у выніку чаго сантэхніка губляе свой бляск, а на пашкоджаных месцах адклады пачынаюць накопліваца з яшчэ большай хуткасцю. У адрозненне ад парашкоў, ачышчальныя пасты, крэмы і гелі — больш мяккія сродкі, бо ў іх складзе, як правіла, адсутнічаюць абразіўныя рэчывы.

Да таго ж пасты і гелі больш бяспечныя для скуры рук, а таксама для людзей, схільных да алергічных захворванняў. Справа ў тым, што пры выкарыстанні ачышчальных парашкоў мы непазбежна іх удыхаем, паколькі парашок з'яўляецца лятучым рэчывам, якое асядае ў насаглотцы, можа трапляць у трахею і бронхі і выклікаць раздражненне слізістай абалонкі. Прычым нават сучасная ўпакоўка парашкоў — скрынка з некалькімі адтулінкамі на верхняй частцы, заклеенымі толькі паперкай, — небяспечная для алергікаў і астматыкаў, бо парашок увесь час застаецца адкрытым. А ўсе пасты і гелі шчыльна закрываюцца.

А цяпер аб сродках для мыцця посуду. Іх эфектыўнасць напрамую залежыць ад канцэнтрацыі ў іх паверхнева-актыўных рэчываў, якія расшчапляюць на таляркох тлушчы. Самая высокая канцэнтрацыя паверхнева-актыўных рэчываў утрымліваецца ў сродках, якія выпускаюцца ў выглядзе густых геляў. Яны прадаюцца ў невялікай пластыкавай тары. У вадкіх сродках для мыцця посуду паверхнева-актыўных рэчываў утрымліваецца менш, затое яны лепш пеняцца, а чым болей будзе пены, тым большую колькасць посуду можна будзе памыць за адзін раз.

Выбіраючы вадкія сродкі для мыцця посуду, абавязкова паглядзіце на флакон. Адкрыйце крышачку і пераканайцеся, што ён утрымлівае дазатар. У процілеглым выпадку на губку будзе вылівацца значна больш сродку, чым гэта патрэбна, і ў хуткім часе зноў давядзецца бегчы ў магазін.

Пах сродку для посуду таксама мае не апошняе значэнне, бо некаторыя рэзкія пахі могуць у самым прамым сэнсе атруціць вам жыццё. Як ні дзіўна, але самым рэзкім насычаным пахам вылучаюцца тыя сродкі, на ўпакоўцы якіх можна знайсці слова «Свежасць». Спаборнічаць з імі па інтэнсіўнасці могуць толькі лімонныя ці іншыя цытрусавыя водары. А самыя нейтральныя — гэта аддушкі з алоэ.

Вельмі важныя для рук хатніх гаспадынь дабаўкі ў сродках для мыцця посуду — гэта гліцэрын, сілікон і раслінныя экстракты, якія змякчаюць агрэсіўнае ўздзеянне на скуру. Гліцэрын і сілікон ствараюць на скуры ахоўную плёнку, якая перашкаджае яе высыханню. Адначасова паверхневая плёнка, якую стварае сілікон, здольная абараніць і ад пранікнення шкодных для скуры рэчываў, што ўтрымліваюцца ў мыйным сродку.

Тэлегледачы ўдзячныя найперш за змяншэнне гуку рэкламы

А на мой погляд...

Вось ужо два месяцы, як мы жывём з новым законам аб тэлерэкламе. Літаральна адразу пасля ўступлення яго ў сілу рэдакцыя правяла невялікае апытанне, падчас якога папрасіла рэспандэнтаў выказацца на гэту тэму: ці аказвае тэлерэклама на іх уплыў, ці моцна (і ў чым канкрэтна) перашкаджае або не. Ужо тады нам падалася слушнай прапанова аднаго з суразмоўцаў: вярнуцца да тэмы праз нейкі час зноў, каб людзі, ацаніўшы новаўвядзенні, маглі зрабіць нейкую прамежкавую выснову — спраўдзіліся іх памкненні ці не, выказаць дадатковыя просьбы і пажаданні, калі яны ўзнікнуць.

Ці задаволены асабіста вы змяненнямі ў дачыненні да тэлерэкламы, што адбыліся? Што канкрэтна вы заўважылі? Магчыма, з'явіліся нейкія новыя прапановы?

Лілія МАЛЕВІЧ, галоўны спецыяліст аддзела эканомікі Карэліцкага райвыканкама:

— У прынцыпе, заўважыла змяненні. Меншымі па працягласці сталі рэкламныя блокі, сапраўды гук рэкламы стаў цішэйшым — тэлеперадачы стала глядзець лягчэй, камфортней. Так, тэлевізар, калі ёсць магчымасць, гляджу заўсёды. Увечары гэта яшчэ і варыянт адпачынку пасля працоўнага дня.

Эдуард ВАЛЦЭВІЧ, старшы інспектар групы па грамадзянстве і міграцыі Ганцавіцкага РАУС:

— Заўважыў. І задаволены тым, што рэклама зараз доўжыцца меней, чым было раней. Хоць тэлевізар у мяне выпадае глядзець, магчыма, і не так часта. Паменела рэкламы тытунёвых вырабаў, алкагольных напояў, гэта таксама добра. Бясспрэчна, няблага было б увогуле ўсю тэлерэкламу сабраць на нейкім асобным канале, толькі хто ж яго глядзець будзе? (*Смяецца.*)

Аляксей ЗАДЗІРАН, індывідуальны прадпрымальнік, г. Заслаўе:

— Ведаеце, сам не чакаў, што ў мяне будзе такая рэакцыя (*смяецца*). Так, раздражнялі працяглыя — па 10—15 хвілін — рэкламныя блокі. Цяпер жа не паспяваеш падчас рэкламы ні пакурыць, ні кавы выпіць (*смяецца*). Такія кароткія блокі таксама крыху раздражняюць, лепш бы іх аб'ядноўвалі ў нейкі адзіны на працягу адной перадачы і паказвалі, напрыклад, у сярэдзіне фільма. Са станоўчых момантаў адзначу гук — ён больш не «б'е» па вушах.

Наталля КАРПОВІЧ, галоўны спецыяліст па заработнай плаце ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Шчучынскага райвыканкама:

— Шчыра кажучы, я рэдка гляджу тэлевізар, прычым пераважна як фон. Хіба толькі раніцай, калі збіраюся на працу, цікаўлюся выпускамі навін. Да ўсяго ў нас кабельнае тэлебачанне, таму нейкіх змяненняў у плане тэлерэкламы я не адчула… Па праўдзе, толькі ад вас і даведалася, што два месяцы рэклама транслюецца па новых правілах. Трэба будзе спецыяльна звярнуць увагу на працягласць блокаў і сілу гуку (*смяецца*).

Вольга ЯКІМОВІЧ, хатняя гаспадыня, г. Нясвіж:

— Зараз я даглядаю дзіця, часу вольнага не так і шмат, як падаецца некаму, але ўсё ж болей, чым калі ходзіш на працу. Зразумела, «упаўвока» гляджу серыялы, задаволеная, што рэкламы паменела. Я ўвогуле нічога не маю супраць яе, вось толькі хацелася б, каб самі ролікі былі больш цікавымі, запамінальнымі. Скажам, мне вельмі падабаецца ўкраінская рэклама.

Міхаіл АЛЕЙНІКАЎ, пенсіянер, вёска Любонічы Кіраўскага раёна:

— (*Смяецца*) Не адчулі. Рэклама па-ранейшаму «забівае» ўсё. На экране — напружанае дзеянне, набліжаецца кульмінацыя, і тут «урываецца» рэклама. Усё, эмацыянальны фон разбураны! Ці ж нельга іншы момант выбраць? Адно добра — цяпер гук рэкламных блокаў не вылучаецца з агульнага фонавага гучання астатніх тэлепередач, не трэба бегчы, каб паменшыць яго.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Выпрабавана на сабе

КАБ БЫТАВАЯ ДРОБЯЗЬ НЕ ПЕРАЎТВАРЫЛАСЯ Ў ВЯЛІКУЮ ПРАБЛЕМУ

Сёння мы пагаворым не пра нейкія глабальныя пераўтварэнні ў жыллі падчас капітальнага ці касметычнага рамонту, не пра дызайнерскія захады ў вырашэнні тых ці іншых наспеўшых задач, не пра выбар складанай бытавой тэхнікі. Тэма гэтай размовы — дробязі быту. У параўнанні з вышэйагучанымі праблемамі і пытаннямі нейкія больш дробныя клопаты фармальна з'яўляюцца менавіта дрыбязоў. Але толькі на першы погляд. Пагадзіцеся, умоўна кажучы, кран, які працякае, здольны істотна сапсаваць наша жыццё (а часам і маёмасць). Ці, як варыянт, можна пыгаць уборку жылля пасля рамонту: тут трэба пырскі фарбы змыць, там рэшткі герметыку выдаліць. Бясспрэчна, наш чалавек, узброены звычайнай анучай і вядром, здольны на любыя подзвігі (маўляй, было б пра што гаварыць). Аднак сёння нароўні з дзедавымі спосабамі (многія з якіх сапраўды дзейныя) можна і трэба выкарыстоўваць, як кажуць, навінкі прагрэсу.

***

Калі ўжо загаварылі пра ўборку. Як ты часам ні старайся, але пасля заканчэння ўсіх неабходных работ, бывае, сапраўды даводзіцца папрацаваць, каб выдаліць са сцен, падлогі плямы шпатлёўкі, грунтоўкі, сілікону, фугі. Галоўнае пры гэтым — не пашкодзіць самі паверхні, таму пасля чарнавога выдалення шпатэлем плямаў лепш выкарыстоўваць спецыяльны сродак, які можна набыць на будаўнічых рынках. Ён цудоўна падыходзіць найперш для керамічнай плітки (наконт астатніх паверхняў трэба або пракансультавацца з прадаўцом, або ўважліва вывучаць інструкцыю па выкарыстанні).

У залежнасці ад шчыльнасці забруджвання, сродак разводзіцца вадой у пэўнай канцэнтрацыі. Плямы выдаляюць змочанай у растворы анучкай (на самыя трывалыя яе можна на нейкі час пакласці зверху). Галоўнае, трэба сачыць, каб сродак не трапіў на расфугаваныя швы, інакш потым давядзецца заціраць іх наноў. Потым плітка мыецца змочанай у вадзе анучай (зноў жа, калі выкарыстоўвалася моцная канцэнтрацыя, сачыце, каб вада не трапляла ў швы).

***

Часам можа здарыцца так, што асобная ці асобныя керамічныя пліткі пачынаюць «гуляць». Асабліва гэта раздражняе, калі гаворка ідзе пра падлогу і ты на такую плітку штодня наступаеш не аднойчы. Прычыны з'явы могуць быць розныя, але нас цікавіць іншае — як уласнымі сіламі хутка і якасна правесці рамонт гэтага месца.

Найперш трэба нейкім вострым прадметам асцярожна выдаліць фугу па перыметры плітак, пакрысе «заглыбляючыся» далей. Калі ў вас засталіся рэшткі абліцовачнага матэрыялу, «дэфектную» плітку можна проста разбіць і выдаліць часткамі (галоўнае, не пашкодзіць суседнія). Калі ж такога запасу няма, давядзецца вельмі асцярожна шкрэбаць далей (ціхенька час ад часу тупым прадметам пастукваючы зверху), пакуль плітка не адыдзе ад асновы. Пасля гэтага так жа асцярожна трэба выдаліць з яе «падэшвы» рэшткі цэментнага ці клеявога раствору і хоць бы на некалькі міліметраў паглыбіць ранейшае месца яе «залягання» (шырокай адвёрткай ці стамескай).

На будаўнічых рынках прадаецца спецыяльны клей у зручнай фасоўцы — тубусах кшталту зубной пасты. Замежны добрай якасці каштуе недзе 5—6 долараў, але можна пры жаданні абысціся (асабліва калі «лечым» плітку на сцяне) і ўдвая таннейшым. Наносім слой клею на плітку, укладваем яе на ранейшае месца (галоўнае, прасачыць, каб яе паверхня не тырчала ў параўнанні з суседнімі; можна выкарыстаць «крыжыкі», калі няма — запалкі) і прыціскаем. Калі клей схопіцца, зафугоўваем наноў перыметр пліткі.

***

У старых кватэрах у туалетах, ванных пакоях, на кухнях часта можна заўважыць, што паміж керамічнай пліткай швы з-за павялічанай вільгаці пакрытыя цвіллю. Зараз падобныя праблемы лёгка вырашаюцца яшчэ на стадыі рамонту з дапамогай спецыяльных сродкаў (кшталту «Дэльфіна», які фактычна выконвае ролю грунтоўкі). Ёсць два варыянты іх выкарыстання.

Па-першае, «Дэльфін» можна замест вады дадаць у фугу і ўжо такой сумессю заціраць швы. Калі ж яны ўжо расфугаваны, давядзецца наносіць сродак паверх швоў. Бераце набор звычайных школьных пэндзлікаў (аднаго можа быць недастаткова — выціраюцца) і — напарад. Праца простая, але нудотная, асабліва калі гаварыць пра плітку памерам 10х10 сантыметраў. Асабіста я такім чынам апрацаваў усе швы ў кухні, туалеце, ванным пакоі тройчы. Для надзейнасці, паколькі іх шырыня — некалькі міліметраў, нанесены сродак амаль незаўважны, таму можна лёгка прапусціць нейкую частку абліцоўкі.

***

Любая натуральная драўніна мае ўласцівасць рэагаваць на вільготнасць. Так, яна праходзіць папярэднюю сушку, апрацоўваецца спецыяльнымі саставамі, аднак у той жа гарадской кватэры зімой падчас ацяплянага сезона паветра можа быць вельмі сухім. З гэтым часам вельмі цяжка змагацца, хоць трэба выкарыстоўваць і звычайнае праветрыванне, і ўвільгатненне паветра (з дапамогай тых жа ўвільгатняльнікаў, хатніх кветак). Таму, не выключана, драўніна можа адрэагаваць на такія ўмовы высыханнем. Выправіць становішча можна з дапамогай герметыку «Саўдал», які падбіраецца па колеру пад патрэбную паверхню (на будаўнічых рынках каштуе каля 10 долараў). Паміж паверхнямі, якія парассыхаліся, наносіцца тонкі слой, рэшткі тут жа выдаляюцца мокрай анучкай. Шчыліны знікаюць, апрацаваная паверхня вонкава нічым не выдае наступстваў умяшання.

***

Рэшткі сілікону на ламінаваных паверхнях ДСП і ДВП, сляды маркера (калі нейкая мэбля рабілася пад заказ) лёгка выдаляюцца тэхнічным ацэтонам. Зразумела, потым памышканне трэба абавязкова праветрыць.

З'явіліся драпіны, фурнітура згубіла свой бляск? Змагацца з гэтым у хатніх умовах можна з дапамогай паліроляў (балончык каштуе ад 5—6 тысяч да 10 долараў). Яны падбіраюцца па колеры, аднак калі вы выкарыстоўваеце іх упершыню, пажадана перад «масавай атакай» выпрабаваць набытае на асобным кавалачку, напрыклад, рэштках матэрыялу. Сродак наносіцца тонкім струменем, потым расціраецца мяккай анучкай. Калі гаворка ідзе пра дарагую мэблю, пажадана ў вытворцаў даведацца, якія яны лакі выкарыстоўвалі, паліролі на якой аснове можна выкарыстоўваць.

***

Напэўна, многія з нас хоць бы аднойчы сутыкаліся з забіваннем каналізацыйных трубаў. Калі ўжо дайшло да гэтага, часам можа дапамагчы толькі іх механічная прачыстка. А пазбегнуць такой сітуацыі дапамогуць прафілактычныя (яны ж — хімічныя) метады. У магазінах выбар бытавой хіміі для гэтых мэтаў даволі вялікі. Не будзем рэкламаваць канкрэтныя сродкі, аднак па большасці яны каштуюць нядорага — ад 3,5 тыс. рублёў за літровую бутэльку. Прызначаны для выдалення рэшткаў валасоў, мыйных сродкаў, тлушчу. Канцэнтраваны раствор заліваецца ў пэўнай колькасці (200—250 грамаў) у зліўную адтуліну ў кухоннай мыйцы, ракавіне, ванне і пакідаецца на час, прызначаны ў інструкцыі. Потым змываецца вялікай колькасцю вады. Адзіная заўвага: сродкі могуць быць разлічаны на пэўны матэрыял каналізацыйных трубаў (што падыходзіць для пластыку, не заўсёды пойдзе на карысць пэўнаму металу).

***

Памятаеце рэкламу наконт загінулай пральнай машыны, гаспадыня якой не выкарыстоўвала спецыяльны сродак ад накіпу? Хто б спрачаўся, любы нармальны гаспадар, шкадуючы ўласную бытавую тэхніку, якая каштуе немалых грошай, не будзе эканоміць на такім сродку. На жаль, якасць вады часам бывае такая, што праз нейкі час агучаная ў рэкламе праблема можа ўсё роўна паўстаць і перад вамі. Каб гэтага не здарылася, раз-пораз (перыядычнасць «працэдуры» вызначаецца асабіста кожным у залежнасці ад канкрэтных умоў) для пазбаўлення пральнай машыны ад накіпу можна выкарыстоўваць такі спосаб. У яе замест пральнага парашку заліваецца 2 літры сталовага воцату або засыпаецца 200 грамаў лімоннай кіслаты. Устанаўліваецца рэжым мыцця без замочвання на максімальную тэмпературу і машына працуе да канца праграмы (натуральна, без бялізны — з пустым барабанам). Пра воцат не скажу — выкарыстоўваць пакуль не даводзілася, а што да лімоннай кіслаты, дык асабіста я абыходжуся адным пакецікам на 100 грамаў.

***

Яшчэ колькі слоў пра бытавую тэхніку. Рэгулярна заднюю сценку халадзільніка (ды і тэлевізара) трэба пыласосіць. У халадзільнага агрэгата таксама трэба выдаляць бруд у чашы для зліву, якая размешчана над кампрэсарам. Максімальна гарачай вадой, якую можаце вытрымаць, трэба праціраць і гумавыя ўшчыльняльнікі на дзвярцах. Няшчыльна прылеглыя дзверцы вядуць у выніку да павелічэння расходу электраэнергіі.

Калі гаварыць пра пыласос, не варта выкарыстоўваць яго для збірання вельмі дробнага пылу і смецця, найперш пасля рамонту (рэштак цэменту, сухіх клеявых сумесяў і г.д.). Або вазьміце жыгі стары апарат, або рыхтуйцеся, што потым яго давядзецца літаральна разбіраць для чысткі. Часам калі гэтага не зрабіць, магутнасць усмоктавання пыласоса можа істотна знізіцца, што ўвогуле не «надасць жыцця» пыласосу. Дарэчы, гэты апарат не любіць частых уключэнняў-выключэнняў: ужо калі пачалі прыбірацца ў жыллі, няхай ён лепш працуе да той пары, калі вы цалкам не наведзяце чысціню і парадак.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Інфармбюро

ШТО НЕЛЬГА БРАЦЬ У САМАЛЁТ?

Супрацоўнікі службы бяспекі беларускіх аэрапортаў знойдуць наркотыкі ці небяспечныя прадметы нават у страўніку пасажыра

Нягледзячы на тое, што ў выніку авіякатастроф гіне значна менш людзей, чым у аўтамабільных аваріях, бяспецы пасажыраў паветранага транспарту ва ўсім свеце надаецца павышаная ўвага. Наша краіна — не выключэнне. Хоць, як паведаміў начальнік управлення дзяржаўнай інспекцыі па бяспецы палётаў і авіяцыйнай бяспецы Дэпартамента па авіяцыі Валянцін Нагулевіч, за ўсю гісторыю суверэннай Беларусі не было ніводнага выпадку гібелі пасажыраў у выніку авіякатастрофы. Апошняе трагічнае здарэнне на беларускіх паветраных лініях адбылося ў 1988 годзе, калі разбіўся самалёт, які трымаў курс на Сургут. З таго часу ніводзін палёт лайнераў нашых авіякампаній (перавозкай пасажыраў у нашай краіне на сёння займаюцца два дзяржаўныя прадпрыемствы: «Белавія» і «Гомельавія») не быў азмрочаны катастрофамі са смяротным вынікам. Тым не менш, як падкрэсліў Уладзімір Нагулевіч, у Беларусі перавозка пасажыраў паветраным транспартам знаходзіцца пад строгім кантролем дзяржавы. Паводле яго слоў, планамерна абнаўляецца паветраны парк авіякампаній. Састарэлыя савецкія лайнеры замяняюцца сучаснымі замежнымі самалётамі. Напрыклад, на сёння «Белавія» эксплуатуе два паветраныя судны вытворчасці амерыканскага канцэрна «Boeing» і два канадскія рэгіянальныя самалёты «CRG-100LR». Сёлета плануецца набыць яшчэ 3 самалёты «Boeing».

Важную ролю ў забеспячэнні бяспекі на паветраных суднах адыгрывае і наземная служба, якая ажыццяўляе праверку ручнога багажу пасажыраў. Як паведаміў кансультант па авіяцыйнай бяспецы памянёнага Дэпартамента Валянцін Крылоў, у гэтым задзейнічаны і натрэніраваныя на пошук выбуховых рэчываў сабакі. Не так даўно былі закуплены 15 сучасных рэнтгенаскапічных прыладаў для агляду багажу. Ёсць на ўзбраенні супрацоўнікаў аэрапортаў і персанальны сканэр, з дапамогай якога можна знайсці прадметы нават у страўніку чалавека. Агульнавядома, што такі спосаб выкарыстоўваецца падчас транспарціроўкі наркотыкаў. Праўда, у аэрапортах Беларусі «наркакур'ераў-глытальнікаў» не выяўлена. Ды і супрацоўнікі службы бяспекі, найперш скіраваны на пошук выбухованебяспечных рэчываў і зброі. Найчасцей, службы бяспекі знаходзяць у кішэнях і багажы пасажыраў газавыя пісталеты і балончыкі са слезацечным газам, а таксама нажы. Звычайна такія пасажыры спасылаюцца на тое, што забыліся выняць памянёныя рэчы, або проста не ведалі аб забароне на іх знаходжанне ў салоне самалёта. Дарэчы, як падкрэсліў Валянцін Крылоў, канфіскаваныя прадметы, калі яны маюць «законнае паходжанне», гаспадары могуць забраць на зваротным шляху або перадаць іх праважаючым. Рэчы, якія не могуць быць вернуты ўладальнікам, нярэдка трапляюць у спецыяльныя празрыстыя пластыкавыя скрынкі і выстаўляюцца ў якасці негатыўных прыкладаў на ўсеагульны агляд наведвальнікаў аэрапортаў.

Прадстаўнікі Дэпартамента па авіяцыі таксама нагадалі, што на борт лайнера нельга браць адкаркаваныя ёмістасці з алкагольнымі вырабамі, і ўвогуле з ўсялякімі напоямі. Такія меры перасцярогі ўведзены дзеля таго, каб прадухіліць магчымасць пранесці ў самалёт выбуховыя рэчывы з вадкіх кампанентаў. А забарона на спіртныя напоі мае на мэце і прафілактыку хуліганстваў на борце самалётаў. Хоць на беларускіх авіялініях, у адрозненне ад расійскіх, такія інцыдэнты здараюцца вельмі рэдка.

Валянцін Крылоў паведаміў, што ў выключных выпадках, калі ёсць сігналы аб пагрозе бяспекі пасажыраў, авіярэйсы суправаджаюць прадстаўнікі праваахоўных органаў. Напрыклад, не так даўно супрацоўнікам транспартнай міліцыі давялося «прагуляцца» з Калінінграда ў Гомель, бо адзін з пасажыраў самалёта паведаміў, што чуў размову падазроных асобаў, з якой вынікала, што яны задумалі нешта нядобрае. Як высветлілася пазней, хвалявanні аказаліся беспадстаўнымі. Адмысловыя службы аэрапортаў заўсёды рэагуюць на такія сігналы і ў залежнасці ад ступені небяспекі прымаюць меры перасцярогі. Самі «сек'юрыці» паветранай прасторы вельмі пільна сочаць за падазронымі пасажырамі. У Нацыянальным аэрапорце, напрыклад, прымяняецца спецыяльная методыка выяўлення нядобранадзейных пасажыраў. Гэта своеасаблівае псіхалагічнае тэсціраванне, заснаванае на візуальным назіранні, размовах з такімі асобамі і вывучэнні іх дакументаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Простыя рэчы

Было гэта гадоў дваццаць таму. Сябар купіў у вёсцы Параскі хату і адпаведна да яе пляц. Хата яшчэ трывалая, жыць у ёй можна, а вось дах трэба перакрыць. Запрасіў Аляксандр нас, сяброў, каб зняць старую саламяную дахоўку і пакрыць будынак шыферам. І вось мы сталі здымаць са страхі саламяныя снапы, вывозіць іх у балаціну, каб там спаліць.

Сноп — простая рэч, якая паважалася нашымі далёкімі папярэднікамі, нашымі бацькамі, дзядулямі… А сённяшняму пакаленню практычна і невядомая.

Тыя снапы, якія здымалі мы са страхі вясковай хаты, былі зусім нядоўгія, а каласкі ў іх і абсалютна кароткія. Я распытаўся ў вясковых жыхароў: аказваецца, будоўля пасляваенная. Тады быў якраз неўраджайны год. (Некалькі неўраджайных гадоў выпала на пакаленне нашых бацькоў якраз пасля таго, як павярталіся яны з вайны.) Але ж будаваліся. Лес дзяржава на будоўлю давала, а вось крыць хаты — крылі чым прыйдзецца: караценькімі снапамі саломы. Кожны здатны мужчына ўмеў зрабіць гэту работу, але адзін не браўся, крылі хаты талакой. А калі не знаходзілася сваіх майстроў — наймаўся спецыяліст-страхар. Ён ведаў, як падняць снапы саломы, як іх распусціць і потым зноў звязаць, каб не прапускалі ў хату вільгаці.

Мы адвыклі ад снапа. Цяпер жыта не жнуць сярпамі, не вяжуць. Ды і лён таксама вельмі рэдка вяжацца ў снапы — працуюць рулонныя



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

падборшчыкі. А, дарэчы, менавіта з ільняными снапамі звязана ў мяне шмат успамінаў аб пачатку працоўнага, ужо сталага шляху. Пасля заканчэння школы нас пяцёра адначасніка пайшло працаваць на Пастаўскі льнозавод. Рабочымі сыравіннага цэха. Але паколькі ў той вераснёвы час сыравіна яшчэ не завозілася — паслалі нас на вельмі дзіўную справу. Мы разбіралі стары сцірт лёну, адвозілі яго на трактары ў далейшае і небяспечнае месца і... палілі. У той час — 1972 год — па ўсёй ільнозаводскай тэрыторыі стаялі плакаты аб беражлівым стаўленні да народнага дабра. Прычым кідка пісалася, што кожны сноп лёну каштуе дзяржаве адзін рубель. А мы прывязём тых снапоў поўны трактар, падкідваем віламі па снапу ў вогнішча, каб не шугала вельмі высока, не было бачна. Снапы гараць выдатна, хоць і падгнілыя крыху, а мы сядзім ля вогнішча і, пакурваючы, лічым, колькі ж спалім мы тых рублёў за дзень. Неблагая была супрацьлегласць афіцыйнаму выхаванню.

А потым шмат давялося папрацаваць з ільняными снапамі. Укладваць іх у торпы-сцірты восенню ў час уборкі, потым зімою з гэтых сціртаў завозіць у сыравінны цэх і там развязваць. Дарэчы, і вязаць снапы навучыўся. Недзе ў канцы сямідзесятых — пачатку васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя вельмі многія пастаўчане восенню выязджалі добраахвотна на зароблкі: уздым і вывазку льнотрасты. Ездзілі і мы, нашы сем'і. Навучыліся ўздымаць і ставіць лён у конусы, потым вязаць снапы, укладаць іх у трактары і аўтамашыны, на заводзе разгружаць. Справа цяжкаватая, як на сённяшні погляд, ад світанку і да позняга вечара, бо на льнозаводзе часам даводзілася выгружаць снапы ў поўнай цемры. Пыл, які ў лёне, мае шмат непрыемнасцяў. Але ж і заробкі былі вялікія. Калі трапляўся ўчастак выдатнага лёну, калі на льнозаводзе прыёмшчык, выцягнуўшы з машыны некалькі снапоў, даваў ім высокі нумар — у дзень магло атрымацца і 80, а то і больш рублёў. (Сяраднямесячная заработная плата тады ў райцэнтры была недзе 150 рублёў.)

Некалі, яшчэ ў мінулыя стагоддзі мае Паставы доўгі час знаходзіліся ў складзе Дзісненскага павета. Сёння старажытная Дзісна — невялікі гарадок у Міёрскім раёне. Толькі аднойчы давялося мне пабываць там. Прыгожыя мясціны, багатая гісторыя. Між іншым, мела Дзісна магдэбургскае права яшчэ з XVI стагоддзя. А дзе такое права — там і герб горада. Дык вось у Дзісны ён быў досыць простым у адрозненне ад іншых гербаў, іншых беларускіх гарадоў: на зялёным полі вялікі і тугі, перавязаны перавяслам, сноп збажыны.

Проста — ды сімвалічна, асабліва для нашых продкаў, для якіх сноп таго ж жыта быў ужо пэўнай надзеяй калі не на дабрабыт, дык на адсутнасць голаду.

А колькі абрадаў звязана са снапом! Асабліва прыгожыя — зажынкі і дажынкі. Першы сноп меў свой абрад — «гаспадара». Зажаць гэты сноп давяралася жанчыне, якая мела «лёгкую руку». Яна прамаўляла:

Стаўлю сноп
На сто коп,
На тысячу мерак.

Такімі ж былі і дажынкі. Апошні сноп упрыгожвалі кветкамі, стужкамі, ён называўся ў нас «барадой». Яго ўрачыста неслі талачаннікі ў двор гаспадару, які заканчваў уборку ўраджаю, абавязкова з песнямі.

Цяпер у нас дажыначкі,
Няма ў нас хлеба скарыначкі,
Гаспадар у нас беднаваты,
Няма чаго яму нам даці...

Але сталы і бяседы пасля талакі бывалі абавязковымі і багатымі.

Блізкі да народнага і Пятрусь Броўка ў сваім вершы:

Каласы адспявалі,
Іх пажалі, сабралі,
Бараду завязалі
Ды дажынкі згулялі.

Многія нашы паэты далучыліся да гэтай тэмы. Напрыклад, Аляксей Русецкі:

Вакол такі спакой,
нібы настаў вялікі адпачынак,
хоць недзе бліза час касьбы
і недалёка дзень зажынак.

Між іншым, выганяючы камбайны ў поле, і ў сённяшніх многіх гаспадарках першы сноп зажынаюць сярпом, уручаюць яго старшыні цяпер ужо не калгаса, а сельгаскааператыва. А якія снапы збожжа адбіралі, шчыльна, як на тым дзісненскім гербе, вязалі і вазілі на сельскагаспадарчыя выстаўкі!

Маці ўспамінае, што яшчэ ў пасляваенны, для нашых заходнебеларускіх вёсак некалгасны час, вялікай работай і ў той жа час вялікім святам быў абмалот снапоў на таку. Рабілася гэта позна восенню, калі палявыя работы завершаны. Калі сям'я была вялікай — малацілі сямейнікі, а так склікалі таксама талаку. На роўны, утрамбаваны ток выкладаліся два рады снапоў, калоссямі адзін да аднаго. І па іх ішлі з цапамі малатары. Перавяслы са снапоў не здымалі, каб потым іх цэлымі выкарыстаць у тым жа памяшканні. Цяпер у нас дажынкі, Няма ў нас хлеба скарынкі, Гаспадар у нас беднаваты, Няма чаго яму нам даці...

Але сталы і бяседы пасля талакі бывалі абавязковымі і багатымі.

Блізкі да народнага і Пятрусь Броўка ў сваім вершы:

Каласы адспявалі,
Іх пажалі, сабралі,
Бараду завязалі
Ды дажынкі згулялі.

Многія нашы паэты далучыліся да гэтай тэмы. Напрыклад, Аляксей Русецкі:

Вакол такі спакой,
нібы настаў вялікі адпачынак,
хоць недзе бліза час касьбы
і недалёка дзень зажынак.

Між іншым, выганяючы камбайны ў поле, і ў сённяшніх многіх гаспадарках першы сноп зажынаюць сярпом, уручаюць яго старшыні цяпер ужо не калгаса, а сельгаскааператыва. А якія снапы збожжа адбіралі, шчыльна, як на тым дзісненскім гербе, вязалі і вазілі на сельскагаспадарчыя выстаўкі!

Маці ўспамінае, што яшчэ ў пасляваенны, для нашых заходнебеларускіх вёсак некалгасны час, вялікай работай і ў той жа час вялікім святам быў абмалот снапоў на таку. Рабілася гэта позна восенню, калі палявыя работы завершаны. Калі сям'я была вялікай — малацілі сямейнікі, а так склікалі таксама талаку. На роўны, утрамбаваны ток выкладаліся два рады снапоў, калоссямі адзін да аднаго. І па іх ішлі з цапамі малатары. Перавяслы са снапоў не здымалі, каб пот

Краіна здароўя

Выпуск № 3 (59)

ШКОЛА здаровага ладу жыцця

У Круглянскай школе № 1 адкрылася новая трэнажорная зала. Вырашана, што гэта школа будзе працаваць па спецыяльнай праграме выхавання ў вучняў імкнення да здаровага ладу жыцця.

Дырэктар Аляксандр Бялянкін называе гэта здароўезберагальнымі тэхналогіямі, і пад гэтым шырокім паняццем разумее рацыянальнае харчаванне, фізічную актыўнасць, санітарыю і гігіену.

— Наша вялікае жаданне супала з наказам часу, — гаворыць Бялянкін. — У школе зрабілі прыгожы рамонт, і ў нашых вучняў ёсць магчымасць не толькі атрымаць добрыя веды, але і ўдасканальвацца духоўна і фізічна. Хочам, каб дзеці выраслі разумнымі, прыгожымі і здаровымі! Таму выступілі з ініцыятывай у Год здароўя, і ўлады яе падтрымалі.

У суботу, 19 студзеня ў школе ўрачыста адкрылі залу атлетычнай гімнастыкі. Сваімі сіламі адрамантавалі клас, павесілі вялікія люстэркі, выцягнулі са школьнага падвала і аднавілі старыя трэнажоры. Гэтым займаліся настаўнікі фізкультуры і старшакласнікі, якія ў якасці заахвочвання атрымалі магчымасць правесці першую трэніроўку ў новай зале.

На трэнажорах будуць займацца вучні, іх бацькі і настаўнікі. Жыхары Круглага таксама змогуць трэніравацца за сімвалічную плату. Бліжэйшым часам ў школьнай зале з'явяцца некалькі бегавых дарожак і велатрэнажоры. Праз два тыдні, па-абяцаў Аляксандр Бялянкін, у школе адкрыецца клас рытмікі і танца.

У дзень адкрыцця трэнажорнай залы перад круглянцамі з прапагандай здаровага ладу жыцця выступілі госці з Мінска — актывісты беларускага грамадскага аб'яднання «Цвярозасць-аптымаліст» імя Шычко.

Ілона ІВАНОВА.

ГОРНАЯ РАКА Ў ЖЛОБІНЕ

Менавіта такімі словамі можна апісаць настрой усіх, хто прысутнічаў на ўрачыстым адкрыцці аквазоны фізкультурна-аздараўленчага цэнтра, што ў Жлобіне. Аквазона — гэта аквапарк з воднымі атракцыёнамі, горная рака, плавальныя басейны для дарослых і дзятвы з бурлівымі вадаспадамі і шыпячымі гейзерамі, джакузі, тры віды папулярных у свеце лазняў (руская, турэцкая і фінская), масажы (спартыўны, лячэбна-аздараўленчы, класічны, гідрамасаж, масаж апорна-рухальнай сістэмы), салярый, трэнажорная і кардыятрэнажорная залы, рускі більярд, цырульная зала. Сапраўды, найбагацейшая разнастайнасць!

Адметны факт: адкрыццё аквазоны адбылося ў пачатку года, які аб'яўлены ў краіне Годам здароўя, і ў дзень 70-годдзя ўтварэння Гомельскай вобласці. Адзначаючы гэта, старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон і генеральны дырэктар Беларускага металургічнага завода Мікалай Андрыянаў падкрэслівалі, што першая ў нашай краіне аквазона такога маштабу будавалася як працяг узвядзення паводле даручэння Прэзідэнта рэспублікі Аляксандра Лукашэнкі ўнікальнага фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Жлобіне. Вядома, што год таму ў горадзе быў адкрыты Лядовы палац, ён запатрабаваны і прыцягнуў да сябе многія сотні, калі не тысячы, людзей. Тое ж самае будзе і з аквазонай. Тым больш што на ўказаным тут не маюць намеру спыняцца, бо яе сённяшнія паслугі, як і паслугі Лядовага палаца, разглядаюцца як першы этап вялікага шляху па развіцці фізкультуры і спорту ў Жлобінскім раёне. Другі этап — гэта будаўніцтва яшчэ аднаго трэніровачнага лядовага поля, Палаца гульнявых відаў спорту, вяслярнай базы і лыжароллернай трасы. Адкрыты яны будуць праз два гады.

Аквазона ў горадзе на Дняпры з'явіцца сапраўднай кузняй здароўя для многіх тысяч людзей. На яе ўзвядзенне затрачана каля 50 мільёнаў долараў. Праект запазычаны ў Магнітагорску, а ўзводзілі гэты выдатны аб'ект працаўнікі адкрытага акцыянернага таварыства «Будаўніча-мантажны трэст № 27», якія значна скарацілі тэрміны будаўніцтва пры добрай якасці работ. Генеральны дырэктар гэтага таварыства Аляксандр Рабкоў і ўручыў сімвалічны ключ ад аквазоны самым маленькім спартсменам горада са словамі «Сардэчна запрашаем у аквапарк!»

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Фота Алега БЕЛАВУСАВА.

Псіхічнае здароўе

Як прыстасавацца да стрэсаў?

аўральны стыль работы вядзе да «разбалансіроўкі» і знясілення ўсяго арганізма

Стрэс, сіндром эмацыянальнага выгарання, сіндром хранічнай стомленасці — усе мы вельмі часта аперыруем гэтымі паняццямі. Але што ж разумеюць пад стрэсам урачы? І як выявіць сіндром эмацыянальнага выгарання? Чым увогуле небяспечнае для арганізма пастаяннае нервовае напружанне?

— Стрэс — гэта фізіялагічная, псіхалагічная і эмацыянальная рэакцыя чалавека на знешнія фактары, — тлумачыць **загадчыца кафедры псіхатэрапіі і медыцынскай псіхалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі і галоўны пазаштатны псіхатэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Ірына БАЙКОВА**. — Прычым штуршком да яго могуць паслужыць не толькі негатыўныя, але і пазітыўныя фактары і падзеі. Для прыкладу, справакаваць стрэс можа нават шлюб, нараджэнне ў сям'і дзіцяці ці прасоўванне па службовай лесвіцы. Амерыканскімі навукоўцамі была складзена спецыяльная шкала, якая ўказвае на ступень нашай адаптацыі і рэакцыі на розныя жыццёвыя падзеі. Да наймагутнейшых стрэсараў былі аднесены смерць блізкага чалавека, скасаванне шлюбу, разбойны напад, знаходжанне ў заложніках, згвалтаванне, рабаванне жылля, паведамленне аб цяжкім захворванні, прыродныя і тэхнагенныя катастрофы. Абсалютна выбівае чалавека з каляіны пазбаўленне месца працы і выхад на пенсію. Магчыма, хтосьці здзівіцца, але і навагоднія святы, якія мы толькі што з цяжкасцю перажылі, і водпуск, і дзень нараджэння таксама адносяцца да стрэсавых фактараў, як і паступленне ў інстытут ці навасела.

Кожная падзея ацэньваецца ў адзінках па 100-бальнай шкале ў залежнасці ад яе ўздзеяння на чалавека. І калі чалавек, згодна з гэтай шкалой, набірае пэўную колькасць балаў, то рызыка атрымаць трывожна-дэпрэсіўныя ці псіхасаматычныя расстройствы павялічваецца ў яго шматразова. Гэта тлумачыцца тым, што стрэсары негатыўнага характару заўсёды сумяруюцца.

Запас антыстрэсавай трываласці ў кожнага асабісты. Дарэчы, схільнасць да стрэсаў залежыць і ад нашай з вамі прафесіі. Найбольш уразлівыя тыя, чыя прафесійная дзейнасць звязана са зносінамі з людзьмі: гэта медыкі, педагогі, журналісты, работнікі гандлю, ахоўнікі правапарадку, вадзіцелі грамадскага транспарту, палітычныя дзеячы. Для медыкаў галоўныя стрэсагенныя фактары — гэта вялікая колькасць пацыентаў, дэфіцыт часу, адведзенага на іх прыём, адказнасць за жыццё іншага чалавека і, зразумела, публічнасць іх прафесіі. Паводле даных замежных спецыялістаў, ва ўрачоў даволі часта адзначаецца нават больш высокі ўзровень трывожнасці, чым у іх пацыентаў.

Псіхаэмацыянальны стрэс уздзейнічае на ўсе без выключэння сістэмы арганізма. Вельмі балюча лішкі эмоцый б'юць па сэрцы і крыяносных сасудах. У многіх з'яўляюцца праблемы са сном: або немагчыма заснуць, або ніяк не можам выспацца. Не рэдкасць — страўнікавыя і кішэчныя спазмы, абвастрэнне гастрытаў і язвавай хваробы. Стрэсазалежныя расстройствы могуць праявіцца як адразу (на працягу двух дзён пасля ўздзеяння стрэсара, гэта так званая вострая рэакцыя на стрэс), так і праз пару месяцаў і нават праз паўгода (посттраўматычная рэакцыя). У апошнія гады даследыкамі з медыцынскай школы Х'юстана былі атрыманы пераканаўчыя доказы таго, што стрэс можа выклікаць парушэнні ў генетычным апараце, павышаючы верагоднасць анкалагічных захворванняў.

Апошнім часам на хвалі павышанай цікаўнасці грамадства аказаўся тэрмін «сіндром эмацыянальнага ці прафесійнага выгарання» (СЭВ). Асноўныя сімптомы гэтага стану — эмацыянальнае, псіхічнае і фізічнае знясіленне. Чалавек адчувае сябе як «выціснуты лімон», скардзіцца, што праца «высмоктвае» з яго ўсе сілы.

— Сіндром эмацыянальнага выгарання — гэта рэакцыя арганізма, якая ўзнікае ў выніку працягнутага ўздзеяння прафесійных стрэсараў, — тлумачыць Ірына Байкова. — Часцей за ўсё хранічны стрэс і сіндром эмацыянальнага выгарання — гэта эквіваленты расстройства адаптацыі з хранічнымі трывожна-дэпрэсіўнымі рэакцыямі.

Асноўную групу развіцця СЭВ складаюць маладыя людзі ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў, па тыпу асобы — халерыкі, з вышэйшай адукацыяй і высокім інтэлектуальным патэнцыялам. Развіццю сіндрому спрыяе некалькі прычын. Гэта і высокія рабочыя нагрузкі, і нездавальняючае планаванне працы, неадназначныя патрабаванні кіраўніцтва, недастатковае маральнае і матэрыяльнае стымуляванне працы, немагчымасць уплываць на прынятыя рашэнні, неабходнасць знешне праяўляць эмоцыі, не адпавядаючыя ўнутранаму стану, маскіраванне і добрае. Шпацыруйце ў лесе і па вуліцы, прымайце дома паветраныя ванны. Галоўнае, каб вы адчулі: мне добра, прыемна, здорава.

Што датычыцца зёлак, то раю не забывацца на такі выдатны лекавы і аздараўленчы сродак, як *чабор*. У даўніну гэтай зёлкай акурвалі храмы. Яе выкарыстоўваюць як абарону дома ад зла. Лічыцца, што *ў чаборы ёсць добрая сіла, якая чысціць прастору*. Чабор — гэта не дэфіцыт, яго можна набыць у аптэцы ці пазычыць у сяброў. Але самае лепшае, калі вы з добрымі думкамі збіралі яго самі. Заварыце і піце.

Будзе вельмі дарэчы і звычайны *лімон*. Толькі не трэба кідаць яго ў гарбату і кіпенем забіваць у ім усё жывое. Трэба нацерці лімон разам з цэдрай, заліць вадой, даць адстаяцца. Ужываць з *лыжачкай мёду*. Смачна, добра танізуе, насычае вітамінамі, а цэдра забівае мікробаў.

Штовосень кожны гаспадар, які мае свой дом і зямельны ўчастак, пачынае перасаджваць кусты *парэчак*. Я ўжо агітавала чытачоў «Звязды» ні ў якім разе не выкідаць на сметнік *галінкі парэчак*. Іх трэба ўзімку ламаць і кідаць у чай як дабаўку. Гэта шыкоўнае ўмацаванне арганізма. Тое ж самае — *маліна*. А *ліпа* яшчэ і супакойць. Тады змены надвор'я будуць вам не страшныя.

У любы сезон — хоць улетку, хоць узімку — трэба памятаць пра *сасну*. Лепей збіраць сыравіну, калі сасна цвіце — таму што яе маладыя пухнаткі вельмі танізуюць. Нават дзеці любяць іх жаваць, яны прыемнага кісленькага смаку. Трэба дыхаць пахам лесу — гэта ароматэрапія. Адвар можна дадаць у ванну — будзе як у сасновым бары.

Каб не было ў арганізме расхлябанасці, ёсць просты сродак — *соль*. Ёсць людзі ўзбуджальныя, а іншых трэба, наадварот, прыпадымаць уверх. З практыкі ведаю, што людзі павольныя, якіх і трэба падымаць, любяць цукар. А людзі актыўныя, з моцнай энергетыкай, любяць соль. З гэтых высноў і пойдзем. Бяром крыху солі, разводзім у вадзе, мочым вафельны рушнік і — абцірацца. Потым можна абдацца халаднаватай вадой — прыемныя «калючкі» па целе, бадзёрасць, выдатная падзарадка арганізма!

Разам з гэтым не трэба забывацца пра адпачынак і расслабленне. Паглядзіце, у мяне заўсёды ў пакоі стаіць *свечка*. Я запальваю яе, каб ачысціць прастору. Асабліва, калі захварэюсь. *Агонь свечкі супакойвае, настрой мяняецца, жыць становіцца лягчэй*.

Запісала Ілона ІВАНОВА.

СІМПТОМЫ СТРЭСУ

— раздражняльнасць, павышаная эмацыянальнасць
— унутраная трывога, прадчуванне непрыемных падзей, пачуццё страху;
— праблемы з канцэнтрацыяй увагі;
— пачашчанае сэрцабіццё;
— фізічнае і эмацыянальнае знясіленне;
— павышаная патлівасць;
— замаранне сэрца, непрыемныя адчуванні ў жываце;
— бяссонніца і кашмарныя сны;
— праблемы з апетытам (гэта можа быць павелічэнне, страта ці агіда да некаторых відаў ежы);
— беспрычынныя болі ў вобласці сэрца, пазваночніка, галаўныя болі;
— ломкасць пазногцяў і валасоў.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

Да канца гэтага тыдня дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

23 студзеня — намеснік дырэктара па клінічнай рабоце РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі Аксана Мікалаеўна РАМАНАВА.

24 студзеня — намеснік дырэктара РНПЦ «Маці і дзіця» Алена Альбертаўна УЛЕЗКА.

25 студзеня — намеснік дырэктара НДІ медыка-сацыяльнай экспертызы і рэабілітацыі Таццяна Міхайлаўна ЛЯШЧЫНСКАЯ.

У графіку магчымыя змяненні.

Пытальнік

Хто павінен аплачваць праходжанне медагляду вадзіцелем грузавіка: ён сам ці прадпрыемства?

Мой муж восем гадоў працуе ў адной з дзяржаўных арганізацый Мядзельскага раёна вадзіцелем грузавога аўтамабіля. Для праходжання тэхнічнага агляду аўтамабіля патрэбна медыцынская даведка, якая выдаецца раз у 3—5 гадоў. У медыцынскай установе яе выдаюць на платнай аснове, вадзіцель аплачвае яе з уласнай кішэні. Сёлета муж звярнуўся ў бухгалтэрыю арганізацыі з тым, каб яна аплаціла праходжанне медыцынскага агляду — 12 880 рублёў. У бухгалтэрыі напачатку паабяцалі выплаціць гэтыя грошы на падставе чэка, але потым адмовілі, спасылаючыся на тое, што ў мужа ёсць свой аўтамабіль і арганізацыя па гэтай прычыне не будзе аплачваць праходжанне медыцынскай камісіі. Маўляў, калі хоча працаваць, няхай плаціць свае грошы. У мяне пытанне: ці ёсць якое палажэнне, што рэгулюе такія адносіны, і дзе яго можна прачытаць. І што гаворыцца ў гэтым палажэнні, калі яно ёсць, аб наяўнасці асабістага аўтамабіля. Бо ён жа можа належаць і жонцы, і бацькам — незалежна ад таго, хто на ім ездзіць.

Людміла Яўгенаўна ХІЛО, *п/а Сваткі Мядзельскага раёна.*

На жаль, наша чытачка не напісала — у якой канкрэтна дзяржаўнай арганізацыі працуе вадзіцелем грузавога аўтамабіля яе муж. Адпаведна, у пошуках адказу на зададзеныя пытанні давялося звярнуцца ў шматлікія арганізацыі і ўстановы: пачынаючы ад бухгалтэрыі ўласнай рэдакцыі і далей — у Беларускі навукова-даследчы інстытут транспарту (БелНДІТ) «Транстэхніка», Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства транспарту і камунікацый. У выніку можам паведаміць наступную інфармацыю, што склалася пасля ўсіх гэтых нашых зваротаў.

Па-першае, ніякай сувязі паміж праходжаннем медыцынскага агляду і атрыманнем медаведкі вадзіцелем аўтамабіля па працы і наяўнасці ў апошняга асабістага аўтамабіля няма. Тут не патрэбны ніякія дакументы, абапірацца можна на звычайную логіку. Як піша сама ж жанчына, а калі гэты аўтамабіль зарэгістраваны ці ім карыстаюцца іншыя члены сям'і, а самому главе сям'і дастаткова і «казённай баранкі»? Але галоўнае — прафесія вадзіцела мае на ўвазе перыядычнае праходжанне медыцынскага агляду (яна разам з іншымі ўваходзіць у даволі вялікі пералік прафесій і спецыяльнасцяў, што звязаны з небяспечнымі ўмовамі працы — кшталту аператара аўтазаправачнай станцыі ці кацельні, газаэлектразваршчыка і інш.). Аплачваць праходжанне медыцынскага агляду такім работнікам павінна арганізацыя ці ўстанова, у якой ён працуе, шляхам пералічэння грошай медыцынскай установе. Выдаткі на гэта павінны праходзіць па графе «на ахову працы» і ўваходзіць у сабекошт прадукцыі. Але, як мы ўжо зазначалі вышэй, заяўніца не назвала прадпрыемства, на якім працуе муж: мы не ведаем яго профіль, ці стратнае, напрыклад, яно. Бо калі гэта сапраўды так, дык з аплатай праходжання медыцынскага агляду работнікамі будуць узнікаць цяжкасці фінансавага плана.

Што да канкрэтнага прадпрыемства, дык на ім пытанні, звязаныя з праходжаннем работнікамі медыцынскага агляду, уваходзяць у службовыя абавязкі інжынера па тэхніцы бяспекі. Разам з тым, калі зноў жа гаварыць пра аплату медыцынскай даведкі, як нам зазначылі ў некаторых установах, гэты пункт можа быць адлюстраваны або не ў калектыўным дагаворы.

ЭПІДЭМІЯ ГРЫПУ ЧАКАЕЦЦА Ў ЛЮТЫМ

Аб гэтым паведаміла галоўны эпідэміёлаг Міністэрства аховы здароўя Іна Карабан.

«Рост захваральнасці ўжо ёсць, але ў 16 з 18 кантрольных гарадоў яе ўзровень быў ніжэйшы за разліковы», — сказала субяседніца. Значнае трохдзённае перавышэнне эпідэмічнага парога захваральнасці з 14 па 20 студзеня адзначана толькі ў Лідзе і Гродне.

БЕЛТА.

Басейн адкрылі пасля рэканструкцыі

У Віцебску пасля рэканструкцыі адкрыўся басейн «Маладосць».

Ён быў пабудаваны 40 гадоў таму. Летась вырашылі даць басейну новае жыццё. На рэканструкцыю з мясцовага бюджэту патрацілі каля 4 мільярдаў рублёў. Басейн стаў сучасным водным комплексам, дзе ў ліку іншага запланавана праводзіць аздараўленчыя заняткі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

У цырымоніі адкрыцця збудавання ўзялі ўдзел віцебскія аквалангісты, якія тут пад вадой будуць шліфаваць сваё майстэрства. Самая вялікая глыбіня вады ў гіганцкай «ваннай» — 3,7 метра.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РАЁННАЯ ДЭМАГРАФІЯ

На ўрадлівых землях — і дзяцей багата

Столінскі раён Брэсцкай вобласці вылучаецца самай высокай нараджальнасцю не толькі ў рэгіоне, але нават і ў цэлым па рэспубліцы. Так, калі ў сярэднім па краіне паказчык нараджальнасці складае прыкладна 9 нованароджаных на 1000 насельніцтва, то ў вобласці — гэта ўжо 11,7, а на Століншчыне — 13,3. Праўда, і ўвогуле па Беларусі па-ранейшаму захоўваецца адмоўны прырост насельніцтва.

Паводле слоў галоўнага ўрача Столінскай цэнтральнай раённай бальніцы Паўла ПАШКЕВІЧА, актыўнае дзетанараджэнне захоўваецца, галоўным чынам, у трох сельскіх Саветах — Альшанскім, Вялікамалешаўскім і Манькавіцкім. Тэрыторыя Альшанскага сельсавета вылучаецца, напрыклад, вялікай колькасцю баптысцкіх, а значыць, пераважна шматдзетных — ад 5—7 да 10 і болей дзяцей — сем'яў. Вялікамалешаўскі сельсавет — гэта урадлівыя землі і буйное развіццё прыватнай цяплічнай гаспадаркі, дзе вырошчваюцца знакамітыя ва ўсёй краіне гуркі. Уладары гурковых цяпліц у сезон могуць забяспечыць сваім сем'ям дастатак на цэлы год. Нарэшце, Манькавічы — гэта тэрыторыя, якая амаль «зліваецца» са Столінам, горадам, дзе ўсё ж такі лягчэй знайсці добрую работу.

Столінская цэнтральная раённая бальніца пабудавана згодна з тыпавым праектам яшчэ ў 1964 годзе, і на той момант гэта была лепшая падобная ўстанова ў рэспубліцы. Сёння яна, безумоўна, не можа адпавядаць сучасным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да будынкаў такога ўзроўню. Па гэтай прычыне і былі распачаты рамонтна-рэканструкцыйныя работы, прычым не толькі ў бальніцы, але і ў шэрагу вясковых медыцынскіх устаноў. Дарэчы, зараз у Столінскім раёне функцыянуюць 3 участковыя бальніцы, 2 бальніцы сястрынскага догляду, 11 урачэбных амбулаторый, 39 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 7 брыгад хуткай медыцынскай дапамогі. Уласна Столінская цэнтральная бальніца мае інфекцыйнае, неўралагічнае, тэрапеўтычнае, радзільнае, гінекалагічнае, хірургічнае, траўматалагічнае і дзіцячае аддзяленні. У яе бліжэйшых лячэбных планах — укараненне лапараскапічнай хірургіі ў гінекалогіі. Што датычыцца прымянення новых дыягнастычных метадаў, то з нядаўняга часу ажыццяўляецца ўльтрагукавое даследаванне перыферычных сасудаў і сасудаў галаўнога мозга, а таксама імпедансная мамаграфія.

— У раёне пражывае звыш 500 адзінокіх і звыш 2 тысяч адзінока пражываючых грамадзян, — расказвае Павел Пашкевіч. — Практыка паказала, што «магутнасцяў» Беражноўскай бальніцы сястрынскага догляду, разлічанай на 40 ложкаў, недастаткова. Таму з 1 снежня была адкрыта яшчэ адна падобная ўстанова — у вёсцы Альгомель. Гэта бальніца разлічана на 15 ложкаў, і ўсе яны таксама занятыя. А Беражноўскую бальніцу чакае сур'ёзны рамонт і нават перапрацэтаванне, якое дазволіць шпіталізаваць пры неабходнасці большую колькасць людзей...

Святлана БАРЫСЕНКА,

Столінскі раён.

СТВАРАЙЦЕ ПАЗІТЫЎ!

Надвор'е і здароўе

Надвор'е, падаецца, проста звар'яцела. Новы год без снегу, Вадохрышча без марозу. А бывае — у адзін дзень то снег ідзе, то дождж — імкліва мяняюцца тэмпература паветра і атмасферны ціск.

Якім будзе люты: ці то затрашчаць моцныя маразы, ці то пралескі пачнуць прабівацца на лясных пагорках? Хоць, хутчэй за ўсё, будзе снежная жыжка пад нагамі і нізкае шэрае неба над галавой.

У такіх умовах невыпадкова, што ад метэазалежнасці сталі пакутаваць не толькі састарэлыя, але і зусім маладыя людзі. Галаўны боль, галавакружэнне, «гуляе» ціск, стомленасць з самай раніцы... Так-так, знаёмыя млявасць і абыякавасць да жыцця.

Між тым, працоўныя дні і хатнія клопаты ніхто не адмяняў з нагоды дрэннага надвор'я і зменаў атмасфернага ціску. Таму парады **мсціслаўскай лекаркі і траўніцы Ганны КУЛЯШОВАЙ** будуць дарэчы для метэазалежных людзей.

— Я мяркую, што ўсе мы ў пэўнай ступені залежам ад надвор'я. І раю вучыцца жыць, прабачце, у жывёлаў. Вы бачылі, як прачынаецца кот? Цягнецца, пацягваецца і ўзнімаецца — павольна. *Не трэба і нам падхоплівацца з ложка як на пажар. Пачынаем рухаць шыю, плечы, пацягнулі пазваночнік, павяркаталі. І стараем сабе добры настрой. Калі пачаў раніцу са змрочнымі думкамі — усё, дзень спаскуджаны.*

Далей пойдзем да люстэрка. Бачым наша рэальнае адлюстраванне і, што б там ні ўбачылі, *пачынаем сябе хваліць. Няхай і твар падобны на вялёнак, але я — разумніца, прыгажуня і ўсё ў мяне будзе добра.*

А потым падышлі да вады, пагаварылі з ёй, папрасілі ласкі для сябе — памыліся. Гэта моцная рэч. Так закладаецца *добры настрой* і праграма дзеяння.

Раней гаспадар дома за сталом бласлаўляў ежу. Наўрад ці сёння людзі масава вернуцца да гэтай добрай традыцыі, але *ніколі не трэба падыходзіць да халадзільніка з дрэннымі думкамі. Да ежы трэба ставіцца з павагай — гэта нам Бог паслаў. Калі добрае пажадаць сваёй ежы і з'есці яе, то гэта дабро да нас вернецца.*

Так ствараецца *пазітыў*, які не праб'еш. І хоць на працы ў чалавека, а таксама і дома, заўсёды знойдзецца нямала нагодаў для раздражнёнасці і незадаволенасці, *трэба імкнуцца не злавацца, а проста ўсміхнуцца*. Сама спрабавала, *усмешка* ў патрэбны момант вельмі дапамагае.

Вельмі карысны чалавеку, які пакутуе ад зменаў надвор'я, *прыток свежага паветра*. Яно нясе нам натонная і бесперспектыўная дзейнасць. Але асноўная прычына развіцця СЭВ — гэта неадпаведнасць паміж асобай і патрабаваннямі, якія да яе прад'яўляюцца.

Вылучаюць тры ключавыя прыкметы СЭВ. Развіццю сіндрому папярэднічае перыяд павышанай актыўнасці, калі чалавек з галавой знаходзіцца ў рабоце, забывае аб ўласных праблемах і інтарэсах. Напэўна, усім нашым чытачам вядомы анекдот пра мужа, які гаворыць жонцы, што ідзе да палюбоўніцы, палюбоўніцы — што ідзе жа жонкі, а сам запіраецца ў кабінеце, каб... працаваць, працаваць і працаваць! Услед за павышанай актыўнасцю наступае знясіленне, якое выяўляецца ў вычэрпванні эмацыянальных і фізічных рэсурсаў, пастаянней стомленасці, якая не праходзіць нават пасля начнога сну. Другая прымета СЭВ — асобасная адхіленасць работніка і нават прафесійны цынізм. Трэцяя — падзенне самаацэнкі. Чалавек не бачыць перспектыў у сваёй прафесійнай дзейнасці, у яго знікае пачуццё задаволенасці ад здзейсненай работы і губляецца вера ў свае прафесійныя магчымасці.

Варта заўважыць, што эмацыянальнае выгаранне — працэс даволі каварны, паколькі чалавек не бачыць сябе збоку і не разумее, што з ім адбываецца. Псіхолагі, якія займаюцца пытаннямі менеджменту ў арганізацыях, заўважылі, што калі ў калектыве з'яўляецца чалавек, які церпіць ад эмацыянальнага выгарання, то не выключана «ланцуговая» рэакцыя. Усяго адзін чалавек можа «заразіць» сваім цынізмам і песімізмам усіх. Увогуле мець зносіны з «трывожным» чалавекам патрабуе вялікіх душэўных сілаў.

Не менш хвалюе медыкаў і «сіндром хранічнай стомленасці», калі чалавек стамляецца так, што яму не хапае для адпачынку ні выхадных, ні водпуску. Свой стан ён характарызуе як «пастаяннае недамаганне быццам пасля цяжкай хваробы». Версій паходжання сіндрому хранічнай стомленасці існуе некалькі. Адны лічаць, што ён можа быць выкліканы хранічнай віруснай інфекцыяй, ад якой церпяць імунная, нервовая і мышачная сістэмы чалавека. Іншыя выказваюць меркаванні, што прычынай развіцця сіндрому хранічнай стомленасці можа з'яўляцца дэпрэсія. Трэція заўважаюць, што хвароба пачынаецца ў той перыяд, калі чалавек знаходзіцца ў стрэсавым стане ці аказваецца ў сітуацыі, якая вымагае ад яго вялікіх маральных сілаў.

— 29 студзеня ў Мінску адкрываецца спецыялізаваная выстава «Тыдзень моды на здароўе», дзе па традыцыі розным аспектам фізічнага здароўя будзе надавацца вельмі шмат увагі. Але мне вельмі хацелася б, каб беларусы не менш клапаціліся і пра сваё псіхічнае здароўе, бо сёння з пастаянных пацыентаў паліклінік псіхіятрычная дапамога патрабуецца прыкладна кожнаму чацвёртаму, — падкрэсліла Ірына Байкова. — Справа ў тым, што сучасны стыль жыцця вельмі спрыяе неўратызацыі. А на фоне пастаяннага нервовага і эмацыянальнага напружання ў многіх фарміруюцца псіхасаматычныя захворванні: неўрозы, парушэнні сардэчнай дзейнасці, артэрыяльная гіпертэнзія. Пацыенты скардзяцца на галаўныя болі, непрыемныя адчуванні ў жываце, гінекалагічны дыскамфорт, праблемы ў мочапалавой сферы і г.д. Адным словам, саматычны малюнак можа быць вельмі розным. Такія людзі лечацца ў тэрапеўтаў тэрапеўтычнымі сродкамі, якія аказваюцца абсалютна неэфектыўнымі. Стрэс, на жаль, стаў неад'емнай часткай нашага жыцця. А калі стрэсавых сітуацый пазбегнуць немагчыма, то трэба вучыцца ім процістаяць.

Выратавальнай саломінкай можа стаць наш жыццёвы вопыт. Чым больш чалавек пераадольвае складаных жыццёвых сітуацый з пазітыўным для сябе балансам, тым больш гнуткім механізмам процістаяння стрэсам ён будзе ў будучыні валодаць. Праўда, мы далёка не заўсёды робім правільныя высновы з сітуацыі. Менавіта таму псіхатэрапеўты гавораць, што не бывае негатыўнага вопыту, а ёсць вопыт, на які паглядзелі не з таго боку. Кожная сітуацыя павінна нас чамусьці вучыць.

Калі вы аказаліся ў стрэсавай сітуацыі, абавязкова гарманізуйце ўсе каналы ўспрымяцця (гэта значыць, што трэба глядзець на прыемнае, слухаць прыемнае, напрыклад, добрую музыку) і гарманізуйце свой густ. Не варта захапляцца толькі салодкім, усё павінна прысутнічаць у адпаведных прапорцыі: і салёнае, і кіслае, і горкае, і вяжучае. Не пашкодзіць распрацаваць свае ўласныя спосабы расслаблення і, пажадана, як можна больш: гэта могуць быць цёплая ванна, лазня, фізічныя практыкаванні, дыхальная гімнастыка, заняткі спортам, танцамі, вязанне, ароматэрапія, масаж, наведванне курсаў і нават проста прыемныя ўспаміны. Пры вострым стрэсе пераключыць свае думкі на іншыя эмоцыі дапамагае любая фізічная праца: мыццё бялізны ці посуду, хатняя ўборка ці работа на садовым участку. Можна, у рэшце рэшт, проста патэлефанаваць сваім сябрам — размова з імі дапаможа «заглушыць» у вашай свядомасці ўнутраны дыялог, насычаны негатыўнымі эмоцыямі. Але ні ў якім разе нельга спадзявацца на алкаголь, цыгарэты і снатворнае. Яны даюць толькі бачнасць расслаблення, а на самай справе наносяць арганізму дадатковы бяхімічны стрэс.

Не выйсце — проста адсунуць непрыемныя перажыванні ці сказаць, што трэба з лёсам змірыцца. Правільна будзе даць сабе ўстаноўку, што ў дадзены момант ёсць штосьці больш важнае, чым гэтыя цяжкасці. Актыўная пазіцыя заўсёды лепш за пасіўную. Нават расплакацца лепш, чым падаўляць свае эмоцыі.

І напрыканцы яшчэ адна парада — з усіх спраў трэба выбіраць толькі самыя важныя, часцей хваліць сябе і вучыцца сабой ганарыцца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дзіцячы прыём

ІНФЕКЦЫЯМ МЕЖЫ НЕ ПЕРАШКОДА

Нягледзячы на даволі спакойную эпідэміялагічную сітуацыю ў рэспубліцы па інфекцыйных хваробах сярод дзяцей, некаторыя захворванні ўсё ж нагадваюць аб сабе. Напрыклад, такая паветрана-кропельная інфекцыя, як коклюш. Зараз яго выпадкаў рэгіструецца крыху болей, адзначае загадчык кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Іна Германенка. Прычына вось у чым: у Расіі з'явілася новая разнавіднасць мікроба, які выклікае хваробу. І ён часта не ўключаецца ў вакцынныя штамы, а адпаведна насельніцтва не мае абароны ад гэтага ўзбуджальніка пры дапамозе прышчэпак. Вось і вандруе інфекцыя праз дзяржаўныя межы. Таму бацькам трэба насцярожыцца, калі ў дзіцяці з'явіцца адпаведныя сімптомы.

У першы тыдзень захворванне нічым не нагадвае коклюш. У дзіцяці проста прастуда з невялікім насмаркам. Толькі на працягу другога тыдня можа ўзнікнуць першае падазрэнне на коклюш. У дзіцяці з'яўляюцца доўгія прыступы кашлю па начах. Яно сутаргава кашляе 8—10 разоў на адным дыханні. Пасля некалькіх працяглых прыступаў кашлю малы душыцца і ў яго ўзнікае рвота. Калі ён імкнецца ўдыхнуць паветра пасля прыступаў кашлю, з горла можа вырвацца завыванне. Выгляд хворага пры гэтым характэрны: твар чырванее ці нават становіцца сінюшным, на вачах выступаюць слёзы, могуць утварацца кроваліцці ў бялочную абалонку вачэй, язык высоўваецца з рота. Прыступ заканчваецца адхаджэннем вязкай макроты.

Коклюш цягнецца ў сярэднім чатыры тыдні, у цяжкіх выпадках 2—3 месяцы. Захворванне можа быць вельмі сур'ёзным, асабліва ў дзяцей да двух гадоў. Галоўная небяспека ў гэтым узросце — агульнае знясіленне і запаленне лёгкіх, часам паражэнне нервовай сістэмы. Большасць дзяцей, хворых на коклюш, адчуваюць сябе лепей, калі на вуліцы і ў памяшканні халаднавата і днём, і ноччу. Але дзіця трэба, безумоўна, засцерагаць ад халаднавання.

Важную ролю ў лячэнні коклюшу адыгрываюць рэжым і харчаванне. Пасцельны рэжым карысны толькі пры наяўнасці ліхаманкі і ўскладненняў. У летні час дзіця павінна праводзіць на вуліцы большую частку дня, зімой 4—5 гадзін. Улічваючы магчымыя рвоты, якія прыводзяць да знясілення, карміць хворага трэба больш каларыйнай ежай.

З лячэбных прэпаратаў па прызначэнні ўрача даюць антыбіётыкі і сульфаніламіды.

Прафілактыка коклюшу ажыццяўляецца ў двух напрамках: ізаляцыя хворага на ўвесь час, пакуль ён заразны (на 40 дзён) і каранцін для дзяцей, якія не хварэлі на коклюш і былі ў кантакце з хворым, на 21 дзень. Трэба мець на ўвазе, што коклюш не перастае быць заразным раптам, на працягу пэўнага часу. Яго заразнасць змяншаецца паступова і тым хутчэй, чым лягчэй працякае хвароба. Вы можаце лічыць дзіця бяспечным для навакольных, калі на працягу двух тыдняў яно кашляе прыкметна менш.

Народныя сродкі пры моцным кашлі

- Збор: кветкі алтэі, кветкі мальвы лясной, кветкі каравяку па 10 г кожных. Змяшаць, узяць сталовую лыжку сумесі і заварыць 2 шклянкамі кіпеню, настояць 20 хвілін, піць па паўшклянкі праз кожныя тры гадзіны.
- Кветачны мёд. Аэразольныя інгаляцыі. Унутр 100—120

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў і дапаўнення у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях узмацнення адказнасці за парушэнне правілаў рыбалоўства і палявання

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 кастрычніка 2007 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 16 лістапада 2007 года

Артыкул 1. Унесці ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 76, 2/50; 2002 г., № 75, 2/861; 2003 г., № 8, 2/922) наступныя змяненні і дапаўненне:

1. У абзацы першым часткі 2 артыкула 280 слова «занесеных» замяніць словам «укюченых».

2. Артыкулы 281 і 282 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 281. Незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл

1. Здабыча рыбы ці іншых водных жывёл без належнага на тое дазволу, або ў забароненых час, або забароненымі прыладамі і спосабамі (акрамя прадугледжаных часткай 2 гэтага артыкула), або ў забароненых месцах (незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл), здзейсненая на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, —

караецца штрафам, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў.

2. Незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл, якая пацягнула нанесенне ўрону ў буйным памеры, або здабыча рыбы ці іншых водных жывёл з выкарыстаннем прылад лоўлі, прынцыпы работы якіх заснаваны на выкарыстанні электрамагнітнага поля, ультрагуку, ці шляхам узрыву, або здабыча рыбы ці іншых водных жывёл, заведама для вінаватага ўключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, —

караецца штрафам, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

3. Незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл, у тым ліку з выкарыстаннем прылад лоўлі, прынцыпы работы якіх заснаваны на выкарыстанні электрамагнітнага поля, ультрагуку, або шляхам узрыву, учыненая службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, —

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю.

4. Незаконная здабыча рыбы або іншых водных жывёл, у тым ліку з выкарыстаннем прылад лоўлі, прынцыпы работы якіх заснаваны на выкарыстанні электрамагнітнага поля, ультрагуку, або шляхам узрыву, якая пацягнула нанясенне ўрону ў асабліва буйным памеры, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў.

Заўвага. Буйным памерам урону ў артыкулах 281 і 282 гэтага Кодэкса прызнаецца памер урону на суму, якая ў сорак і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным — які ў сто і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні.

Артыкул 282. Незаконнае паляванне

1. Паляванне без належнага на тое дазволу, або ў забароненых месцах, або ў забароненыя час, або забароненымі прыладамі і спосабамі, або незаконнае паляванне, якое пацягнула нанясенне ўрону ў буйным памеры, —

караецца штрафам, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў.

2. Незаконнае паляванне на тэрыторыі запаведніка, нацыянальнага парку, заказніка, у зоне экалагічнага бедства або ў зоне надзвычайнай экалагічнай сітуацыі, або здабыча звяроў ці птушак, заведама для вінаватага ўключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, або незаконнае паляванне, якое пацягнула нанясенне ўрону ў буйным памеры, —

караюцца штрафам, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

3. Незаконнае паляванне, здзейсненае службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, —

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, або выключэннем учынення парушэнняў, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, —

цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да дваццаці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад дзесяці да ста базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад ста да пяцісот базавых велічынь.».

3. Артыкул 15.37 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 15.37. Парушэнне правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання

1. Паляванне без належнага на тое дазволу, або ў забароненых месцах, або ў забароненыя час, або забароненымі прыладамі і спосабамі — цягне накладанне штрафу ў памеры ад дзесяці да пяцідзесяці базавых велічынь з канфіскацыяй ружжаў, іншых прылад паляванння і іншых прадметаў, якія з'явіліся прыладай або сродкам учынення ўказанага парушэння, або без канфіскацыі з канфіскацыяй прылад або без іх.

2. Парушэнне правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, за выключэннем учынення парушэнняў, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, —

цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры ад пяцідзесяці да дваццаці базавых велічынь з канфіскацыяй ружжаў, іншых прылад паляванння і іншых прадметаў, якія з'явіліся прыладай або сродкам учынення ўказанага парушэння, або без канфіскацыі, а на юрыдычную асобу — ад пяцісот да тысячы базавых велічынь з канфіскацыяй ружжаў, іншых прылад паляванння і іншых прадметаў, якія з'явіліся прыладай або сродкам учынення ўказанага парушэння, або без канфіскацыі.

3. Парушэнне правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, за выключэннем учынення парушэнняў, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, —

цягне накладанне штрафу ў памеры ад трыццаці базавых велічынь або пазбаўленне спецыяльнага права, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад дваццаці да дваццаці пяці базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад ста да тысячы базавых велічынь.».

Артыкул 4. Гэты Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА.

3 снежня 2007 года, г. Мінск.
№ 288–З

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...НАВЕДАЦЬ ПАДАТКОВУЮ ІНСПЕКЦЫЮ

Калі ўвечары ў мінулую пятніцу ледзь, як кажуць, паспеў пераступіць парог падатковай інспекцыі па месцы жыхарства, дык напачатку літаральна здрыгануўся: да акенца за набыццём падатковых дэкларацый стаяла даволі вялікая чарга, якая да ўсяго чамусьці напачатку марудна рухалася. У мінулыя гады даводзілася назіраць у нечым падобныя чэргі да саміх падатковых інспектараў, але каб сюды... Нішто сабе, падумалася, а што ж тады чакае далей? Калі я адсюль выйду і ці ўвогуле паспею сёння падаць дэкларацыю? Я ж разлічваў як мінімум паўтарыць свой мінулагодні «рэкорд», калі ў цэлым на наведванне падатковай інспекцыі пайшло менш за паўтары гадзіны, з якіх уласна 10 хвілін я запаўняў бланк, столькі ж стаяў у чарзе, каля 15–20 хвілін занялі зносіны з падатковым інспектарам, а астатні час я чакаў жонку, паколькі — у сувязі з пагашэннем крэдыту, узятага на будаўніцтва жылля — папер у яе было значна болей... І ўсё ж мінулы «рэкорд» быў пабіты: я «адстраляўся» за 45 хвілін, яшчэ 15 зноў чакаў сваю другую палавіну. У чарзе, наколькі я зразумеў, стаялі пераважна прадстаўнікі бізнэсу, якія абслугоўваліся ў іншых кабінетах і не мелі дачынення да такіх як мы фізічных асобаў (у ёй я адстаяў 10 хвілін).

Нагадаю, што летась, у сувязі з пэўнымі зменамі ў падатковым заканадаўстве (напрыклад, па прадстаўленні падаткоай ільготы ў сувязі з будаўніцтвам ці пагашэннем банкаўскага крэдыту, узятага пад гэтыя мэты), падатковыя інспекцыі наведала нашмат болей грамадзян, чым звычайна (памянёную вышэй ільготу ў папярэднія гады можна было атрымліваць як па месцы асноўнай працы, так і, па выніках года, праз падатковую інспекцыю, але за 2006 год зрабіць гэта можна было выключна праз падатковую інспекцыю; неўзабаве пасля гэтага ўсё вярнулі да ранейшага парадку, зноў прадаставіўшы грамадзянам права выбару). Нягледзячы на гэта, як я ўжо казаў, летась упершыню за апошнія гады паход да падаткавікоў заняў меней за паўтары гадзіны, хоць у папярэднія гады выходзіла ўсе тры. Паспрыяла гэтаму з'яўленяны рабілі фактычна тое ж, толькі потым дыктавалі грамадзянам: куды і што пісаць).

Зноў жа заўважу, што, як і ў папярэднія гады, асабіста я запаўняў дакументы толькі па вяртанні падаткаў у сувязі з прафесійнымі выдаткамі, звязанымі з атрыманнем аўтарскага ўзнагароджання (ганарару). Даходаў з-за межаў краіны не атрымліваў, кватэры і аўтамабілі за апошні час не прадаваў, не плацію за адукацыю, меў уласны нумар падаткаплацельшчыка.

Што да жонкі, дык летась нас непрыемна здзівіў той факт (і адняў тры гадзіны часу, праведзеных у славутых чэргах), што ў падатковую інспекцыю патрэбна даведка з жыллёвага аддзела адміністрацыі раёна, дзе мы некалі стаялі ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Неабходнасць яе прадастаўлення была выклікана памянёнымі вышэй тагаданымі змяненнямі, хоць, атрымліваючы падатковую льготу дагэтуль па месцы асноўнай працы ў сувязі з пагашэннем крэдыту, узятага на будаўніцтва жылля, мы такую даведку ў родную бухгалтэрыю ўжо прадстаўлялі. Але летась давялося зноў браць паперу, што мы некалі (ужо жывучы ва ўласнай кватэры!) мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Адзінае, заспакоілі нас падатковыя інспектары, у далейшым, калі мы плануем атрымліваць падатковую льготу праз інспекцыю па выніках года, такая даведка больш не спатрэбіцца, бо будзе заведзена асабістая справа. Тое ж дачыцілася, дарэчы, і копій дагавораў з самім банкам і ўпраўленнем капітальнага будаўніцтва. Так яно сёлета і атрымалася: жыллёвы аддзел адміністрацыі раёна, на шчасце, наведваць не давялося.

Была зноў адчынена актавая зала для кансультацый, але ахвотнікаў не было. Не было, бо чарга фактычна адсутнічала, — пакуль мы запаўнялі дэкларацыі, усе тры чалавекі, што былі перад намі, зайшлі ў кабінет да інспектараў. Нам давялося чакаць не больш за 5 хвілін.

На зносіны са спецыялістам пайшло 15–20 хвілін (у другой палавіны — удвая больш). Было бачна, ды і самі інспектары гэта радасна пацвярджалі, што сёлета працуецца значна лягчэй, людзей нашмат менш. Усё зноў жа было вельмі карэктна, ну, ці амаль усё... Справа ў тым, што інспектар, якая прымала дэкларацыю ў жонкі і дапамагала ёй, раптам схамянулася: сёння ж пятніца, у мяне ўжо працоўны дзень скончаны, што ж я тут раблю!? Словам жонцы самой, каб зэканоміць час інспектара, давялося дапамагаць запаўняць ёй штампы на зваротным баку даведак — прыходных ордэраў — аб аплаце банкаўскага крэдыту і працэнтаў па ім, — што падатковая льгота прадастаўлена (хоць у прынцыпе гэта праца спецыяліста). Не паспела мая другая палавіна сабраць паперы са стала, як памянёны інспектар апранулася, падхапіла сумачку і літаральна «вынесла» дзверы перад носам жонкі...

Як і летась, захаваўся выбар: як вяртаць залішне заплачаныя падаткі. Гэта можна па жаданні зрабіць як праз касава-разліковы цэнтр (праз папярэдняе наведванне фінаддзела адміністрацыі раёна), так і праз банк ці бухгалтэрыю роднай установы, арганізацыі, прадпрыемства. Тэрмін вяртання грашовых сродкаў — да месяца. Калі мне не змяняе памяць, летась ён складаў два тыдні, а мая калега ўвогуле атрымала адпаведнае паведамленне з падатковай інспекцыі праз пяць дзён пасля наведвання апошняй (у папярэднія гады, не беручы пад увагу вяртанне падаткаў за 2006 год, чакаць сродкаў даводзілася ад месяца да месяца з паловай).

З карыснай інфармацыі чытачам можна нагадаць яшчэ раз, што скарыстацца падатковай ільготай (вярнуць залішне заплачаныя падаткі) у сувязі з набыццём, будаўніцтвам кватэры можна на працягу трох гадоў. Дэкларацыю такому грамадзяніну не абавязкова падаваць менавіта да 1 сакавіка, праўда, пры ўмове, што ў яго была адна крыніца даходаў і не было іншых прычын падаваць дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе.

Заўважу між іншым, што на гэты раз наведваў падатковую інспекцыю фактычна ў сярэдзіне студзеня, хоць у папярэднія гады гэты тэрмін звычайна перасоўваўся мінімум на два тыдні далей — на канец студзеня — пачатак лютага. Дзеля чаго згадваю пра гэта? З пачатку года і па 9 лютага ўключна падатковыя інспектары (прынамсі, па маім месцы жыхарства дакладна) будуць працаваць па панядзелках, аўторках, чацвяргах і пятніцах — з 8 да 20 гадзін, а па суботах і нядзелях — з 9 да 15 гадзін. З 11 па 2 сакавіка інспектары будуць гатовы прыняць грамадзян (у суботу і нядзелю) з 9 да 15 гадзін, а ў панядзелак 3 сакавіка — з 8 да 20 гадзін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НА ВЕРХНЯЙ ПАЛІЦЫ МОЖНА ПРЫШПІЛІЦЦА

Дзеля прадухілення траўмаў пасажыраў усе беларускія цягнікі аснашчаны спецыяльнымі рамянямі бяспекі.

Такую інфармацыю паведаміў намеснік начальніка пасажырскай службы аб'яднання «Беларуская чыгунка» Міхаіл ФЕДЗЮКОВІЧ. Рамяні бяспекі найперш патрэбны для пасажыраў, якія набываюць білеты на верхнія паліцы вагонаў. Бо былі выпадкі, калі людзі падалі і атрымлівалі траўмы. Цяпер дастаткова папрасіць у правадніка рэмень бяспекі і прышпіліцца. Рамяні выдаюцца бясплатна.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Крымінальны кодэкс можа быць змякчаны

Генеральная пракуратура і Вярхоўны суд Беларусі прапануюць змякчыць крымінальнае заканадаўства. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Генпракуратуры.

Змякчыць прапануецца пакаранні за злачынствы, што падпадаюць пад катэгорыю «якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі і менш цяжкія». Пры гэтым у Генпракуратуры дадалі, што адначасова прапануецца павялічыць памеры штрафных санкцый за злачынствы карупцыйнага характару. Суразмоўцы асабліва адзначылі, што гаворка не ідзе аб пераглядзе ўжо вынесеных судамі прыгавораў. Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў паведамілі, што прапановы па гуманізацыі крымінальнага заканадаўства перададзены ў Адміністрацыю Прэзідэнта.

Карупцыянераў — да адказу

Летась у Віцебскай вобласці сярод прыцягнутых да крымінальнай адказнасці па фактах карупцыі 15 працэнтаў — работнікі гандлю.

Пра гэта паведамілі «Звяздзе» ў пракуратуры Віцебскай вобласці. Шмат карупцыянераў выявілі ў сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, на дзяржаўных прадпрыемствах, у сістэмах адукацыі і страхавання.

Паводле слоў пракурора Віцебскай вобласці Генадзя Дысько, 40 чалавек былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. У два разы болей выявілі злачынстваў, звязаных з хабарніцтвам. За парушэнне закона ў ліку іншых на 8,5 года за атрыманне хабару быў асуджаны намеснік старшыні абласной арганізацыі спажывецкага саюза. Зацікавіліся пракуроры і дзейнасцю трох кіраўнікоў раённых арганізацый.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Газетныя падшыўкі, як і рукапісы, не гараць!»

23 студзеня спаўняецца 90 гадоў газеце «Магілёўская праўда»

Гэта найстарэйшая газета ў Магілёўскай вобласці. Яе калектыў адзначыць юбілей спецыяльным нумарам, які выйдзе ў свет 25 студзеня. Там будуць гістарычны экскурс, расповед пра сённяшні дзень рэдакцыі, шматлікія віншаванні, а таксама гумар: журналісты акцэнтуюць, што 90 гадоў — гэта ўзрост газеты, але зусім не іх асабістых.

Сёння «Магілёўская праўда» — гэта штотыднёвік. Больш за 20 гадоў выходзіць і папулярны дадатак «Днепровская неделя». Сумарны наклад — каля 30 тысяч асобнікаў.

Газета стала выходзіць на пачатку 1918 года як «Известия Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов». Выданне мяняла назву і, напрыклад, у час Вялікай Айчыннай вайны называлася «За радзіму». З 1956 года галоўная абласная газета трывала стала «Магілёўскай праўдай».

Сярод галоўных рэдактараў найбольш узгадваюць Васіля Цітаўца, які ў савецкі час 25 гадоў узначальваў газету. Тады прыйшоў у калектыў і цяперашні галоўны рэдактар «Магілёўскай праўды» Аляксандр Тарпачоў. Ён кіруе выданнем з 1995 года.

Адзін з самых складаных, хоць у той жа час і цікавых, перыядаў жыцця газеты — гэта 1990-ыя гады. Як і ў ваенны час, «Магілёўская праўда» трапіла ў выніку перабудовы ў экстрэмальныя ўмовы: з 1991 па 1998 гады сама рэдакцыя стала заснавальнікам газеты, якая развівалася самастойна і друкавалася за свой кошт. Цяпер заснавальнік выдання — Магілёўскі аблвыканкам.

— Твар газеты з цягам часу заўважна мяняецца, — упэўнены галоўны рэдактар «Магілёўскай праўды» Аляксандр Тарпачоў. — Калі ў нас у 1995 годзе з'явіўся першы камп'ютар, то нам падавалася, што мы зрабілі рэвалюцыю ў дызайне перыядычных друкаваных выданняў. А сёння тыя нумары падаюцца састарэлымі. Таму час ідзе — і развіваецца наша газета.

Сёння «Магілёўская праўда» мае ў чытачоў вобласці рэпутацыю інтэлектуальнай газеты, цікавай суразмоўніцы. Перад журналістамі стаяць мэту захаваць высокі ўзровень, фірмовы стыль выдання. А таксама, у духу часу, газета павінна быць карыснай свайму чытачу.

— Наша задача: не страчаць старых чытачоў і прыцягваць новых, — гаворыць Аляксандр Тарпачоў. — Апошняя падпісная кампанія нас парадавала: мы павялічылі наклад.

Галоўны рэдактар любіць распавядаць сваім падначаленым гісторыю пра сакрэт прыгажосці англійскіх газоняў. Калі ў англічан пытаюцца, як зрабіць падобныя, яны адказваюць, што гэта вельмі проста: на працягу трох соцень гадоў штодзённа паліваць і стрыгчы... Тут Аляксандр Тарпачоў бачыць аналогіі з працай журналіста: проста штодня працаваць, быць уважлівым, цікавіцца жыццём, пісаць творча.

Сёлета, плануюць у «Магілёўскай праўдзе», з'явіцца свой Інтэрнэт-сайт. Напарадзе — пераход на каляровы варыянт. Супрацоўнікі газеты не бяруцца прагназаваць, як будзе выглядаць «Магілёўская праўда» на свой 100-гадовы юбілей. Цяпер відавочна толькі адно — у будучым будзе больш інтэрактыўнасці. Ужо цяпер на старонках «Магілёўскай праўды» ёсць экспрэс-апытанні і прамыя лініі з чытачамі. Далей гэтага будзе больш, бо выданню трэба падтрымліваць сувязь са сваімі чытачамі, ведаць іх меркаванні і праблемы.

У астатнім — невядома, як будуць развівацца новыя тэхналогіі. А вось сэнс журналісцкай працы для рэдакцыі найстарэйшага абласнога выдання застанецца ранейшым.

— Трэба захоўваць годнасць і самапавагу, — на гэтым засяроджвае ўвагу Аляксандр Тарпачоў. — Памятаеце, што рукапісы не гараць? Вось і газетныя падшыўкі не гараць таксама! Праз некалькі дзесяткаў гадоў хтосьці адкрые архіў, разгорне падшыўку і прачытае «Магілёўскую праўду». Трэба, каб не было сорамна за сваю працу.

Ілона ІВАНОВА, аглядальнік «Звязды» і ў мінулым журналістка «Магілёўскай праўды».

Калектыў газеты «Звязда» шчыра віншуе магілёўскіх калег з юбілеем і жадае творчых поспехаў, падмацаваных добрымі фінансамі!

Простая мова

УСЕ... І НІХТО

Хто прыдумаў рухавік, аўтамабіль, ведаюць, напэўна, многія. Хто прыдумаў правілы дарожнага руху, — баюся, не. А дарма ж, відаць: заслужыў чалавек добрай памяці? Бо вось як сёння без іх, без тых правілаў? Машын — гіблота... Каму ў якім радзе ехаць, з якою хуткасцю, як абганяць, дзе спыняцца, каго прапускаць?..

Іншая справа з імі: люба-дорага паглядзець (прынамсі, з вышыні паверхаў...). Вось па праспекце — рэчкай вірлівай — нясецца паток; вось перад скрыжаваннем (на святлафоры — чырвонае...) паслухмяна спыняецца; вось з правага раду аўтамабілі едуць направа, потым, з сярэдняга — прама, а з левага, папярэдне прапусціўшы ўсіх, — налева і на разварот...

Карацей — парадак, бо ўсе рухаюцца так, як належыць, падпарадкоўваюцца таму, што напісана.

Але ж гэта — калі глядзець на дарогу зверху. А калі ў тым патоку пабыць...

Спыняемся вось. Пад святлафорам. Побач — тармозяць іншыя... І ліхач, што хацеў праскочыць, ды раптам перадумаў — даў па тармазах. Паколькі асфальт быў мокры, — аўто крутанула і, відаць, задам яно зачапіла другое.

— У-у... Каз-зёл! — загнуў пацярпелы. — Табе б на павадку дзе...

— А ну паўтары! — «за казла» пакрыўдзіўся ліхач: падскочыў бліжэй, падставіў вуха, «каб лепей пачуць», і тут жа па ім атрымаў...

Што было далей — не ведаю, бо на святлафоры загарэлася зялёнае. Аўтамабілі, у якіх сперадзі перашкод не было, паслухмяна крануліся з месца, паехалі далей. Іншыя пачалі аб'язджаць-сігналіць...

Але той, хто глядзеў на праспект з вышыні, зразумела ж, ніякага інцыдэнту не бачыў: усё там было чын чынам — спакойна, нармальна. Усё — як напісана ў правілах.

Як жанчына жанчынам...

Раніца. У гастраноме — народу няшмат... Але каса працуе толькі адна — чарга сабралася. Апошняй у ёй — мажная кабета ва ўсім цёмным: шапцы, куртцы, штанах... «Упрыгожаных» жмутком белых нітак.

— Мусіць, кавалер нейкі прычэпіцца? — пытаю неўпрыкмет, займаючы за ёй чаргу.

— Ой... Праўда? Дзе? — бянтэжыцца жанчына. Выгінаецца, каб убачыць, гладзіць азадак, — марна.

— Во, — кажу, здымаючы нітку. — Накруціце на пальчык. Будзеце ведаць імя.

— Ды што вы? — маладзее ад смеху кабета. — Мне, мо, пра вечнае трэба ўжо думаць?

...А гэта — хіба не вечнае?

Дзве дачкі, дзве маці

Сіла слоў, сіла прыкладу... Пятроўна гады са тры назад гараж прадала, усё да капейчыны з «панчохі» выграбла, сватоў «страсянула», у крэдыты па вушы ўлезла, але кватэру для дзяцей — для дачкі з зяцем, для ўнучкі — пабудавала!..

Што цікава, прыяцелькам, блізкім сваім расказвала потым не столькі пра цяжкасці, колькі пра тое, як яны атрымалі ключы, як у першы раз паехалі глядзець тыя і насамрэч харомы — кухня 13 квадратаў, калідор 16... Малая па пакоях адразу панеслася... А дачка — не, наадварот — тут жа ў калідоры, села на падлогу, абхапіла рукамі твар і, не могучы верыць шчасцю, заплакала: «Мама, мамачка... Мы?.. Тут... будзем жыць?!».

Узнагародзіла, карацей, аддзячыла. Яна. Сваёй маці. І на гэткі ж подзвіг (у імя дзяцей) падбіла чужую...

Аднак яе дачка, атрымаўшы ключы, у калідоры не спынілася, — спакойна, па-гаспадарску прайшлася па кватэры. А прамовіла — толькі адно:

— Блін, мам, колькі ж цяпер грошай трэба, каб гэта абставіць?!

Пра што дбаеш...

Звычка (ці толькі мая?) — штодзень па дарозе дамоў зазіраць у паштовую скрынку і штодзень, лічы, злаваць — туды зноў накідалі смецця (чытай — беспатрэбнай рэкламы). Выграбла ў чарговы раз, хацела адразу выкінуць, але за адзін лісток — вока «зачапілася». Папера добрая... На ёй — прыгожы лапік падлогі. Кідкі надпіс «Ваш паркет». Кантактныя тэлефоны...

Коратка. Ёмка. Проста...

Прынесла дамоў, яшчэ раз пакруціла ў руках і... паклала ў шуфлядку, — не з-за патрэбы, не. З-за павагі да сумленна, творча зробленай працы.

А патрэба? Хто ведае — мо, калі і з'явіцца... Не ў мяне, дык у некага з іншых...

Што, заўважылі, і трэба было разумнаму рэкламадаўцу.

Што каму, а куму гарэлка

Праверана: у добрай кампаніі — шлях карацейшы. А яшчэ як з музыкай...

У машыне радыё ўключаем — звыклы «вінегрэт» з рэкламы, песень, жартаў, навін...

Адна з іх, праўда, чапляе: у Маладзечне (куды шлях трымаем. — **Аўт.**) — ДТЗ, сутыкнуліся аўтамабілі, ёсць пацярпелыя. Да таго ж (словы дыктаркі ў перакладзе і перакразе. — **Аўт.**): «...движение по улице Вялики Гасциняц затруднено».

Не ведаю, як вы, я — ды на слых — адразу ў не сцямяла, што здарэнне тое — на Вялікім Гасцінцы, прыгожай вуліцы, з нашай, вельмі прыгожай назвай...

Але ж, для чалавека пр́ышлага, чужога — пусты гук: што вялікі гасцінец, што Вялікі Гасцінец...

І «пустэчу» гэту ён, пры магчымасці, будзе распаўсюджваць — перадаваць далей. Як эстафету.

Наклікаў...

Праўду, здавалася, кажуць — на гатовы абед прыходзіць шчаслівы. Ды, мусіць, не заўжды?

У той раз — варта было стол накрыць, сесці — дзверы адчыніліся, зазірнуў сусед. І без пільнай справы, як быццам... А не далучыўся, сышоў. Хвілін праз 10, праўда, з'явіўся яшчэ раз. З вершам:

Как вкусно пахнет черным кофе,
Салатом, салом, колбасой...
А я на жизненной голгофе
Стою голодный и босой.

Пра сябе ён, вядома ж пажартаваў — перабольшыў, тую галгофу (у пераносным значэнні гэта — месца нягод і пакутаў, крыніца няшчасця) для рыфмы прыцягнуў, бо тады працаваў, зарабляў...

Цяпер яго на пенсію «пайшлі», што можна, відаць, разглядаць як «месца» нягод і пакутаў, бо без работы, без справы ён сумуе страшэнна...

Ды і «даход» у 300 з хвосцікам тысяч... Чым не крыніца няшчасцяў?

А старым? Нічога?

Горад расце... Побач з домам — два новыя, з крамкамі на першых паверхах...

І якой жа трасцы там толькі няма — віно-гарэлка, рыбацкія прылады, будматэрыялы, абутак, батасэрвіс... Усё, каравель, што патрэбна. Пераважна маладым і здаровым. Жывым...

У прыяцелькі свякроў — раптоўна памерла. Нявестка ўвесь мікраён абвесціла (насельніцтвам, дарэчы, з добры райцэнтр), каб на смерць ёй хустку купіць — паркалёвую, штапельную, шаліноўку — любую, абы не з сінтэтыкі... Думаеце, знайшла? Толькі ў цэнтры.

Другая прыяцелька (бабуля злягла) тры дні судна ў сталіцы шукала. Спачатку — ездзіла (там — няма, там — былі, ды разабралі, туды — не прывезлі яшчэ...). Потым, як кажуць, на тэлефон села. Каб прыкладна тое ж пачуць. Але вызваніла нарэшце: ёсць, прыязджайце. Пакуль даехала — разабралі, лічы: яна апошняе купіла.

...Цікава: усе, як быццам, ведаюць, што старых і нямоглых людзей у нас шмат і гаворадь аб гэтым таксама нямала, а вось, каб нешта рабіць, каб думаць, што ім жа таксама нешта патрэбна, ахвотнікаў няма. Твой стары — твае праблемы.

Калі застаюцца справы

Здалёк. Бываліца. Пятро Глебка трапіў у Шчучын, зайшоў у райкам партыі, сказаў, што вельмі хацеў бы наведаць магілу Цёткі. Адзін з партыйных босаў паспрыяў, што называецца — націснуў нейкую пімпачку ў тэлефонным апараце, выклікаў памочніка, сказаў:

— Здесь к нам приехал известный белорусский писатель Петр Глебко. Он хотел бы навестить могилу своей тети. Так вы отвезите его, посодействуйте...

Цётку (не, не слынную Элаізу Пашкевіч, аўтарку першай беларускай чытанкі для дзяцей, паэтку, змагарку...), а маю, родную, ва Украіну замуж колісь забралі. Там — яна пражыла жыццё, вырасціла трох прыгожых сыноў і дужа рада была, што ўнук трапіў служыць пад Мінск, на яе радзіму...

Пасавала хлопцу вайсковая форма. Але насіць яе ён не любіў. Таму перад кожным звальненнем тэлефанаваў, разам з сябрам заязджаў да нас. Тут яны пераапраналіся ў цывільнае, пад'ядалі і ехалі ў горад. У кіно, у парк, на спатканні...

Падабаліся ім нашыя дзяўчаты, падабаўся люд, так што абодва не супраць былі ажаніцца, застацца. Але не лёс, відаць, — раз'ехаліся.

Той сябра на памяць нам рушнік падарыў.

Сорамна: прозвішча хлопца — ужо не помню, бо шмат вады сплыло, а рушнікоў — махровым, мяккім, ружовым, з белымі чайкамі — дагэтуль карыстаюся...

Трэба, мусіць, і самой некаму купіць — на добрую, доўгую памяць.

З дажджу... Пад лівень

Дзень быў добры
І вечар такі ж...
Ды адкрыўся ён бокам горкім:
Людзі — мы, як малыя звяркі,
Зашываемся нанач у норкі.

Напісалася гэта — даўно, а ўзгадалася — трэцяга дня, па дарозе з гасцей. Мо, таму што таксама быў вечар? І — дзіўна — зусім не позні, у Мінску (вакол — разлівнае мора агнёў!), а побач (аж вусцішна стала) — нікога: «пазашываліся». Усе...

Зрэшты, здаецца, не? Хтосьці ёсць на прыпынку?

Падыходзячы бліжэй, убачыла — хлопцы. Трое. Няскладныя, цыбатыя, гадоў па 13... З цыгарэтамі ў зубах. Адзін да таго ж — з заручальным пярсцёнкам на правай руцэ. І ўсе... п'яныя.

Усе... І ніхто

Зноў вечар. Добры... І тралейбус. Пасажыраў у ім чалавек, мо, з дзесяць, а значыць, бачыцца кожны, хто выйшаў, хто зайшоў. Прынамсі, на чарговым прыпынку, кабета — грузная, сталая, з досыць цяжкімі клункамі... Да таго ж тралейбус яна, відаць, даганяла — запыханая ўся, твар чырвоны... Але шчаслівы, бо дабегла, бо села, бо сумкі побач паставіла — едзе... Нягледзячы на даведацца нават, куды: ледзь перавёўшы дух, жанчына дастала мабільнік, клапатліва спытала кагось:

— Зая, ты ўжо дома? А даўно прыйшоў? (Праз паўзу... Адказаў не чутно. — **Аўт.**). І Сержык дома?.. І Танечка?.. От малайцы!.. Што-што ты сказаў? Хлеба купіць? Добра. І белага няма?.. А раніцай жа цэлы батон быў, здаецца?.. Хто з'еў? Ты, Зая?.. З кефірчыкам? Дык што — і кефіру мне ўзяць?.. Сержыку піва? Добра... Не, не позна. Я ў гіпер зайду, — ён да 10...

Ля гіпера (гіпермаркета) жанчына выйшла і ўсё, што сказалі (хлеб, батон, піва, кефір), ну, напэўна ж купіла. А, значыць, да тых сумак, што ў яе ўжо былі, дабавіліся яшчэ.

Уявіла, як яна будзе цягнуць іх з магазіна да прыпынку, як будзе зноў даганяць тралейбус (ці чакаць яго — на холадзе — бо ходзяць рэдка), як потым выйдзе і папаўзе (ісці ж з такім грузам нельга), туды, дзе (дай Бог!) утульна і цёпла, дзе «Зая» (трэба разумець, любы муж?), дзе не малыя ўжо сын і дачка (ці нявестка?), дзе ўсе — дома, і яе чакаюць...

А вось не шкадуе, не любіць — ніхто.

Валянціна ДОЎНАР.
(Працяг будзе.)

Аўтакірмаш

РЫВОК «KIA»

Летась у Беларусі было прададзена больш за 650 аўтамабіляў маркі «KIA».

У параўнанні з 2006 годам аўтамабілі памянёнай маркі зрабілі імклівы рывок на беларускім рынку. Продаж «KIA» павялічыўся ў 3,1 раза і зараз доля гэтых машын у нашай краіне складае 5 працэнтаў. Гэта з'яўляецца своеасаблівым рэкордам.

Значных поспехаў дасягнулі выторцы аўтамабіляў «KIA» і ў іншых краінах свету. Напрыклад, амерыканскі інстытут дарожнай бяспекі прысудзіў вышэйшы рэйтынг бяспекі мадэлям «KIA Sedona» і «KIA Amanti».

У Швецыі «KIA cee'd» атрымаў ганаровы тытул «Аўтамабіль года для ўсёй сям'і». Гэтая ж мадэль была прызнана аўтамабілем года ў Грэцыі, Даніі, Літве і Румыніі. На Філіпінах «KIA Picanto 1.1 DLX» быў прызнаны лепшым малагабарытным аўтамабілем года, а мінівэн «KIA Carnival LX 2.9 CRDi» першынстваваў у прадстаўнічым класе.

Аўтабяспека

ГІНУЦЬ ЧАСЦЕЙ МУЖЧЫНЫ

Летась на сталічных вуліцах адбылося 1266 аўтамабільных аварый, у выніку якіх 95 чалавек загінулі і 1422 — параненыя.

Як паведаміў старшы інспектар аддзела ДАІ Савецкага раёна Мінска Дзмітрый Марозаў, найчасцей прычынай гібелі і атрымання траўмаў у ДТЗ з'яўляюцца наступныя парушэнні Правілаў дарожнага руху:

«УДЗЕЛУ Ў СВАЁЙ ШОСТАЙ АЛІМПІЯДЗЕ Ў ЛОНДАНЕ Я НЕ ВЫКЛЮЧАЮ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Як яна вучыцца ў школе?

— У гэтым годзе ў яе будзе разменаванне ў іншую школу, таму праблемы крыху ёсць. Сказала мне нядаўна, дарэчы, што будзе веславаннем займацца. Пыталася, калі можна пачынаць. Я адказала, што годзікі тры яшчэ трэба пачакаць. Лепш пачынаць у 12—13 гадоў, я сама ў 15 пайшла. Аляксандра і маленькая ўвесь час са мной па зборах ездзіла, у лодку не садзілася, але ў нас ёсць такі трэнажор «Канцэпт», з чатырох гадоў яна на ім сядзела. Раней яна займалася гандболам, цяпер валейболам. Зараз, калі часам прыязджае са мной на трэніроўку, у лодку садзіцца каля берага.

— Вы не супраць, калі яна пойдзе па вашых кроках у спорце?

— Гэта будзе яе выбар. Я не буду ні ўгаворваць, ні адгаворваць. Хоць від спорту складаны, а яна ў мяне такая худзенькая і высокая. Займалася гандболам, калі гуляня больш жорсткая пачалася, перайшла на валейбол. На яе валейбольныя трэніроўкі я ні разу яшчэ не хадзіла, а вось гандбольныя мне не падабаліся.

— На якой мове яна размаўляе?

— Пераважна на нямецкай.

— Як часта вы прывозіце Аляксандру ў Беларусь?

— Вельмі рэдка яна тут бывае. Апошні раз прыязджалі пасля чэмпіянату свету ў кастрычніку, у Сашы якраз былі восеньскія канікулы — у Германіі яны раней, чым у нашых школьнікаў.

— Як ацэньваеце сваё выступленне ў гэтым сезоне і тое, што вас прызналі лепшай спартсменкай года?

— Тое, што я стала лепшай спартсменкай другі год запар, стала для мяне сюрпрызам. Раней, пасля Алімпіяды ў Атланце, мне казалі, што спартсмен не можа станавіцца лепшым двойчы, без перапынку. Таму гэта, безумоўна, стала для мяне вялікім сюрпрызам. Калі меркаваць па выніках, то лічу, што я сёлета выступіла выдатна.

— На колькі дзён вы прыехалі ў Беларусь?

— Учора ў 12 гадзін раніцы я ехала ў машыне з трэніроўкі і мне патэлефанавалі з Нацыянальнага алімпійскага камітэта, сказалі, што заўтра ў тры гадзіны я павінна быць у Беларусі. Мы хуценька сталі збірацца, я яшчэ не ведала, з кім пакінуць Аляксандру. У выніку Саша засталася з дзяўчынкамі, якія са мной у Германіі разам трэніруюцца, а мы ў шэсць гадзін вечара выехалі з Германіі. Праз дзень паедзем назад — у панядзелак трэба на трэніроўку. У роднай вёсцы на гэты раз пабываць не паспяваю.

— Наколькі часта вам удаецца наведаць маму?

— Ой, вельмі рэдка. Цяпер, зразумела, здараюцца выпадкі, удаецца часцей прыязджаць. А перад Алімпіядай будзе не да паездак, толькі пасля этапаў Кубка свету перапынак невялікі перад самой Алімпіядай. Якраз у Познані будзе апошні этап, з Познані прыедзем у Мінск, і з Мінску паедзем да мамы.

— У адрозненне ад Беларусі ў Германіі канал не замерз?

— Не, ёсць усе ўмовы для трэніровак.

— Перад Алімпіядай у Беларусі не збіраецеся трэніраваць?

— Трэніраванне — не. Будзе ў нас Кубак Беларусі ў красавіку ў Брэсце, там я буду ўдзельнічаць.

— Да Алімпіяды засталося не так шмат часу. Хваляванне перадалімпійскае адчуваеце?

— Хвалявання няма. Тое, што ўсе ад мяне чакаюць залатога медаля — гэта адказнасць крыху нервуе. А так трэніровачны працэс ідзе паводле плана, я спадзяюся, што не падвяду.

— Упэўненасць ёсць, што ўдасца ўзяць «золата»?

— Гэта Алімпіяда, тут немагчыма даваць прагнозы, як на любых спаборніцтвах. Безумоўна, я зраблю ўсё, што ад мяне залежыць. Тры апошнія гады нікому не ўдалося ў мяне выйграць — гэта плюс для мяне і мінус у псіхалагічным плане для саперніц. Магчыма, і выйграю, а, магчыма, і не.

— Сваё прымяненне ў беларускім спорце пасля заканчэння выступленняў бачыце?

— Я яшчэ пагляджу, якім будзе вынік да Пекіна, і магчыма, буду яшчэ да Лондана трэніравацца.

— Удзел у Лонданскай Алімпіядзе вы таксама не выключаеце?

— Пакуль не выключаю.

— Хто ў новым сезоне будзе вашымі галоўнымі саперніцамі?

— Балгарка Нейкава, мая даўняя саперніца, якая вярнулася ў спорт пасля нараджэння дзіцяці. Прыемны сюрпрыз мне паднесла чэшка, якая ў прызы нават зараз не трапіла. Яна змяніла тактыку — імкнецца рознымі шляхамі ў мяне выйграць, але пакуль у яе не атрымліваецца. Але, думаю, на Алімпіядзе яе нельга скідваць з рахунку. Амерыканка, якая на чэмпіянаце свету стала трэцяй, на алімпійскай рэгаце добра выступіла — мы з ёй мяняліся, то я, то яна першая, хоць у выніку я выйграла. Не выключана, што і кітаянка складзе нам канкурэнцыю, тым больш што кліматычныя ўмовы ў Пекіне складаныя, а яна выступае ўсё ж дома. Ну, думаю, і хопіць.

— Спартыўныя чыноўнікі сцвярджаюць, што ў спартсменаў праблем няма ніякіх перад Алімпіядай. Што вы скажаце?

— Нядаўна ў нас узнікла адна праблема. Не ведаю нават, хто тут крыху праспаў, напэўна, федэрацыя наша. Справа ў тым, што трэнер нядаўна ездзіў на завод у горад Эбербах, дзе вырабляюць нашы лодкі. Аказалася, запыту мне на новую лодку на той момант не было. Пасля першага этапа Кубка свету трэба лодкі пасылаць у Пекін, а трэніравацца я планую на старой. Колькі будуць рабіць лодку, я дакладна не ведаю, могуць зрабіць і хутчэй, але гэта значыць, што менш якасна. Перад Алімпіядай шмат заказаў, і факт у тым, што нашага запыту яшчэ няма. Мы раней размаўлялі з міністрам, ён сказаў, што ўсё для мяне будзе зроблена. Не ведаю, чаму здарылася гэта непаразуменне. А ў астатнім праблем няма.

— Сёлета вы заваявалі шосты тытул лепшай спартсменкі года. Сёмы выйграць хочацца?

— Вядома ж, хочацца. І я спадзяюся, што ў мяне будуць усе падставы яго заваяваць.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Віншуем дарагіх дзяцей ***Надзею і Юру ПРОНЬКІНЫХ*** *з Калінкавічаў з 15-годдзем сумеснага жыцця. Жадаем шчасця, здароўя, сямейнага дабрабыту на доўгія гады.*

Бацькі, родныя, в. Мялешкавічы.

Экслібрыс «Звязды»

Угледзецца ў таямніцу душ...

Голубева Н.А. Балтийская тетрадь. — *Минск: Харвест, 2007. — 32 с.: ил.*

Напярэдадні Новага года выйшаў зборнік паэзіі «Балтийская тетрадь» члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталлі Голубевай.

Гэта першая з чатырох кніг аўтара, якія былі напісаны ў розныя перыяды жыцця. Яна прысвечана складаным 90-м гадам.

Чалавек у сітуацыі выбару... Як не згубіць, не страціць, не раскідаць лепшыя якасці душы на дробязныя крыўды?.. Ці магчыма, прымаючы сучаснасць такой, якая яна ёсць, — застацца верным асабістым маральным прынцыпам і агульначалавечым каштоўнасцям?..

Наталля Голубева пераканана: у самыя складаныя лёсавызначальныя моманты неабходна шукаць і знаходзіць сілы рухацца наперад, да святла, дабрыні, любові. Узяўшы ў спадарожнікі надзею.

Нягледзячы на духоўны пошук, душэўныя перажыванні чалавека, які сутыкнуўся з глабальнымі змяненнямі ў грамадстве, вершы заклікаюць любіць жыццё, кожнае яго імгненне. Асабліваю паэзію жыцця аўтар бачыць і ў тым, што нас акружае — «у трапятанні велічных храмаў», і «ў светлых гуках аргана гучання», «у сярэбры алтарных слёз» і «ў стыхіі неба».

Прадстаўленыя ў «Балтийской тетради» вершы звязаны адзінай ідэяй — усёпераможнага дабра і кахання. У іх прысутнічае філасофія чалавечых адносінаў. Аевяныя лёгкім сумам, яны застаюцца светлымі, напоўненымі асаблівай цеплынёй і нагадваюць аб тым, што ў любой жыццёвай сітуацыі так важна захаваць лепшыя душэўныя якасці і «раскрыць свае абдымкі для дабрыні».

Варта адзначыць цудоўнае афармленне гэтага паэтычнага зборніка. Не будзе перабольшаннем сказаць, што ілюстрацыі да вершаў — гэта своеасаблівая паэзія ў фарбах, цудоўна выкананая адказным рэдактарам выдавецтва Мірай Жабцавай і рэдактарам Аляксандрам Макацерчыкам.

Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.

Усміхнёмся!

На планёрцы:

— Хачу звярнуць увагу супрацоўнікаў фірмы, што выраз «усякае глупства» не зусім дакладна адлюстроўвае асартымент прадукцыі, якую прапануе наша кампанія.

☺

Наведвальнік у рэстаране, да яго падыходзіць афіцыянт. Той дае яму долар са словамі:

— Парайце мне што-небудзь.

Афіцыянт складае купюру ў кішэню, нахіляецца да наведвальніка і кажа:

— Ідзіце адсюль.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион

по продаже гражданам Республики Беларусь обращенного в доход государства имущества, расположенного в д. Малинники Пуховичского района, в том числе: жилой дом общей площадью 52,9 кв. м, земельный участок общей площадью 0,1236 га для строительства и обслуживания жилого дома, гараж с погребом. Начальная цена — 15 730 000 бел. рублей. Размер задатка составляет 3 % от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010, Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 26 февраля 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 25 февраля 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости». УНП 690324015

У СЕРБІЮ ЕДЗЕ «НАРОДНЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«А чаму сярод вашых прыхільнікаў столькі дзяцей? — пацікавіліся, між іншым, журналісты пасля канцэрта. — Як жа інакш, — з абсалютна сур'ёзным выглядам адказаў саліст (зрэшты, пад маскай не бачна, так што хто яго ведае), — гэта наша ежа!» З беларускіх канкурсантаў «Lordi», дыпламатычна пахваліўшы ўсіх, вылучылі ўсё ж «рокавую» Гюнеш, а з поп-выканаўцаў увогуле пагадзіліся б праспяваць дуэтам хіба толькі з Шэр: «Бо ў яе на твары таксама маска».

З першых вуснаў

Наталля ПАДОЛЬСКАЯ, прадстаўніца Расіі на «Еўрабачанні-2005»:

— Я не магу параіць, як лепш сабрацца перад самім конкурсам, бо ў кожнага свае метады. Напэўна, трэба проста верыць у сябе і ў песню. Мне больш хочацца звярнуцца нават не да артыстаў, а да гледачоў Беларусі, каб яны як мага найбольш падтрымлівалі свайго ўдзельніка, і нават калі нешта не атрымаецца, потым яго не «штурхалі».

— Вам ёсць з чым параўноўваць: першая спроба прайсці на «Еўрабачанне» была якраз ад Беларусі. Што змянілася з таго часу, на ваш погляд, у арганізацыі адбору?

— У 2002 годзе Беларусь удзельнічала ў конкурсе ўвогуле ўпершыню, і, на мой погляд, агульны музычны ўзровень быў слабейшы. А сёння я хваляваўся за ўсіх адразу, бо ўсё, што я ўбачыла на ток-шоў і на канцэрце, мне вельмі спадабалася — кожны ўдзельнік па-свойму адметны, яркі.

— У нас пастаянна спрачаюцца, што больш важнае: песня або пастаноўка шоў?

— Я думаю, нельга зрабіць выбар паміж гэтымі рэчамі. Што галоўнае: нос або вочы? Усё ў цэлым, усё разам. Важна адказна падысці да падрыхтоўкі, зрабіць прома-тур, «уціснуць» у вушы замежным слухачам сваю канкурсную песню, каб яе пачулі больш, чым адзін раз на конкурсе, бо галасуюць больш ахвотна за ўжо знаёмае.

— Многіх удзельнікаў «Еўрабачанне» не адпускае, і, паколькі правілы гэта не забараняецца, артысты выступаюць на конкурсе некалькі разоў. Вам не хочацца паўтарыць спробу?

— Пасля свайго пятнаццатага месца я давала сабе слова, што ўсё, на гэтым мая конкурсная дзейнасць завершана. Была даволі працяглая дэпрэсія, і я не хацела нідзе больш спаборнічаць, проста займацца творчасцю. Але сёння, калі сядзела ў студыі, раптам адчула, што хочацца быць сярод канкурсантаў, быць адной з іх. Так што я не выключаю такой магчымасці.

Руслан АЛЯХНО, прадстаўнік Беларусі на «Еўрабачанні-2008:

— Адно скажу: я рады таму, як выступіў. І мне не сорамна за сябе — ні ў паўфінале, ні ў фінале «Еўрабачання». Тым больш, напярэдсе яшчэ вялікая праца, і пастаноўка будзе паляпшацца. Я пастараюся зрабіць усё, каб прадставіць краіну годна.

Аляксандр ЦІХАНОВІЧ, кіраўнік праекта «ЕўраФэст»:

— Як і ў мінулыя гады, звяртаюся да вас — калі ласка, падтрымайце нашага прадстаўніка, жадайце яму пазітыву, і тады, разам, у нас усё атрымаецца.

Іна АФАНАСЬЕВА, заслужаная артыстка Беларусі (на ток-шоў «Ход у адказ»):

— Мы ўсё спрабуем пралічыць формулу поспеху, разабрацца, якая ў выступленні павінна быць «фішка». Можа, ніякіх «фішак» і не трэба шукаць? Не трэба стаяць на галаве, дагары нагамі, каб запомніцца гледачам — трэба выйсці і праспяваць ад душы...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

P.S. А ўначы мне прысніўся жах — у якасці кансультантаў па пастаноўцы шоў беларусы звярнуліся да «Lordi», і фінскія рок-монстры развучваюць у сваёй манеры «Купалінку»...

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.11	16.31	8.20
Віцебск —	8.07	16.15	8.08
Магілёў —	8.01	16.21	8.20
Гомель —	7.52	16.25	8.33
Гродна —	8.25	16.48	8.23
Брэст —	8.19	16.55	8.36

Месяц
Поўня.

Імяніны
Пр. *Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра, Фёдара;*
К. *Мілены, Феліцыі, Эрыкі, Рафала, Роберта, Фелікса, Францішка, Цімафея.*

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА
0..+2°С	-1..+1°С	-2..0°С
ВІЛЬНЮС	МАСКВА	С.-ПЕЦЯРБУРГ
-3..-1°С	-7..-5°С	-4..-2°С

Дзве даты

23 студзеня

1863 год — 145 гадоў таму пачалося паўстанне за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Яно было падрыхтавана польскімі і беларуска-літоўскімі канспіратыўнымі арганізацыямі пры маральнай падтрымцы расійскіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў з арганізацыі «Зямля і воля». Першыя паўстанцкія атрады з'явіліся на тэрыторыі Беларусі ў канцы студзеня 1863 года. У Беларусі і Літве паўстанне ўзначаліў Літоўскі правінцыйны камітэт, які ўтварыў гродзенскі, навагрудскі, мінскі і іншыя мясцовыя рэвалюцыйныя камітэты. Паўстанне было жорстка падаўлена царскімі войскамі да сярэдзіны 1864 года, многія яго ўдзельнікі пакараны смерцю ці былі сасланы на катаргу.

1793 год — у Гродне паміж Расіяй і Прусіяй адбылося падпісанне дагавора аб другім падзеле Рэчы Паспалітай. Урадавай рэфармай, першай у Еўропе Канстытуцыяй, аказаліся задаволены не ўсе. Рэакцыйныя сілы выступілі супраць караля, за ўмяшанне ў справы Расіі. Да Расіі ў выніку адыходзіць значная частка зямель цэнтральнай і заходняй Беларусі і Украіны, да Прусіі — Гданьск і Торунь, большая частка Мазовіі і Кракаўскага ваяводства.

Цытата дня:

«У дваццаць гадоў намі кіруе пачуццё, у трыццаць — талент, у сорак — розум».

Бальтасар Грасіян (1601—1658), іспанскі пісьменнік.

Пісьменнік Васіль Ткачоў нарадзіўся акурат у першы дзень 1948 года. Сёлета разам з Новым годам сустрэў 60-гадовы юбілей.

Шчыра зычым пастаяннаму аўтару і добраму сябру «Звязды» моцнага здароўя, прыемных хвілін натхнення, далейшага плёну ў творчасці!

Васіль ТКАЧОЎ

ПАД ГОРАДАМ ГОРКІМ

На гэты раз Новы год Хведар Канопліч вырашыў сустракаць не ва ўтульнай гарадской кватэры, як гэта было на працягу апошніх гадоў яго жыцця, а ў той хаце, дзе некалі нарадзіўся. Пачаў збірацца ў няблізкую дарогу зранку. У рэчавы мяшэчак паклаў транзістарны радыёпрыёмнік, ладны скрыль сала, кольца вэнджанай каўбасы, бохан хлеба, бляшанку шпротаў, пяцілітровую бутэльку вады, паўлітэрку гарэлкі... Усё, здаецца? А можа, гарэлкі мала будзе? Раптам і яшчэ хто сустрэнецца яму ў роднай вёсцы, якая, ведаў, даўно памерла: апошняга жыхара Вераснёўкі правялі на пагост на пачатку гэтага веку. Хоць хаты стаяць. Амаль у кожнай — заглянь у акенца — убачыш запраўленыя ложкі з пухнатымі падушкамі, засцеленыя абрусамі сталы, у чаленіску стаіць чапяла, на ўслоне будзе вядро, да якога прыляпіўся карэц. Заходзь, жыві. Цяпер, мусіць, яны, хаты, замецены снегам, як замецены, пэўна ж, і ўсе падыходы да вёскі.

Канопліч падняў рэчавы мяшэчак: лёгкі, плечы не адцягне, таму выпаршыў усё ж узяць яшчэ і пляшку віна — на ўсякі выпадак. Для яго дык і адной чаркі хопіць, аднак недзе ў душы жыла надзея, што свята ён будзе сустракаць не адзін, а да ягонага навагодняга цяпельца прыгорнецца яшчэ якая-небудзь душа...

— Усё ж едзеш? — падняла крыху сумныя вочы на мужа жонка Марыя, рыхтуючы на кухні святочную вячэру, і ад цыбулі, якую на тое час скрыліла, у яе былі вільготныя вочы.

— Еду, — адказаў кораткa, але цвёрда.

— Ну, глядзі сам. Гаспадар — пан. Толькі не замерзні там. А я тады, відаць, да дзяцей пайду? А мо і адна сустрэну Новы год? Будзе відаць. Першы раз, між іншым, за трыццаць пяць гадоў мы навагодняе свята будзем сустракаць паасобку. Ці не кепская гэта прыкмета?

— Усё будзе добра. Не хвалюйся. А на другі дзень я вярнуся, і мы пасядзім за нашым святочным сталом. І дзяцей запросім. Даруй, Марыя, што так атрымалася. Хата — верыш? — паклікала. Хата. Ёй, відаць, сумна там адной... У яе, магчыма, таксама нешта баліць, як іншы раз у чалавека... Пакінулі яе ўсе мы, забыліся... Некалі патрэбна была яна нам, вельмі патрэбна... Нам, усім... Мне, Рыгору, Воўку, Сашку... Але ж тое — некалі... Не крыўдуй на мяне, Марыя. Хата таксама жанчына, і яна папрасіла маёй увагі... Нават, падалося, чуў яе голас... А акно... вялікае, тое, што на двор выходзіць, увесь час глядзіць на мяне... Быццам мама... Быццам дзед Якаў... Быццам баба Пелагея... Еду, еду, Марыя: адчуваю, нашай хаце няўтульна адной пад халодным зімовым небам... Яе нешта непакоіць... Я павінен быць сёння з ёй...

Маруся зразумела свайго Канопліча, не задавала больш аніякіх пытанняў, толькі пацікавілася, ці не забыўся ён пра запалкі. Чалавек не курыць, то мог і не ўзяць. Без запалак ноччу ў старэнькай бацькавай хаце няма чаго рабіць. Аказалася, хвалявалася жанчына дарэмна: і пачак з запалкамі, і тры свечкі той акуратна загарнуў у ручнік і паклаў у самую вялікую кішэнь рэчавага мяшэчка. «Бачыш?» Яна моўчкі кіўнула: бачу. У тым ручніку былі і фатакарткі родных людзей. Каб Марыя не задавала лішніх пытанняў, пра іх Канопліч змоўчаў.

У аўтобусе, колькі і ехаў, думалася яму пра ўсё патрохі, але больш пра хату, да якой спяшаўся, нібы да чалавека, што трапіў у бяду і чакае паратунку.

На шашы ў Ільічы здарожыўся, паглядзеў у бок лесу, адразу ж знайшоў у ім прарэху: у тым расцяробе, да якога адразу прыкіпеў яго зрок, была дарога. Як і спадзяваўся, на ёй не мелася слядоў чалавека, і Канопліч, не губляючы часу, пачаў тарыць сцежку да родных мясцін. Тут было недалёка: ад шашы ўсяго два кіламетры, аднак за ноч наваліла шмат снегу, што стрымлівала хаду, аднак гэта былі дробязі, як лічыў сам Канопліч, і ён праставаў і праставаў напарад, не звяртаючы больш ні на што ўвагі.

Пакуль ішоў па лесе, было зацішна, а як толькі апынуўся на пагорку, з якога ягоная Верасняўка бы на далоні, давялося ўхіляцца ад стрэчнага ветру. І хоць вецер пёк твар, асабліва нос і вушы, ён радаваўся ўсяму гэтаму, бы малое дзіця.

Ён ішоў да сваёй хаты!

Цікава, ці ёсць дзе там старэнькі патэфон, ці захаваўся ён? Канопліч, як толькі ўспомніў пра яго, адразу ж нагадалася пераднавагодняя зіма пяцідзесят восьмага года. Быў ён тады хлапчуком, жыў у суседняй вёсцы з бацькамі, а на канікулы прыкаціў на лыжах да дзеда Якава і бабы Пелагеі, тыя заўсёды былі рады ўнуку. Якраз вярнуўся са службы ў арміі дзядзька Мішка, ён быў дэсантнікам, там пакахаў дзяўчыну, за якой і збіралася экспедыцыя ў Віцебск: Новы год яны павінны былі сустрэць мужам і жонкай. У тую экспедыцыю ўваходзіў дзядзька Коля, ён шафёр, і лепшы сябра дзядзькі Мішкі — таксама Мішка, але, вядома ж, з іншым прозвішчам, — Валюшаў. Потайкам прабрацца ў экспедыцыю загаръўся і ён, Хведзька. Не даваў яму спакою далёкі і загадкавы на той час Віцебск, ды і на машыне ён далёка так ніколі не ездзіў. А так хацелася! І да чаго ж дадумаўся! Закапаўся ў сене, што было ў кузаве і на якім павінен быў ехаць Валюшаў, таксама закапаўшыся ў яго, каб не замерзнуць. Гэта ж добра, той адразу заўважыў, што сена тое нешта варушыцца... На тым паездка малога Канопліча і скончылася. У вёсцы ён вяртаўся тады якраз вось па гэтай дарозе, але ўвечар, наўкола было цёмна, хоць выкалі вока, аднак вяртацца экспедыцыя па нявесту назад не стала: вяртацца — кепская прыкмета, а напарадзе далёкая дарога, а што ж да Хведзькі, то ён, блазнюк, ведае ўсе тут сцежкі, не заблудзіцца, а калі лыткі патрымяць крыху ад страху, то будзе ведаць на будучае, як дазваляць сабе такія вось штукарствы.

Тады і сапраўды нацярпеўся ён страху. Кожны куст здаваўся ваўком. Але ж калі вярнулася экспедыцыя, то Хведзька быў у цэнтры ўвагі. Сабраліся паглядзець на Мішкаву нявесту свакі і суседзі, і каб нешта гаварыць, а не маўчаць, яны, асабліва калі выпілі па чарцы дзедавай хлебнай, раз-пораз скіроўвалі галовы да малога і выказваліся: дык ты што, Хведзька, і насамрэч у Віцебск сабраўся? А калі б замерз? Га? Вось і было б свята: не ведалі б, ці радавацца нам, што вось маладзіца паявілася ў хаце, ці плакаць, калі б што адмарозіў? Ну, дый і добра, што так атрымалася.

Пасаг у нявесты быў невялікі, людзі тады жылі сціпла, а вось патэфон меўся. І Хведзьку дазволіла быць галоўным над ім сама віцебская нявеста цёткa Зіна. Спярша паказала, што і як рабіць, сама ж зноў села за стол, а малы ставіў пласцінкі. Тады па хаце плыла такая прыгожая — ажно дзед Якаў вусы падкручваў, хітаючы галавой у знак адабрэння музыкі — песня: «Под городом Горьким, где ясные зорьки, в рабочем поселке подруга живет...» Хведзька слухаў песню, быў зачараваны ёю, і стараўся ўявіць той горад Горкі і тую дзяўчыну, што жыве ў рабочым пасёлку. Тая яму і ўяўлялася — яна была, як дзве кроплі вады, падобная на тую нявесту, якую прывёз дзядзька Мішка разам з патэфонам.

— Паўтары, унук, пра горад Горкі, — прасіў дзед Якаў.

— Зараз знайду толькі пласцінку і памяняю іголку, а то трашчыць дужа.

— Мяняй, мяняй, унук. Добрая песня, ліха яе матары! Недарэмна ў той Віцебск з'ездзілі хлопцы!..

Патэфон — дзіўна ж сёння! — адкрыў тады Хведзьку нейкі зусім іншы свет, пра які ён і не думаў раней. Бачце, ёсць недзе далёка горад Горкі, ёсць рабочы пасёлак, ёсць на зямлі людзі, якія кахаюць адно аднаго... Гэта пазней будзе радыё ў кожнай хаце, з'явяцца тэлевізары. Дзядзька Мішка з цёткай Зінай пабудуюць сваю хату, а Канопліч вернуцца назад з суседняй вёскі ў гэтую, і будуць жыць вялікай сям'ёй. Хведзьку і ягоным братам было такое перасяленне нагата ж зручным: не трэба бегчы за чатыры кіламетры, каб паслухаць пласцінку. А пласцінак болела — хто быў у горадзе, той нешта і прывозіў. Пры любым зручным выпадку разжываліся і на іголкі.

Прайшлі гады, жыццё праляцела як адзін дзень, і вось цяпер, ідучы па цаліку ў вёску, Канопліч ніяк не можа зразумець, чаму ўсё так хутка атрымалася ў ім, у гэтым жыцці? Толькі ж, здаецца, нядаўна ўпершыню пачуў ён пра той горад Горкі, накурана і весела было тады ў хаце, а сёння ён, лысы і грузны, зусім іншы чалавек, які б ні за якія грошы на цяперашні розум не паехаў узімку ў халодным кузаве нават у суседнюю вёску, а не тое што ў Віцебск за сотні кіламетраў, будзе адзін сустракаць Новы год. Хіба ж тады, у тым далёкім цяпер ужо пяцьдзесят восьмым годзе мог ён пра такое падумаць? Ат, ды што там ужо сёння гаманіць: мінулае не вернеш!..

Вунь, вунь яна, хата.

— Прывітанне, родная! — Канопліч зняў шапку, схіліў галаву. — Я прыйшоў. Даруй, што позна. Званіў братам, тыя не могуць. У іх жонкі такія, што не разумеюць. Хаця самі і вясковыя. А мая, Марыя, ты ж яе помніш, прыгожая такая, з мячыкамі на шчоках, мяне зразумела, хаця сама і гарадская. Вось так, родная. Сёння я буду з табой. Да раніцы. Дазволь зайсці?

Ключ быў у схованцы, пра якую ведалі ўсе Каноплічы. На Радаўніцу яны бываюць ледзь не штогод у Верасняўцы, аднак не заўсёды нават заходзілі і на падворак — усё было некалі: то нехта паабяцаў падвезці да горада ды надта спяшаўся, то яшчэ якая прычына. Таму да ключа амаль што не дакраналася рука. Замок на дзіва адчыніўся адразу, аднак дзверы напомнілі пра сябе — праспявалі сваю рыпучую мелодыю. У сенцах было так, як і пры жыцці. На цвіку вісела яшчэ амаль што новае рэшата. Цырату, якой быў пакрыты стол, у многіх месцах пагрызлі мышы. Пад столлю боўталіся пучкі лекавых зёлак. Ступа. Божа, ступа! Таўкач быў прыхінуты да сцяны. Што ж, пара праходзіць у пярэднюю хату. Печ. Засланка. Чалеснік. Вядро. Посуд. У зале ўсё было так, як і тады, калі жылі тут людзі. Нашчадкі амаль нічога не забралі — усё збіраліся яны жыць тут у час адпачынкаў, прывозіць дзетак улетку, каб тыя пабегалі па траўцы, аднак мары засталіся толькі марамі.

На падлозе Канопліч раптам заўважыў дробныя кавалачкі фольгі, якраз у куце, і тады ён падняў вочы на тое месца, дзе ў іх спакон веку вісела ікона. Ікона была на месцы, аднак.... Аднак яна мала чым нагадвала яе, ікону: амаль усё, што маглі, патачылі мышы.

Канопліч сеў на табурэт, папярэдне змахнуўшы з яго пыл. Ён зноў падняў вочы на ікону... А да хаты сказаў:

— Цяпер я разумею, чаму ты паклікала мяне. Разумею, хата. Ікону я вазьму з сабой, у горад. Аддам на рэстаўрацыю. А тады адразу прывязу. Аклад новы зробім — такі, каб ніхто больш не знайшоў у ім і шчылінкі... Каб ніхто больш не залез да Боскай Мацеры. Малайчына, малайчына ты, хата, што патурбавала мяне. А я адразу адчуў, што нешта тут не так, што нешта здарылася. Ну, што ж, будзем рыхтаваць святочную вячэру? Будзем!

Ён памыў стол, заслаў яго ручніком. У гранёную шклянку паставіў свячку. Выклаў усё, што было ў рэчавым мяшэчку, паставіў пітво. Потым Канопліч акуратненька прыхінуў да сцяны фатакарткі самых дарагіх яму людзей — мамы, бацькі, дзеда Якава, бабы Пелагеі, дзядзькі Мішкі, цёткі Зіны... Калі трымаў у руках картку з выявай апошняй, адразу ўспомніў пра патэфон, доўга шукаў яго — зазірнуў, здаецца, куды толькі можна было. Заставалася апошняя надзея — на гарышча, аднак ён не асмельваўся туды лезці: высока, а лесвіца надта старэнькая. Аднак потым махнуў рукой — адважыўся, палез. Знайшоў! Патэфон быў таксама пагрызены, цяпер ён не меў, як раней, вішнёвага колеру, а нагадваў стары пашарпаны чамадан, падобны на той, з якім вярнуўся бацька з вайны. Калі Канопліч падняў вечка, на дыску ён убачыў знаёмую пласцінку. Так, так: гэта была ўсё ж тая пласцінка, з якой малы тады яшчэ Канопліч даведаўся, што пад горадам Горкім у рабочым пасёлку сяброўка жыве...

Неўзабаве патэфон стаяў на стале, і Канопліч накруціў спружыну. Патэфон працаваў! Хоць цяжка было разабраць словы, аднак падалося, што песню ўважліва слухаюць самыя блізкія яму людзі, якія гляджу на яго з фатакартак. Калі толькі скончылася песня, Канопліч быццам наяве пачуў голас дзеда Якава:

— Паўтары, унук, пра горад Горкі...

Звечарэла. Канопліч яшчэ пры святле запаліў грубку, цяпер вось язычкі полымя ад якой жвава скакалі па сценах. Гарэла свечка. Неўзабаве ў хаце стала цёпла, утульна, як і некалі раней. Хата павесялела і пахарашэла, таксама набыла святочны настрой і выгляд. Размаўляючы з ёй, госць напоўніў шэсць чарак, кожную паставіў перад фотакарткай.

Да канца гэтага года заставалася яшчэ некалькі хвілін, і Хведар Канопліч, натомлены за дзень прыемнымі клопатамі, выйшаў на двор. Было студзёна, на небе паўсюдна гарэлі зоркі. Мноства зорак. Бязлюдна. І раптам ён жахнуўся: у хатах, што былі паблізу, мігцелі агеньчыкі. Не, яму не падалося: агеньчыкі былі сапраўднымі. Прыслухаўся: галасоў не чуваць. А толькі агеньчыкі. Толькі яны...

Ён вярнуўся ў хату, расчулены і ўсхваляваны, сеў за стол. Неўзабаве зайграў гімн, Канопліч падняў напоўненую чарку, хацеў сказаць навагодні тост, аднак разгубіўся і доўга не мог сабрацца з думкамі: перад ягонымі вачыма ўсё яшчэ калываліся трапяткія агеньчыкі ў вокнах суседніх хат...

г. Гомель.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: